беларуская газэта. Засноваиая ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыдзённа

НАША НІВА

КУЛЬТУРА, ПАЛІТЫКА

выходзіць у панядзелкі

№ 24 (62)
16 верасьня 1996 г.
панядзелак

ТЭЛЕПРАГРАМА

БІРЖА ПРАЦЫ

Генадзь Карпенка:

«Падтрымкі рэжым не атрымае ніадкуль»

Карэспандэнт «Нашай Нівы» Алег Дашкевіч узяў інтэрвію ў намесьніка старшыні ВС Генадзя Карпенкі.

«НН»: Сп. Карпенка, сёньня, калі сытуацыя ў краіне напружваецца, калі невядомыя дасылаюць правакацыйныя лісты на адрас сьпікера парлямэнту, а бабулі знаходзяць пад сьценамі ВС пасланьні «чорных катоў», ці ня лічыце вы, што дэпутаты могуць неўзабаве апынуцца перад зачыненымі дзьвярыма Вярхоўнага Савету, у якім сапёры будуць шукаць чарговую бомбу?

Г.К.: Не, я думаю такога варыянту ня будзе. Будзе іншы: спроба знайсьці сярод дэпутатаў большасьць, каб гэтай большасьцю гэты парлямэнт і прыхлопнуць.

«НН»: А такі варыянт магчымы?

Г.К.: Думаю, наўрад ці. Хоць сёньня для гэтага адміністрацыя прэзыдэнта робіць шмат, асабліва ў рэгіёнах, з дапамогай вэртыкалі.

«НН»: Ці не зьмяніліся, на Вашу думку, адносіны да Лукашэнкі тых, хто падтрымлівае яго ў Маскве?

Г.К.: З такой палітыкай ён паразуменьня ў Расеі ня знойдзе. Гэта я дакладна адчуў пад час уласнага візыту. Лукашэнку патрэбная была інтэграцыя для таго, каб высунуць сваю кандыдатуру на прэзыдэнцкіх выбарах у Расеі. Уся яго інтэграцыя зводзілася да інтэграцыі зь Зюганавым. Гэта не ўдалося. Цяпер робіцца другая спроба – праз сілавыя структуры.

Працяг на стар. 2

ГАЛАСУЙ, БО... ПЕРАМОЖАШ

Што здарылася?

Славамір Адамовіч у Варшаве

Польская прэса рэгулярна знаёміць грамадзкасьць зь лёсам інтэрнаванага беларускага паэта Славаміра Адамовіча. Ужо ў чэрвені ў варшаўскай газэце «Głos» (№62), быў зьмешчаны пераклад верша «Убей президента». А ў сьвежым верасьнёўскім нумары «Głosu» (№101) зьявіліся пераклады ўжо цэлай нізкі вершаў Адамовіча, ўрывак зь ліста ў рэдакцыю «НН», а таксама паведамленьне пра гісторыю яго зьняволеньня і сухую галадоўку. Пераклады належаць вядомаму знаўцу беларускае літаратуры, літаратару і публіцысту Чэславу Сэнюху. Дзякуючы гэтаму перакладчыку па-польску ўжо гучалі Янка Купала і Якуб Колас.

Сёньня Адамовіч па-ранейшаму знаходзіцца ў віцебскай вязьніцы ў чаканьні суда. На думку ягонага адваката, сп. Паганяйлы, суд не адбудзецца раней рэфэрэндуму. Уладны не зацікаўленыя ў стварэньні ажыятажу вакол «паэтычнага» працэсу напярэдадні восеньскіх палітычных боек.

Сяргей Харэўскі

Прадалі цеплаходы

Цеплаходы з імёнамі беларускіх гарадоў – Наваполацка і Навагрудка – больш ня зьявяцца ў портах сьвету пад расейскім сьцягам. Балтыйскае марское параходства ў Санкт-Пецярбургу (БМП) страціла гэтыя судны. Як паведамілі нам у інфармацыйнай службе БМП, цеплаходы былі арыштаваныя, прададзеныя за даўгі параходства і цяпер будуць эксплюатавацца новымі гаспадарамі пад новымі імёнамі. «Наваполацак» арыштаваны і прададзены ў Новым Арлеане. «Навагрудак» – у Антвэрпэне, двойчы. Першы раз яго купіла турэцкая фірма за 23 млн. бэльгійскіх франкаў. Аднак паводле ўмоваў аўкцыёну, калі на працягу двух тыдняў нехта прапануе большую цану, папярэдняя зьдзелка касуецца. Большую цану – 24 млн. дала кіпрская суднаходная кампанія. Як лічыць апошні капітан «Навагрудка» 55-гадовы Анатоль Бондар, цеплаход каштуе значна даражэй.

Абодва цеплаходы аднаго тыпу (дэдвэйтам 13.600 тон) і пабудаваныя ў Фінляндыі – «Наваполацак» у 1969-м, а «Навагрудак» у 1970 годзе. Беларускі бок ня выставіў пецярбурскаму параходству ніякіх прэтэнзіяў на кампэнсацыю за камэрцыйнае выкарыстаньне імёнаў славутых беларускіх гарадоў.

Алесь Шкнай, Санкт-Пецярбург

Сярэднезэўрапейская сустрэча

З 6 да 9 верасьня ў Варшаве адбыўся II Міжнароды соймік моладзі Сярэдняй і Ўсходняй Эўропы. У Варшаўскім універсытэце сабраліся дэлегаты з большасьці краінаў рэгіёну – ад Латвіі да Баўгарыі. Ад Беларусі прысутнічала група з 15 чалавек. Пэўныя непаразуменьні ўзьніклі з-за таго, што арганізатары Соймка паспрабавалі выкарыстаць у якасьці беларускага сьцяга лукашэнкаўскі. У выніку ўдакладненьняў у залі быў вывешаны беларускі нацыянальны сьцяг.

Ідэя спатканьня належыць тым польскім колам, якія альбо зьвязаныя з тэрыторыямі нашага рэгіёну ад Вільні да Львова настальгічна, альбо бачаць Польшчу сапраўдным лідарам Сярэдняе Эўропы й таму падтрымліваюць усякую цікавасьць да польскае культуры й мовы. Але кожная дэлегацыя прыўнесла сваё спэцыфічнае бачаньне сытуацыі Сярэдняе Эўропы. Беларуская дэлегацыя выглядала ці не найбольш інтэлектуальнай.

Наступная такая сустрэча адбудзецца ў 1998 г. ужо ў Львове.

A.Dz.

Гісторыя

Трагедыя 1939-га

17 верасьня Заходнюю Беларусь, якая дваццаць гадоў як была ўключаная ў склад Польшчы, далучылі да Савецкай Беларусі. Падзея, якая ў афіцыйнай савецкай гісторыяграфіі называлася ўзьяднаньнем, з пазыцыяў незалежнай беларускай навукі дагэтуль не прааналізаваная і не ацэненая. Чаму? Напэўна, таму, што, па-першае, не назапашаны дастатковы фактычны матэрыял, па-другое, не разгледжаныя як сьлед усе «падаплёкі» той падзеі (напрыклад, пакт Молатава-Рыбэнтропа), па-трэцяе, не сфармуляваная тая сьветапоглядная база, на якой бы ў прынцыпе мог адбывацца незалежны беларускі аналіз.

Падрабязна пра падзею – на старонцы 13.

Навіны 1-м сказам

СУД. Менскі гарадзкі суд прысудзіў да розных тэрмінаў зьняволеньня сямёх грамадзянаў украіны, якія бралі ўдзел у забароненым жалобным шэсьці 26 красавіка сёлета.

Падрабязна пра суд – на старонцы 2.

ЛЕБЕДЗЬ. Аляксандар Лебедзь наведаў Менск, дзе абмеркаваў вывад у Расею пэрсаналу дзьвюх ліквідаваных расейскіх ракетных частак; пра зьмест гутаркі А.Лебедзя з А.Лукашэнкам нічога невядома.

ВІЗЫ. Чэскія ўлады плянуюць увесьці візы на ўезд для грамадзянаў Расеі; гэты крок выкліканы засьцярогамі супраць расейскіх крымінальных груповак; калі так здарыцца, то аўтаматычна візы будуць уведзеныя і для грамадзянаў Беларусі.

ВАЙНА. На ўрадавай нарадзе ў Маскве вырашана, што урэгуляваньне становішча ў Чачэніі магчымае толькі пры выкананьні расейскай канстытуцыі ды захаваньні тэрытрыяльнай цэласнасьці Расеі.

ПОЛЬШЧА. Прэзыдэнт Францыі Жак Шырак падчас свайго выступленьня ў польскім Сойме заявіў, што прыкладзе ўсе намаганьні, каб дапамагчы Польшчы як мага хутчэй уступіць у Эўрапейскі Зьвяз, а таксама ў NATO.

ЗОЛАТА. Міжнародны Валютны Фонд вырашыў прадаць частку сайго залатога запасу для скасаваньня даўгоў некаторых краінаў, але не Расеі і Беларусі.

ГАНДЛЁВАЯ ВАЙНА. Расея ўвяла 20-працэнтныя мытныя пошліны на тавары, што ўвозяцца з Украіны, дзе такая пошліна на расейскія тавары дзейнічае ўжо 2 гады.

КАМБОДЖА. Енг Сары – былы намесьнік кіраўніка Чырвоных Кхмераў Пол Пота, нягледзячы на ўчыненыя зь яго ўдзелам забойствы 3 міліёнаў чалавек, атрымаў поўную амністыю для, як было заяўлена ўрадам, поўнага замірэньня ў Камбоджы.

БАРЫС І НАІНА. Для папярэдняга абсьледаваньня перад апэрацыяй на сэрцы прэзыдэнт Расеі Ельцын зьмешчаны ў Цэнтральную клінічную лякарню Масквы, дзе пасьля апэрацыі на нырках ужо знаходзіцца ягоная жонка Наіна.

ІТАЛІЯ. Італьянская Ліга Поўначы правяла масавую дэманстрацыю ў падтрымку ідэі аддзяленьня гэтай найбольш прамысловa разьвітай часткі Італіі ды пераўтварэньня яе ў асобную краіну.

Падрабязна пра гэта – на старонцы 4.

НАФТА. Прэзыдэнт ЗША паслаў дадатковыя войскі на мяжу з Іракам, назваўшы гэты рэгіён «зонай жыцьцёва важных інтарэсаў ЗША».

ЯНОВІЧ. Сябру «Нашае Нівы», беларускаму пісьменьніку Сакрату Яновічу, які жыве на Беласточчыне, 4 верасьня споўнілася 60 гадоў. Віншуем.

Сьветлагорыя – мадэль грамадзтва

Звычайная сытуацыя – студэнту прапануюць падзарабіць, і ён едзе працаваць у дзіцячы аздараўленчы лягер.

Вялікія намеры...

Гэта мусіў быць шырокі праект. Лягер ствараўся для дзяцей з забруджаных зонаў. Ня толькі з Чарнобыльскай – тэхнагеннае забруджаньне Менску, забруджаньне ў выніку перапрацоўкі вайсковай хімічнай зброі на палігоне каля Саратава (Расея)... Адпачынак 450 дзяцей з забруджаных зонаў у санаторыі Сьветлагорскага ВА «Хімвалакно» з 15 ліпеня да 8 жніўня.

Мэдычная праграма праекту не абмяжоўвалася толькі вывучэньнем наступстваў забруджаньня ў дзяцей. Прапаноўваліся нетрадыцыйныя сродкі лекаваньня – ад дыеты (прарошчаная пшаніца зь мёдам, стравы з канюшыны і лебяды) да лячэньня пахамі і колерамі.

Акрамя мэдычнай былі яшчэ экалягічна-адукацыйная праграма (праз гульні даць дзецям уяўленьне пра экалёгію) і праграма сацыяльнай рэабілітацыі.

Апошняя – рэч асаблівая. Дзецям стварылі адмысловую краіну Сьветлагорыю як мадэль грамадзтва, распрацавалі легенду ўзьнікненьня гэтай краіны, плянавалася зрабіць свае сродкі масавай інфармацыі і Дзіцячы Парлямэнт.

Як журналіст, я стаў кіраўніком прэсавага цэнтру краіны Сьветлагорыі і адначасова галоўным рэдактарам усіх сьветлагарыйскіх газэт. У нашыя абавязкі ўваходзіла папулярызацыя нетрадыцыйных мэтадаў лекаваньня і прыахвочваньне дзяцей да актыўнай сацыяльнай дзейнасьці – удзелу ў гуртках і працы журналістаў.

Працяг на стар. 3

Салідарнасьць

Ігар Бабкоў

Апошнім часам мне хочацца знайсьці, адкрыць для сябе новыя значэньні старых банальных словаў. Панятак «салідарнасьць» — адно зь іх. Як і шмат якія паняткі, што прыйшлі да нас з Захаду (дэмакратыя, плюралізм, талерантнасьць і г.д.), гэтае слова празрыстае толькі напалову: мы вывучылі правільнае значэньне і на гэтым спыніліся. Салідарнасьць не вырастала ў нашай крыві, яна ня сталася нашай эмоцыяй, яна не перарасла ў грамадзкі рэфлекс.

Беларускае грамадзтва ня ведае, што гэта такое — салідарнасьць. Грамадзтва падзеленае ўздоўж і ўпоперак, на гарады і вёскі, на рады і кланы, на рэгіёны і сацыяльныя групы, паводле моўных і культурных прыкметаў, паводле палітычных прыхільнасьцяў, паводле геаграфічных арыентацыяў і тусовак, і халера ведае яшчэ паводле чаго. Яно нават ня верыць, што сапраўды існуе як нейкая еднасьць, ня верыць, што яно сапраўды ёсьць.

І таму, калі паэта садзяць за верш, тэмпэратура крыві не мяняецца. Паэта, праўда, пачыняюць абараняць, прафэсійна, крыху стомлена і з каліўцам зьдзіўленьня: гэта ж нада так заляцець! Абараняюць, зноў жа, «блізкія» — людзі, якія, сутыкаючыся зь ім, здольныя ўявіць, што акрамя рэвалюцыйна-фантасмагарычных праектаў (цалкам уяўных) і фантасмагарычна-рэвалюцыйных вершаў (дастаткова таленавітых) ёсьць яшчэ жывы чалавек, якому ўсё ж ня варта месяцамі ляжаць на нарах. Для астатніх жа гэтая гісторыя — чыстая абстракцыя. Я тут не кажу пра ідэалягічных вэтэранаў з садысцкімі інстынктамі. Я маю на ўвазе звычайных, тых, хто, не пагаджаючыся з паглядамі, здольны зразумець і прызнаць: за верш саджаць нельга. Чаму анічога не зварухнулася ў іхняй крыві? Чаму няма страсьці?!

Мне сорамна, што менскія паэты (і я ў тым ліку) не стаялі на другі дзень перад сьценамі КГБ, дэклямуючы вершы, выяўляючы сваю салідарнасьць. Напэўна таму, што не было што выяўляць. Было спачуваньне, былі прагматычныя захады каб дапамагчы, але не было інстынктыўнага, першаснага, ірацыянальнага зруху. Не было ўласна салідарнасьці. Проста не знайшлося такога пачуцьця, недзе ўсярэдзіне, у глыбіні.

Магчыма, салідарнасьць — гэта занадта арыстакратычнае пачуцьцё: у ім прасьвечвае ўнутраная сіла і бескампраміснасьць. А Беларусь ўсё яшчэ паўплебейская краіна. Салідарным можа быць талент з талентам, годнасьць з годнасьцю. Немагчыма быць салідарным з рабом, з шэрасьцю, зь бясконцымі паўпраўдамі. А нашыя настаўнікі (нават самыя лепшыя) вырасьлі і зрасьліся з кампрамісамі. І цяпер, калі мы пытаемся ў іх, чаму яны маўчаць, мы чуем у адказ старую песьню: трэба захаваць тое, што ёсьць, ня трэба правакаваць, лепш перачакаць і г.д. За выключэньнем трох-чатырох чалавек, якія маюць сьмеласьць гаварыць, усе нашыя прафэсары й акадэмікі незалежна ад таго, у Вязынцы ці ў Вене яны рэалізуюць свае прафэсійныя амбіцыі, — усе яны маўчаць.

Магчыма таму беларуская сытуацыя такая шэрая, такая безнадзейная, такая ўбогая. Магчыма таму галоўнаму правакатару ўдаецца ўсё, што ён задумаў. Прыгадайма Менскую вясну, усе гэтыя паўкарнавальныя шэсьці, мітынгі, сутыкненьні. Усё гэта ня мела анікага прагматычнага сэнсу — і як адразу патыхнула свабодай, як зьмяніўся настрой, як пачалі падымацца з каленаў! Моладзь пайшла, — запелі ўсе камэнтатары й аналітыкі і пачалі плянаваць далей: хто ўзначаліць, хто павядзе, хто накіруе.

А гэта была ня моладзь, гэта была салідарнасьць.

"Наша Ніва" незалежны тыднёвік НАША НІВА
заснаваны ў 1906, адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец Павал Жук
рэдактар Сяргей Дубавец
адказны сакратар Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
навіны Уладзімер Бараніч
рэдактар дадатку "Інфарматар" Андрэй Лапцёнак
макет Віктар Корзун
вёрстка Іна Жызьнеўская
набор Тацяна Чуйвід
стыль Антон Кузьміч
карэктура Сяргей Сматрычэнка
пры ўдзеле Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)
АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ 220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78-49
E-mail: edit@niva.minsk.by
Падпісны індэкс 63125
Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.

Генадзь Карпенка:

«Падтрымкі рэжым не атрымае ніадкуль»

Працяг са старонкі 1.

Але сеньня ніхто яго сур'ёзна не ўспрымае, таму што бачаць, што ўсё робіцца наадварот. Калі ён кажа пра інтэграцыю і збліжэньне эканомік дзвюх краінаў, то як разумець тое, што ў Расеі праходзяць дэмакратычныя выбары, як прэзыдэнта, так губэрнатараў і мэраў, рэфармаваньне эканомікі, а ў Беларусі ўсё — у супрацьлеглым напрамку. Пра што сьведчыць стан нашай эканомікі і канстытуцыя Лукашэнкі, дзе дэмакратычных працэдураў упарадкаваньня ўлады проста не відаць. Выкручваюцца рукі як нашым бізнэсоўцам, так і замежным кампаніям, у тым ліку і расейскім, якія да нас прыходзяць працаваць. Усе грошы, якія яны ўкладаюць, вылятаюць «у трубу».

«НН»: Пад час вашага візыту ў Маскву, калі не сакрэт, з кім вы там сустракаліся?

Г.К.: Я пакуль ня буду называць іх прозьвішчы. Па іх просьбе. Адно магу сказаць, што расейскія сродкі масавай інфармацыі будуць аб'ектыўна асьвятляць падзеі ў Беларусі.

«НН»: Як вы лічыце, якім чынам будуць разьвівацца адносіны выканаўчай і заканадаўчай улады?

Г.К.: Спачатку будзе спроба раскалоць Вярхоўны Савет. Калі такога ня здарыцца і будзе пастаўлена пытаньне аб імпічмэнце, я думаю, магчымыя сілавыя мэтады. Ад гэтага чалавека можна чакаць усяго, чаго заўгодна. Розум у яго на другім месцы, таму любыя крокі магчымыя, але раней ці пазьней гэта ўсё скончыцца. Ён спрабуе ўсіх запалохаць, таму што сам баіцца найболей.

«НН»: Як будзе рэагаваць парлямэнт на ўжываньне сілы з боку выканаўчай улады?

Г.К.: Мы будзем зьвяртацца ў парлямэнты ўсіх краінаў, у Эўрапарлямэнт. У нас ужо такія звароты падрыхтаваныя, гатовы зварот у Дзярждуму Расеі. Я глыбока ўпэўнены, што падтрымкі рэжым Лукашэнкі не атрымае ніадкуль.

Украінскі працэс

Звокнаў на ўсіх паверхах суда, што выходзяць на двор, вызіраюць людзі. Чалавек трыццаць стаяць ля брамкі. Плюс ачапленьне міліцыі. Плюс пара аўчарак і «шлёмаў». Плюс нейкія «рафікі» ззаду. Плюс выйшла з укрыцьця блакітна-плямавае падразьдзяленьне... Хтосьці з Украіны пытаецца: «У вас што — заўсёды так?!» Як? Мы ня ведаем! Мы тут проста жывем.

Рух за фургонамі. Першымі яго заўважаюць суайчыньнікі асуджаных. Нашыя бабулі крычаць: «Хлопцы, хутка вы будзеце іх вартаваць, а не яны вас!»

Грымнула песьня пра партызанаў (са словамі «Мама, чао»). Па-ўкраінску. Па-беларуску... Гучней... «Адкуль у вас ведаюць словы гімна УНСО?» Каб я мела ўяўленьне, адкуль!..

У першы дзень працэсу аказалася, што абвінавачаньні — тыпова «хуліганскага» зьместу. Тралейбусы спынілі і нашу родную міліцыю «паслалі».

Перад судом «мэтадам укараненьня» невядомы ўкраінскім грамадзянам апэратар здымаў іх у камэры. Калі на гэта была зьвернута ўвага судзьдзяў, галоўны зь іх, Рыгор Казырыцкі, сказаў: «Палітыка ня мае да працэсу ніякага дачыненьня».

Хоць палітыка была як бы ні пры чым, ва ўсіх падсудных пыталіся пра прыналежнасьць да грамадзкіх арганізацыяў іхняе краіны. «Апошняй партыяй, у якой я састаяў, была КПСС», — сказаў Сяргей Патапаў. З годнасьцю адзначыў, што ён расеец і грамадзянін Украіны. І адзіны з усіх дадаў, што падтрымлівае погляды УНА-УНСО. Астатнія, украінцы, ад сяброўства ва УНСО адмовіліся.

Папраўдзе суд павінен быў высьветліць, хто спыняў транспарт ды лаяў міліцыю. Дакладней, ці рабілі гэта тыя, хто сядзеў за кратамі і на лаве падсудных. Разьбірацца з членствам у арганізацыі, якая была пазбаўлена рэгістрацыі ва ўкраінскім Мінюсьце — справа ня нашых уладаў, у тым ліку судовай.

Але канкрэтныя прыклады таго, каб украінцы абражалі прадстаўнікоў уладаў РБ, устанавіць не ўдалося. Міліцыянты пазнавалі гэта ў лепшым выпадку «по синхронно открывающемуся рту». За некалькі хвілін да таго сказаўшы, што той, хто крычаў абразы, быў ці ў масцы, ці з хусткай на ніжняй частцы твару. Сярод апошніх фігураваў «вось гэты вусаты», як называлі Салаўя, апазнанага «па выразных вачах — пры праглядзе відэакадраў». Сьведка сам манціраваў кадры ў фільм. У фільме, кажа, Салавей ёсьць. «Ледзь пасьпяваюць злавіць «стоп-кадр», бо «чалавек у хустцы» мільгае на 2-3 секунды. Праўда, аказваецца, у чорнай кепцы. А хто спыніў тралейбусы? Стужка пасьля мантажу пра тое замоўчвае. Вось прамова Пазьняка, вось нечая сьпіна, вось «ляпы» мантажора. Вось крыкі і гукі ўдараў без відэашэрагу. Вось твары ўдзельнікаў мітынгу, заліты крывёю бел-чырвона-белы сьцяг... Амаль год гэтую кроў на сьцягу частка народу не заўважала, не адчуваючы травеньскай абразы 95-га!

Былі моманты, калі міжволі ўсьмешкі зьяўляліся нават на тварах хлапцоў з канвою. Адвакаты сваімі пытаньнямі ставілі сьведкаў з «органаў» у тупік, і небаракі (ня ведаю, што магло ім быць ад начальства, калі б суд не праігнараваў адсутнасьць доказаў) блукалі па пакутах нелягічнасьці ўласных сьведчаньняў. Часам усё блыталася ў кучу, як ў той стужцы з парушанай храналёгіяй падзеяў: то выходзіла, што Шаптыцкага затрымалі адразу ў двух месцах, то Салавей, як заўважыў адвакат Уладзімер Калесьнікаў, «адзіны ў трох асобах» атрымаўся. То расеец Патапаў быў апазнаны як «асоба ўкраінскай нацыянальнасьці». Рэальных доказаў сярод усяго гэтага не было.

Яшчэ ў Шаптыцкага спыталі, ці былі зь яго боку абразы ў адрас прэзыдэнта Лукашэнкі. «Ды не чапаў я яго! — адказаў Андрэй. — А вось зь яго боку абразы былі». І згадаў бачаную многімі перадачу Няўзорава «Дні» з выразам пра «дзярмо, якім сьмярдзяць беларускія турмы». Да слова: калі гаварыў Шаптыцкі, усе забываліся, што нехта толькі што не разумеў украінскую мову. Пад яе ўплывам нават судзьдзя часам міжволі ўжываў беларускую. Веданьнем беларускай мовы зьдзівіў пракурор пад час выступу сьведкаў з Народнага Фронту...

У дзень, які нечакана стаў апошнім перад абвяшчэньнем прысуду, абвінавачаныя падалі хадайніцтва аб зьмене складу судовай калегіі, выказаўшы недавер суду. Аднак гэта не было прынята да ўвагі. І зноў зьдзівіў пракурор Целяжэвіч. Яго высновы грунтаваліся на фільме, які ня можа мець юрыдычнай сілы ў якасьці доказу ці сьведчаньня. Мантаж. І здымкі Азаронка ў адным лягічным шэрагу з раздрукаванымі кадрамі «парушальнікаў парадку» (вызначаў іх сам сьведка-апэратар, мантажор, экспэрт...) І адсутнасьць спэцыялістаў у апазнаньні асобы, якіх хацелі прыцягнуць да ўдзелу адвакаты. Карацей, віна была «даказана» празь «відэа».

«Украінскі працэс» (а ня проста справа сямі грамадзянаў ня менш братняй за Расею Ўкраіны) стаў добрым урокам. Урокам адной з славянскіх моваў, якая пры сваёй зразумеласьці перастала пачувацца няроднай для беларусаў. Украінскай годнасьці: вы б змаглі ўзьняць за мяжою свой сьцяг на лаве падсудных? Гаварыць па-свойму? І ГЭТАК трымацца? І ГЭТА сказаць у апошнім слове?

Андрэй Дрыгайла: «Бачна, што міліцыю спэцыяльна пасылалі здымаць злачынствы. Значыць, злачынства — выступаць за незалежнасьць Беларусі?»

Андрэй Бурлака: «Падзеі 26 красавіка, дня нашай агульнай бяды, нагадваюць мне падзеі 18 ліпеня мінулага году ў Кіеве, калі прысутных на пахаваньні сьвятара зьбіваў амон... Між іншым, тады толькі хлопцы з УНСО змаглі абараніць вернікаў»...

Уладзімер Салавей: «Каб вас ня мучыць, так і быць, буду гаварыць маскоўскаю моваю... Так, за мной ёсьць віна. Я вінаваты ў тым, што столькі часу ў войску служыў маскоўскаму імпэрыялізму, а ня вольнай Украіне... Сын даслаў ліст: «Тата, не хвалюйся, за цябе ўся Ўкраіна». І хочацца крыкнуць, каб даляцела да роднага Кіева: «Чую, сынку, чую!..»

Андрэй Шаптыцкі... Ён падзякаваў Богу. Украінцам Беларусі, што даслалі ліст прэзыдэнту. Знаёмым і незнаёмым людзям, што перадавалі перадачы ў СІЗО. Тым беларусам, што рызыкавалі сваім здароўем і свабодай 14-га і 30-га траўня. Сваёй маме, якая «ня плакала і нікому не цалавала ботаў». Дэпутатам украінскага парлямэнту, што падтрымалі яго пад час сухой галадоўкі. («Цяпер я ведаю, колькі сапраўдных украінскіх дэпутатаў: пяцьдзесят чатыры!»)

— Пане суддзі! Ступень вашай строгасьці будзе прама прапарцыйная ступені дыктатуры рэжыму. Гэты працэс ня шыты белымі ніткамі — ён з адных белых нітак і складаецца. Шаноўны дэпутат пан Тыма! Я ня быў членам вашай арганізацыі. Але пасьля таго, як пабачыў тое, што робяць у беларускіх турмах, што б ні стала вынікам судовага працэсу, зь сёньняшняга дня прашу залічыць мяне ў гэтую арганізацыю...

Чаго дабіліся тыя, хто нябачнай рукой кіраваў працэсам? Узгадваюцца словы Веры Бурлака, маці студэнта, які марыў стаць сьвятаром, а стаў вязьнем: «У сына вельмі дрэнны стан здароўя. Я не цікавілася палітыкай і зьдзівілася, пачуўшы, што сын мае дачыненьне да УНА-УНСО. Але калі з Андрэем нешта здарыцца, я перайду на бок УНСО і пайду за ёй. Я не прабачу гэтага Лукашэнку»...

Дык хто прайграў «украінскі працэс» — маральна, псыхалягічна? «Пэўныя колы» трох сталіц? Хутчэй за ўсё. Але, напэўна, паводле адноўленай традыцыі, уласныя хібы зноў прыпішуць каму-небудзь іншаму. ЦРУ. Масонам. Патрыятычным рухам. Журналістам. І кожнаму, хто ня супраць, але ня зь імі. Калі нехта яшчэ сапраўды, няхай моўчкі, ня супраць...

«Украінскі працэс», можа, і скончыўся, але працэс беларускі працягваецца.

Тацяна Сьнітко

Пошта

Не чакайце, пакуль прыйдуць па вас

Найгарачэйшыя месцы ў пекле чакаюць тых, хто ў часы вялікіх крызысаў захаваў нэўтралітэт.

Дантэ Аліг'еры

Фашызм ахінае Беларусь сваім чорным ценем. Ён хаваецца ў знаёмых тварах і абліччах выпадковых суразмоўцаў у цягніку. Ён прамяніцца нянавісьцю з телеэкранаў і ўсьміхаецца з газэтных старонак. Як ракавая пухліна, ён прарастае скрозь нашае штодзённае жыцьцё, атручваючы ўсё навокал жывёльным старахам. Крок за крокам фашызм набліжаецца да нашага дому, ён ужо на парозе.

Я амаль чую зьедлівыя галасы скептыкаў: «Дзе ты ўсё гэта ўбачыў, хлопча? Да ты пэўна трызьніш. Мы жывем, як заўжды, мы сумленна працуем, нам няма чаго баяцца. Адкуль такія жахі? Так, жыцьцё цяпер цяжкае, да дэмакратыі нам далёка, але ці можна параўноваць Беларусь зь Нямеччынай часоў Гітлера?»

Пытаньне слушнае, тым больш, што гістарычныя параўнаньні заўсёды «кульгаюць», але і ў Нямеччыне 30-х гадоў усё пачыналася не з канцлягераў. Фашызм непадобны на раптоўны ўдар маланкі. Часам ён прыходзіць пакрысе, патроху. Здаецца, ты толькі адной нагой ступіў у дрыгву, але цяжка заўважыць той момант, пасьля якога ўжо нельга будзе выбрацца на цьвёрдую глебу.

Калі будзе прынятая прэзыдэнцкая «канстытуцыя», якая фактычна ператварае Беларусь у абсалютную манархію, дык гэта ня значыць, што мы ўжо наступнай раніцай прачнемся пад брэх паліцэйскіх аўчарак. Проста тыя працэсы гніеньня, што йдуць цяпер у нашым грамадзтве, атрымаюць найлепшыя ўмовы для разьвіцьця. Беларусь ужо сёньня мае палітычных вязьняў ды эмігрантаў, арыштоўваюцца банкаўскія рахункі газэтаў, прыкрываюцца радыёстанцыі, і няма чаго спадзявацца на розум ды літасьць уладаў. Садыст ніколі ня спыніцца, пакуль не атрымае моцную поўху ў адказ. Крыкі ды стогны ахвяры толькі ўзбуджаюць яго.

Сёньня яшчэ шмат у кім жыве наіўны аптымізм, які зводзіцца да думкі: «Горш ужо ня можа быць». Можа, і ня толькі можа, але і абавязкова будзе горш, незалежна ад таго, як далей будуць разгортвацца падзеі. Сёньня ў Беларусі няма ніводнай палітычнай сілы, якая мела б дастаткова ўплыву, каб самастойна вывесьці дзяржаву з крызысу. Менавіта гэтым карысталася і працягвае карыстацца «партыя ўлады». Добра, што хаця б апошні наступ на рэшткі дэмакратыі ў краіне прымусіў розныя палітычныя групоўкі аб'яднацца для супраціву дыктатуры. Нам можа не падабацца большасьць сёньняшніх «вымушаных апазыцыянэраў», але трэба пазбаўляцца палітычнага ідэалізму і выбіраць з двух ліхаў меншае, каб ня страціць шанец спыніць фашызм.

А тым, хто ўсё яшчэ лічыць, што гэтая палітычная валтузьня яго ня тычыцца, варта прыгадаць словы нямецкага сьвятара Марціна Німюлера, які восем гадоў правёў у фашысцкім канцлягеры: «Найперш яны прыйшлі па камуністаў, і я маўчаў, бо я — не камуніст. Потым яны бралі габраяў, і я маўчаў, бо я не габрай. Потым яны арыштавалі сяброў прафсаюзаў, і я маўчаў, бо ніколі ня быў у прафсаюзе. Потым яны хапалі каталікоў, і я маўчаў, бо я — пратэстант. Потым яны прыйшлі па маю душу, і на той час ужо не засталося нікога, хто мог запярэчыць». Не чакайце, пакуль прыйдуць па вас.

Аляксей Знаткевіч

Сьветлагорыя – мадэль грамадзтва

Працяг са старонкі 1.

... і спосабы ажыцьцяўленьня

Праект быў настолькі добры, што я пагадзіўся б працаваць у ім і бяз грошай. Але рэальная Сьветлагорыя будавалася як мадэль менавіта НАШАГА грамадзтва, з усімі заганамі менавіта НАШАЙ дзяржавы.

Першая такая загана – няўменьне цьвяроза ацаніць свае сілы. Або звышграндыёзны праект, або выказваньні кшталту: «Я ў «зоне» траву касіў, і нічога. Жыць там можна».

Тое, што жыць там можна, сьцьвярджалі яшчэ экспэрты МАГАТЭ. І з гэтым ніхто не спрачаецца. Але ці можна там ЖЫЦЬ ДОБРА і БЫЦЬ ЗДАРОВЫМ?

Казаць, што трэба зноў перасяліць людзей у «зону», няхай і зь мінімальным забруджаньнем, – гэта такая ж завышаная ацэнка магчымасьцяў чалавека, як паспрабаваць стварыць уласнае ТБ і радыё ў дзіцячым лягеры, дзе проста няма для гэтага магчымасьцяў. Завышаная ацэнка магчымасьцяў існуе сёньня і на вышэйшым узроўні, і на ніжэйшым.

Мэдычная дыета правалілася з-за супрацоўніцтва з уладамі. Пасьля таго, як прарошчаная пшаніца зь мёдам (каля 100 кг апошняга мы прыцягнулі зь Менску) спадабалася дзецям, і яе сталі даваць рэгулярна, некалькі дзяўчынак атрымалі лёгкае атручаньне. Мясцовы санэпідэмнагляд не знайшоў нічога лепшага, як патлумачыць атручаньне «псыхалягічным фактарам» неўспрыманьня новай ежы. А ніяк не тварожнай запяканкай зь селядцом, якія сталоўка выкінула дзецям у якасьці дзьвюх страваў на адну вячэру... Нетрадыцыйнай ежы ў лягеры больш не было. Як і ўвогуле ніякіх новых і нетрадыцыйных мэтадаў. Засталася хіба што газэта. Але і ёй ужо не было чаго папулярызаваць.

Ці трэба казаць, што «псыхалягічнае неўспрыманьне» нечага новага – гэта стандартны прыклад прыдушэньня ўсіх ініцыятываў у сапраўдным нашым грамадзтве.

Чалавечы фактар

Але што асабіста для мяне было стратаю, дык гэта сама Сьветлагорыя. Файная ідэя, якая дазволіла б «пасябраваць» дзяцей зь Беларусі і Расеі на падставе таго, што яны – сьветлагарыйцы. Калі мы распрацавалі легенду краіны і запусьцілі яе ў дзеяньне, аказалася, што ніхто не грунтуе на ёй сваю дзейнасьць. Ніхто, акрамя нас. Ім прасьцей было працаваць старымі мэтадамі.

Ім – гэта старэйшым пэдагогам. Адна жанчына сказала: «Я былая камуністка, я гэтага не саромеюся, у мяне ў будынку будзе парадак». А я б, напрыклад, саромеўся таго, што я «былы».

Жорсткія «пэдагагічныя» меры выклікалі рэзананс – дзеці пажаліліся ў газэту. За гэта мы атрымалі цэнзуру. Нам сказалі, што можна зараз падняць узровень «балота», але гэта не паспрыяе канчатковай мэце. Трэба балота ўвогуле асушыць. І ў канцы размовы – цэнзура.

Старэйшых пэдагогаў была меншасьць, але яны былі старэйшыя. Цэнзуру да апошніх дзён не адмянілі. Пра Дзіцячы Парлямэнт увогуле забыліся...

Дзеці Свабоды

Дзеці 11-14 гадоў на дыктатарскія мэтады адказвалі радыкальнымі формамі пратэсту. Асобныя атрады аб'яўлялі страйкі і нават галадоўкі супраць тэрору і жорсткасьці сваіх «настаўнікаў». Карэспандэнты газэты стварылі пікет у абарону свабоды слова.

Нашы дзеці, выхаванцы свайго неспакойнага часу, ужо ведаюць, што за свабоду трэба змагацца. Ім засталося толькі адно – прыдбаць мужнасьць. Тыя, хто галадаваў і страйкаваў, набывалі мужнасьць. Бо нашмат прасьцей было затэлефанаваць бацькам і папрасіць, каб яны забралі (такія выпадкі таксама былі).

Але «балота» скалыхнулася. На наступны дзень прэс-цэнтар друкаваў анкеты з пытаньнямі да дзяцей.

Дзеці Чарнобыля

Анкеты прынесьлі з такімі адказамі, што прэс-цэнтар зьніякавеў. Справа не ў газэце – яе падтрымалі 90 працэнтаў дзяцей. Але адказы пра тое, чаго б яны жадалі...

10-12-ці гадовыя дзеці пажадалі адмены пад'ёму і адбою, каб у лягеры гандлявалі (менавіта гандлявалі, а не давалі) марожаным і каб быў «цырк и истрадны канцэрт».

Кіраўнікі растлумачылі гэта проста – дзеці вучацца толькі 2 месяцы ў год. Астатні час яны «аздараўляюцца» па санаторыях ды замежных краінах. Адкуль у іх разьвіцьцё?

Некалі меркаваньне пра тое, што 90 працэнтаў дзяцей «зоны» трошкі «тармазнутыя» выклікала ў мяне скептычную ўсьмешку. Бо я і сам з «зоны». Але сёньня мне няцяжка ў гэта паверыць.

Праз 10 гадоў пасьля катастрофы ў дзяржавы няма ніякай палітыкі ў галіне наступстваў Чарнобыля. Гэта і выклікае тое перабольшваньне магчымасьцяў, выказваньні пра зусім бясьпечную тэрыторыю, а з другога боку, дазваляе рабіць зь «дзецьмі Чарнобыля» ўсё, што заўгодна.

Розныя арганізацыі і прыватныя асобы замежжа прапануюць дзецям «аздараўляцца». Але дзеці ў большасьці бачаць за мяжою толькі «цырк і марожанае». Уся цікавасьць да сьвету абмяжоўваецца тэлевізарам і жуйкай.

Тут я прыгадаў словы аднаго з стваральнікаў Канфэдэрацыі Працы Беларусі, які таксама займаецца праблемай лекаваньня дзяцей за мяжой. Першае яго пытаньне да новага патрнэра: «Ці ёсьць у вас досьвед у лекаваньні?» Калі ў адказ чуе: «У нас добра распрацаваная праграма...», адразу абрывае партнэра другім пытаньнем: «Колькі шкоды вы маеце намер нам прынесьці?» Бо ён не жадае, каб замежныя дабрадзеі спраўджалі свае мэдычныя тэорыі на нашых дзецях. Але ці чуў ён пра такі вось «пасіўны» спосаб шкоды?



У Беларусі шмат кажуць пра супрацоўніцтва ў гэтай галіне з краінамі Заходняй Эўропы. Там, вядома, шмат грошай. Але практычнага досьведу менш, чым у нас. Вядома, яны жадаюць як лепш. А ў тым, што яны, дбаючы пра здароўе нашых дзяцей, шкодзяць іх разьвіцьцю, вінаватая найперш палітыка нашай дзяржавы ў гэтай галіне.

Праўда, ёсьць сярод замежнікаў і такія, хто жыве за кошт арганізацыі дапамогі нам.

Замежнікі

Іх было шмат. І ўсё было добра, пакуль не прыехалі галоўныя – тыя, хто ўсё фінансуе. Вялікая дэлегацыя замежнікаў, супраць якіх паўсталі ўсе, за выключэньнем тых, хто атрымлівае іхнія грошы.

Мэдыкі завяліся з-за таго, што іхнюю ўнікальную працу замежныя спонсары выдаюць за сваю. Мэдыкі працуюць з васьмі раніцы да дванаццаці ночы, а замежнікі выкарыстоўваюць вынікі іхняе працы як свае.

Дзеці завяліся з-за сьвінскіх адносінаў. Усіх дзяцей прымушалі здымацца – як у канцлягеры, з шыльдачкай на грудзях, на шыльдачцы – імя дзіцёнка і імя спонсара. Акрамя таго, кожны дзіцёнак мусіў пісаць паперу: «Дзякуй багатаму дзядзю за наш адпачынак».

Летась за мяжу паехала выстава дзіцячых малюнкаў. Кіраваў мастацкай майстэрняй Аляксандар Квяткоўскі (бацька журналіста Севярына Квяткоўскага). Сёньня Аляксандар спытаўся, што з выставай. Высьветлілася, што яе прадалі. Ніякіх аўтарскіх правоў, ніякіх ганарараў, нават падзякі дзецям за працу да нас з-за мяжы не дайшло.

Такія замежнікі дакладна ведаюць наша становішча і папросту абкрадаюць нас: матэрыяльна – як з выставай, маральна – як з мэдыкамі, фізычна – як з фатаздымкамі. Бо гэтыя фатаздымкі – карт-блянш «спонсару» ва ўсіх ягоных дзеяньнях. Дзе потым усплывуць такія падзякі нашых дзяцей, аднаму Богу вядома.

«Колькі шкоды вы маеце намер нам прынесьці?»

* * *

Сьветлагорыя – мадэль грамадзтва. І аднолькавыя праблемы для Беларусі і Сьветлагорыі, створаныя залежнасьцю ад грошай замежнікаў, «псыхалягічным неўспрыманнем», камуністычнымі мэтадамі працы, агульным развалам у абедзьвюх краінах... Няўжо дзеля разьвязаньня гэтых праблем трэба будзе чакаць, пакуль вырасьце новае пакаленьне? Мне так ня хочацца чакаць...

Сяргей Пульша

Залатаная кішэня

У гэтага гораду заўсёды былі сталічныя амбіцыі. Пачынаючы з 1221 году, калі ён быў заснаваны ўладзімера-суздальскім князем Юрыем як супрацьвага Маскве. Амбіцыі, зрэшты, не перашкодзілі Ніжняму стаць выратавальнікам Маскоўскага княства ў 1612-м. Пасьля той вайны ля муроў Макар'еўскага манастыра, што ніжэй па Волзе, актывізаваўся адзін з галоўных расейскіх кірмашоў. У 1817-м кірмаш пераводзіцца ў Ніжні. З таго часу, назапашваючы капітал, гандлюючы з Эўропай ды Азіяй, дыктуючы кошты на шмат якія тавары, ніжагародзкае купецтва робіць свой горад гандлёвай сталіцай Імпэрыі. Таму пытаньня, дзе праводзіць у 1896-м годзе «Всероссийскую промышленно-художественную выставку», своеасаблівую дэманстрацыю дасягненьняў прамысловасьці пачатку расейскага капіталізму, – такога пытаньня не ўзьнікала.

Мяне не зьдзіўляе, чаму ніжагародцы, у бальшыні сваёй, зусім не настальгуюць па СССР. Забытыя да часу амбіцыі «трэцяй сталіцы» з адыходам за мяжу Кіева й Менску знайшлі сабе нарэшце выйсьце. У адкрыцьці гарадзкой брамы для іншаземных турыстаў і капіталаў, у вяртаньні вуліцам іх сапраўдных назваў (як прыемна гэта рабіць расейцам), у прыбраньні з тых вуліцаў бруду «горкаўскага» пэрыяду, у абраньні сваім кіраўніком маладога-прыгожага, а галоўнае – адкрыта пракапіталістычнага губэрнатара. І вядома, у адраджэньні знакамітага кірмашу.

Неяк пабачыўшы фатаздымкі выставы, якая праходзіла тут сто гадоў таму, я, разам з захапленьнем ад хараства ды маштабу таго комплексу, які сваімі сажалкамі, фантанамі ды палацамі-павільёнамі больш нагадваў імпэратарскую рэзыдэнцыю, адчуў і лёгкую зьбянтэжанасьць – няўжо гэта ўсё было ў маім загажаным раёне? Ад усёй той прыгажосьці не засталося ня тое што сьледу, а й намёку. Таму вестку аб правядзеньні юбілейнай выставы я ўспрыняў зь вялікаю доляй скепсысу. Калі ж пабачыў, як будуюцца звычайныя павільёны на тле раскошнага Галоўнага Кірмашнага Дому, то зразумеў, што вяртаць былое тут і не зьбіраліся.



Атрымаць акрэдытацыю на кірмашы аказалася справай лягчэйшаю, чым я меркаваў. Магічнае словазлучэньне «Наша Ніва» адчыняла перад мною любыя дзьверы й запальвала ўсьмешкі на тварах перад журналістам з «братской страны». Можа ўпершыню я не задаваў «лішніх пытаньняў». Усю інфармацыю пра выставу й кірмаш за нейкія паўгадзіны з задавальненьнем дала «нашей замечательной газете» прэс-сакратар кірмашу Ірына Марычава. На 25-ці тысячах квадратных мэтраў выставачных плошчаў 64 рэгіёны Расеі й 22 краіны-экспартэры разьмесьцяць тое, «чем богаты». Але галоўнае, як я зразумеў, ня ў гэтым. Нібы застрахаваўшыся ад бесталковасьці задумы, урад перад пачаткам кірмашу правёў адкрыты конкурс інвэстыцыйных праектаў, пераможцы якога атрымалі сродкі з фэдэральнага бюджэту на іх рэалізацыю.

Зьзяючы агнямі, чатырохпалубнік «Феликс Дзержинский», дзе была прызначана прэзэнтацыя Прэс-клюбу, абяцаў вясёлую ночку зь цікавымі знаёмствамі пад ненавязьлівую палітычную балбатню, з магчымым фліртам зь якой-небудзь каляжанкай пад перазвон келіхаў ды танцамі на начной палубе пад цыганскі ансамбаль, як сто гадоў таму. Але на маё расчараваньне нічога такога не было. Прэс-клюб уяўляў сабою ня надта багатую на стравы рэстарацыю з адпаведнаю шоў-праграмай, дзе інтэрмэдыі савецкіх часоў зьмяняліся аглушальнымі акордамі электрычнай гітары. Пад якую ня тое што пагаманіць, а падарыць камплімэнт адной з студэнтак мясцовага журфаку было праблематычна. Зрэшты, яны яго ня вельмі й чакалі ад госьця зь Беларусі. Краіны, на назву якой так жыва рэагуюць у Польшчы й якая ня выклікала ў маіх суседак па століку ніякіх брацкіх эмоцыяў. Я зусім не чакаў ад іх кіданьняў мне на шыю й гарачых пацалункаў, але й падзеі нашай мінулай вясны былі для іх такія ж далёкія, як і сама Беларусь. Таму, адчуўшы сярод гэтай роднамоўнай публікі самую халодную самоту, я не шкадаваў, што прыйшоў сюды. Нібы яшчэ раз атрымаў доказ таго, што нашае брацтва будзе настолькі ж шчырае, наколькі шчырыя будуць лабызаньні, аўгусьцейша дазволеныя нашаму прэзыдэнту.

Дзень адкрыцьця выставы выдаўся сьпякотным паводле ўсіх парамэтраў. Цэльсіяў пад трыццаць, машынаў на пад'ездах да кірмашу пад тысячу, людзей навокал пад мільён. Я адно пасьпяваў дэманстраваць свой бэйдж міліцэйскім пастам, праціскаючыся паміж Волгамі ды Мэрсамі да Галоўнага Кірмашнага Дому. Дзе натоўп бурна вітаў групу, якая ўзыходзіла на памост і зь якой і за мілю бязь цяжкасьцяў можна было вылучыць постаці Чарнамырдзіна й Нямцова. Віктар Сьцяпанавіч з натхненьнем, на якое толькі быў здольны, прачытаў занадта мастацкі для яго тэкст, дзе «Расея ўляцела ў XX стагодзьдзе на паравозе, а вылятае...» «На бомбардировщике», – зымправізаваў калега з ИТАР-ТАСС, што стаяў побач. Нямцоў чытаў яўна свой тэкст, у якім Ніжняму адводзілася роля галоўнага гандлёвага цэнтру краіны. Калі губэрнатар дайшоў да пахвальбы тэрмінамі, у якія быў узьведзены выставачны комплекс, зноў абудзіўся ітартасавец. «Борь, ты же рыбок обещал в фонтан запустить. Где рыбки ёптать?» «На обед Черномырдину пошли», – адказаў яму хтосьці.

Напэўна перасядзеўшы ва ўсіх новых мадэлях ГАЗа, перамераўшы піцерскія пінжакі й надзівіўшыся на якуцкае золата, я павінен быў захапіцца ды «іззайздросьціцца». Але, прыняўшы ўсё гэтае багацьце, як адпаведнае вялізнай краіне, я пазайздросьціў расейцам у іншым месцы. Назіраючы на прэзэнтацыі спадарожнікавага НТВ за двума Чарнамырдзінамі: лялечным, які казаў сьмешныя глупствы, ды сапраўдным, які заліваўся магутным рогатам. Разам з зайздрасьцю я яшчэ раз адчуў сваю гасьцявую прысутнасьць на чужым сьвяце.

Паблукаўшы яшчэ трохі, я знайшоў і нашых. Краіна, у якой любімая тэма для кіраўнічай балбатні й апраўданьняў –інтэграцыя з Расеяй, была прадстаўленая адным сьціплым стэндам магілёўскага швачнага аб'яднаньня МОГОТЭКС, якое даўно і з посьпехам абшывае Газпрам і расейскае войска. Больш Беларусь нічым у «Будущем России» не адзначылася. У адрозьненьне ад сваіх суседак Латвіі ды Украіны, якія занялі вялізныя экспазыцыйныя плошчы ды паверылі ў сур'ёзнасьць расейскай задумы.

Напрыканцы вечара ўсе чакалі губэрнатарскага прыёму. «Гэта п'янка пад Борыны тосты», – растлумачыў мне ўсё той жа тасаўскі гумарыст. Але ён памыліўся. П'янка была безь Нямцова. Той не вярнуўся з праводзінаў прэм'ера.

Вялізная Гербавая заля, дзе сталы ламіліся «яствами» ад Сьмірноффа, гаманіла пяцістамі галасамі. Усё нагадвала здымкі масавай сцэны для фільма пра канец Імпэрыі – жываты новых буржуа, футры іхніх дамаў, бародкі балбатлівага чынавенства, шустрыя афіцыянты. Не хапала толькі бальшавіка, які б стрэлам у столь прымусіў выслухаць ягоны тост. Але тое кіно, хочацца верыць, скончылася назаўсёды.

Падсілкаваўшыся, я выйшаў на кірмашовы пляц. У зорным небе давалі фэервэрк. Рознакаляровыя бутоны агнёў выклікалі гучныя выбухі захапленьня ў паспалітага люду за літаю агароджаю, па гэты бок якой некалькі «дам и господ», уладкаваўшыся ў фатэлях млява пляскалі ў ладкі, як на нудным канцэрце. Я падаўся да народу. Міліцэйскі падпалкоўнік пры парадзе з годнасьцю швэйцара расчыніў мне браму. Ля якой я нарэшце заўважыў тое, што прымусіла мяне пашкадаваць пра адсутнасьць фотаапарату. Паміж францускім і латыскім сьцягамі калыхалася чырвонае палотнішча з вузенькай зялёнай пасачкай наверсе (!). Ля дрэўка акуратнымі ромбікамі былі нашытыя белыя шнурочкі. Я з задавальненьнем дараваў расейцам іхнюю зыбыўлівасьць на сымбалі савецкага пэрыяду. Па выхадзе ж, сярод сьцягоў аздабленьня самых неверагодных колераў ды іх спалучэньняў, заўважыў і вялізны бел-чырвона-белы. Мройная Беларусь была ў шэрагах няісных фантастычных краінаў. Цікава, ці хто-небудзь яшчэ акрамя мяне заўважыў яе тут?..

Зьміцер Бартосік

МІЖНАРОДНЫ КАМЭНТАР

На золку новай «вясны народаў»

15 верасня поўнач Італіі — так званая Рэспубліка Паданія — мелася абвесьціць незалежнасьць. Дакладней, не сама дзяржава, межы і сталіца якой яшчэ нікому невядомыя, а тыя людзі, кіраўнікі Лігі Поўначы, што маюць намер адарваць нашчадкаў лянгабардаў ад дзяржавы Гарыбальдзі, чые ваякі,

дамогшыся добраахвотнага ўзьяднаньня Сыцыліі з Італьянскім каралеўствам, з рогатам гулялі ў шары адсечанымі галовамі на ружовых дворыках старасьвецкіх палацаў — страшны эпізод зь Пірандэла і «Хаосу» братоў Тавіяні.

Я даволі скептычна ставіўся да рэальнага падзелу Італіі аж да апошняга лета, калі мне давялося праехаць ад Трыесту да Будапэшту ў адным тамбуры з вэнэцыянскім наркаманам, што кіраваўся ў міжнародны лягер прыхільнікаў хардроку на беразе Дуная. Гэты прасьцецкі муляр са счарнелымі ад опію зубамі аказаўся зацятым прыхільнікам самастойнасьці Поўначы. Ён служыў у адным узводзе з хлопцамі з Поўдня, дык вось, усе яны — махляры, якім адно наўме — красьці. Зь ягонага аповеду я зразумеў, наколькі глыбокую крыўду выносіць з войска кожны паўночны італьянец. А мужчынскія крыўды — найпершы камень у падмурак саматоеснасьці юнай нацыі.

Умбэрта Босі, лідар Лігі Поўначы, ідэоляг аддзяленьня, выказваў намер сабраць на ўрачысты сходмітынг 15 верасня мільён чалавек, пасьля чаго разам з групай падтрымкі выправіцца ў пешае падарожжа ад мястэчка да мястэчка, накшталт Махатмы Гандзі, дзеля агітацыі за свабоду ад паўднёвых лайдакоў і мафіёзі, і рымскіх бюракратаў. Соль гэтай кампаніі — схіліць жыхароў Поўначы не плаціць падаткаў у дзяржаўны бюджэт (усё роўна тыя гультаі разбазараць). Не выкладайце важкі аргумэнт на карысьць незалежнасьці з вашай кішэні, — вось просты і даступны лёзунг сэпаратыстаў.

Абвінавачаньні наконт круцельства паўднёвікаў часткова справядлівыя. Так, улетку новы ўрад дзеля эксперымэнту прызначыў спэцыяльную камісію, каб праверыць, ці ўсе інваліды Нэапаля (а інваліды ў Італіі карыстаюцца вялізнымі льготамі) сапраўды інваліды. З 30 тысячаў зарэгістраваных паддаліся праверцы толькі 12... У Міляне такі размах махлярства наўрад ці магчымы.

І ўсё ж, упэўнены, учора і блізка не сабраўся мільён, каб паслухаць Босі. Бо гэта, як паміж Заходняй і Ўсходняй Беларусяй: і розьніца ёсьць, і крыўды, і суперніцтва, але «ну няўжо ты, дзядзька, сур'ёзна думаеш, што можна аддзяліцца ад Магілёва? Кінься!»

Ужо тры пракуроры розных гарадоў узбудзілі супраць Умбэрта Босі крымінальныя справы па факце «замаху на канстытуцыйны лад Рэспублікі».

Нягледзячы на ўсю фарсавасьць таго, што адбываецца цяпер у Італіі, і драматызм лёсу курдаў, што ў чарговы раз зазналі пакутаў ад Хусэйна, два гэтыя факты наводзяць на адну думку: на мяжы трэцяга тысячагодзьдзя нас чакае перадзел межаў. І ААН, галоўны гарант непарушнасьці межаў, сёньня сваёй абыякавасьцю да лёсу курдаў, патураньнем Іраку і спробамі вызначыць для ЗША, адкуль і дакуль можна абараняць правы чалавека ставіць крыж ня толькі на старым балянсе, але й на сабе, прынамсі, на старой форме сябе.

Сёньня ў Курдыстане знайшліся свае прыхільнікі «ядзінства», што дзеля захаваньня ўлады здалі незалежнасьць і зьвярнуліся па танкі багдадзкіх калянізатараў, але курды, якія 700 гадоў змагаліся за волю, і якім цяпер воляю выпадку палітычнай гульні будзе дапамагаць Амэрыка, усталююць, нарэшце, свой парадак, і гэта будзе першай ластаўкай новай вясны народаў. Чачэнія, Тыбэт, Корсыка, Інгушэтыя, Біская, Тамілнад, Якутыя, Косава, Казаманка, Джаму і Кашмір, Сыцылія... Дзе спыніцца тэктанічны разлом палітычнае карты сьвету?

Андрэй Дынько

КАЛЯНДАР

Зачараваць Шамана

На старонках «НН» ужо пісалася пра гое, што «той, хто не падтрымлівае традыцыйнае думкі, ня можа дасягнуць статусу лідара... Чалавек, які добра знаёмы з стэрэатыпамі калектыўнае сьвядомасьці... можа стаць лідарам гэтае групы». У сярэднявечнай Беларусі чараўніцтва перасьледвалася законам. Носьбіта адсутнай у астатніх людзей здольнасьці чакала вогнішча. Дагэтуль ці ня ў кожнай грамадзкай супольнасьці нетрадыцыйнасьць выклікае супраціў. Але, калі яна перамагае...

У гісторыі Беларусі ёсьць асоба, моц лідарства якой сягнула празь межы зразумелага сучасьнікам. Гэты чалавек — полацкі князь Усяслаў Брачыславіч — атрымаў супярэчнае традыцыі новахрысьціянскага сьвету імя «Чарадзей». Сёлета споўнілася 895 гадоў з дня ягонай сьмерці. Усяслаў Чарадзей кіраваў сваёй дзяржавай на працягу 67 гадоў. За гэты час ён ня толькі адстаяў незалежнасьць Полацкай зямлі, але праводзіў актыўную зьнешнюю палітыку: неаднаразова нападаў і захопліваў сталіцы «брацкіх» княстваў: Пскоў, Смаленск, Ноўгарад і Кіеў. З сваім нешматлікім войскам Чарадзей зьдзяйсьняў фантастычныя для тых часоў хуткія і дзёрзкія вайсковыя апэрацыі. Папулярнасьць гэтага чалавека сягала далёка за межы ягонай дзяржавы. Нездарма ж у 1068 годзе кіеўскія месьцічы паўсталі супраць свайго князя і пасадзілі на пасад Усяслава Чарадзея.

Энцыкляпэдычны даведнік «Беларусь» тлумачыць узьнікненьне імя «Чарадзей» празьмерным зьдзіўленьнем сучасьнікаў рашучасьцю, розумам і энэргіяй князя. У цяперашняга чалавека гэткае тлумачэньне можа выклікаць усьмешку. Але, калі ўлічыць, што ў XI ст. сярэдняя працягласьць чалавечага жыцьця не перавышала сарака гадоў, калі ўзгадаць, што паміж Кіевам і Ноўгарадам ляжала дарога ў некалькі месяцаў, можна зразумець аўтараў даведніка. Яны па-свойму ўразіліся асобай Усяслава Брачыславіча. Але сучасьнікі назвалі князя ня «хуткім» і ня «доўгажыхаром»: насуперак афіцыйнай хрысьціянскай ідэалёгіі яны скарысталі табуяванае слова «Чарадзей». Мы працягваем традыцыю нашых продкаў, мы жывем ва ўяўнай рэальнасьці звышсілаў. Для кожнага яны свае.

Ёсьць краіны, дзе чарадзейства дагэтуль ня толькі прызнаецца афіцыйна, але й лічыцца здабыткам традыцыйнай культуры і грамадзкіх узаемадачыненьняў. Напрыклад, у крымінальным кодэксе Бурундзі існуюць адмысловыя артыкулы, якія тлумачаць чарадзейныя злачынствы. З пункту гледжаньня сучаснага эўрапейца, гэта дзіка, але, прынамсі, сумленна. Іншая рэч у Беларусі. Відавочна, што той, хто не падтрымлівае сёньня традыцыйную думку, ня можа стаць лідарам у беларускім грамадзтве. Масавы псыхоз вялікай часткі насельніцтва ў зьвязку з асобай першага прэзыдэнта РБ тлумачыць гэтую традыцыю. Ёй ужо далі ўмоўнае азначэньне — шаманізм. На гэтым тле тым, хто «не падтрымлівае традыцыйнае думкі», робіцца нармальны чалавек. Нармальны чалавек ня можа лідарстваваць у «шаманствуюшчых». Дзея супраць традыцыі, кідок супраць плыні часу, стварэньне новай рэальнасьці — ГЭТА ЧАРАЎНІЦТВА. Такім чынам, перамога нармальнага над шаманскім у нашых умовах —гэта чарадзейства. Перамагчы шамана магчыма, галоўнае — ня верыць у яго.

Севярын Квяткоўскі

Чэрчыліянская араторыя ў амэрыканскім стылі

Нашы чытачы, напэўна, ведаюць пра антыцыгарэтную кампанію, якая практычна прагнала звыклага ў нас курца з вуліц ды іншых грамадзкіх месцаў. Паленьне цяпер успрымаецца ў многіх заходніх краінах ня проста як шкодная звычка, але лічыцца палітычна некарэктным, а часьцяком і антыграмадзкім дзеяньнем. Курцы пачынаюць разглядацца як непаўнавартасныя людзі ці свайго роду хуліганы. Напрыклад, падчас нядаўняга інтэрвію галоўнага рэдактара «НН» для нямецкай тэлевізіі, карэспандэнт і апэратар старанна чакалі, пакуль той дапаліць цыгарэту, перш чым уключылі сваю камэру. Яны растлумачылі, што цяпер у нямецкай тэлевізіі нельга паказваць людзей з цыгарэтай. Сваю рэакцыю на такое становішча выказаў у Оксфардзкім Таварыстве Брытанскай Садружнасьці падчас дыскусіі на тэму «Курцы і грамадзтва» з удзелам навукоўцаў, журналістаў, палітыкаў ды ўрадавых чыноўнікаў адзін зь вельмі вядомых амэрыканскіх сатырыкаў-памфлетыстаў з правымі поглядамі П.Дж.О.Рурк.

Зупэўненасьцю можна сказаць, што паленьне — гэта права. Можа яно невялікае, бязглуздае, брыдкае, нязручнае і вельмі трывіяльнае права, але гэтае права было даўна прынята, рашуча абараняецца і надзвычай шырока практыкуецца. Тым ня менш, я вылучаю яшчэ адну прапанову: па спрачацца наконт такога сьцьверджаньня — маўляў, паленьне — невялікае, бязглуздае, брыдкае, нязручнае і вельмі трывіяльнае. (Хай не пакрыўдзяцца найлепшыя розумы ўсіх прысутных.)

Я супраць дыскусіі толькі на падставе таго, што гэткага роду публічны абмен думкамі ў такой прыстойнай аўдыторыі — гэта, паводле сваёй прыроды, палітычная падзея. І я ня бачу прычыны таго, што паленьне павінна быць прадметам для палітычнага дыскурсу. Паленьне — гэта чыста грамадзянская ды сацыяльная дзейнасьць — асабістая справа, што мусіць вырашацца сярод курцоў, іх сяброў ды калегаў, якія цярпець ня могуць смароду, а таксама дактароў, што лекуюць курцоў ды любяць атрымліваць ад іх высокія ганарары за лячэньне ад раку.

Ужо само абмеркаваньне гэтай праблемы сьведчыць пра сымптом агіднай сучаснай тэндэнцыі пераводзіць усё ў сфэру палітыкі. Палітыка павінна абмяжоўвацца выключна рамкамі вядзеньня вайны, абароны ўласнасьці ды, час ад часу, прафіляктычнага адсяканьня галоў членам кіраўнічае клясы.

«Паленьне — права ці прывілей?» Гэтае пытаньне —дыялектычная пастка, у якую любяць завабліваць левыя. «Паленьне — ці гэта не твая справа, га?» Гэтак трохі лепш.

Давайце разгледзім гэтае пытаньне (хай не пакрыўдзяцца нашыя высокашаноўныя апанэнты) зь сьлізкай, мокрай, левай пэрспэктывы: ва ўмовах сучасных начотнішкіх урадаў нічога не зьяўляецца асабістым правам, бо правы маюць на ўвазе й абавязкі, а ў нас больш няма індывідуальных абавязкаў — выключна калектыўныя, палітычныя абавязкі.

Паленьне — гэта не калектыўнае дзеяньне, калі толькі вы не перадаеце запаленую цыгарэту па коле. Але гэта ўжо тэма для іншай дыскусіі. Паленьне таксама ня можа быць і прывілеем, бо ўсе прывілеі былі адмененыя. Я маю на ўвазе, што хіба мы ўсе не прыхільнікі ўраўнілаўкі? А таму курэньне мусіць быць нечым, што мы атрымліваем ад ураду як частку нашай долі. (Хіба вы ня ведаеце, што крыніцай усіх тавараў ды паслугаў ёсьць урад?) Ну вядома ж вы ведаеце. Вось чаму вы выбераце Тоні Блэра (лідэр Лейбарысцкай (рабочай) партыі ў Вялікабрытаніі — У.Б.). Увогуле, выдаткі на разьмеркаваньне дабротаў завысокія. Нават Лейбарысцкая партыя мусіць гэта прызнаць. Некаторыя даброты трэба ўрэзаць... Ну тады давайце ўрэжам паленьне, бо хто будзе г-э-т-а адстойваць?

Але падумайце, якім было б жыцьцё, калі б кожнае рашэньне прымалася большасьцю галасоў! Людзі насілі б выключна спартовае адзеньне. Адзінай ежай, даступнай у Ангельшчыне, была б ... ангельская. І ўсе мы спалі б з Эмай Томсан. Ёй бы гэта не спадабалася.

Асноўная прычына, каб супраць-стаяць палітычнаму кантролю над паленьнем — гэта ня даць улады, нават самай маленькай ды бязглуздай, у рукі такім людзям, якімі зьяўляюцца прысутныя тут нашыя апанэнты. О так, я ўпэўнены, што яны цудоўныя людзі, і ім можна давяраць у межах іх кампэтэнцыі. Але яны члены небясьпечнай клясы — клясы тых, хто лепей за нас ведае, што для нас добра. Яны альтруісты.

Ці ведаеце вы розьніцу паміж альтруістам і дабрачынным чалавекам? Дабрачынны чалавек прыходзіць да вас у хату ды кажа: «Я чуў, што вы галодны, дык я прынёс вам трохі паесьці». А альтруіст прыходзіць да вас у хату й кажа: «Я чуў, што вы галодны, дык прынёс вам некалькі кніг на гэтую тэму».

У сыгналах альтруістаў ёсьць элемэнт маральнага застрашэньня: «О, я ведаю, што вы занепакоеныя ўплывам паленьня на здароўе, — кажа альтруіст, — але вы занепакоеныя толькі тым узьдзеяньнем, якое робіцца на некалькі вашых сяброў ды чальцоў сям'і. А я клапачуся пра ў-с-і-х. Я нагэтулькі пра гэта клапачуся, што нават не магу спаць. Я не магу есьці. З-за гэтага нават распаўся мой шлюб. Я ўсё клапачуся, клапачуся ды клапачуся. І, як вы бачыце, паколькі я клапачуся пра гэта лепей за вас, то мусіць я і лепшы за вас чалавек. А паколькі я лепшы за вас чалавек, у мяне ёсьць права — не — абавязак «казаць, што вам трэба рабіць!»

Вы не павінны паліць таму, што гэта шкодна для ўсіх. «Гэта шкодна для ўсіх» — вялікі кліч таталітарызму новай хвалі, фашыстаў з шчасьлівымі тварамі, нацыстаў ад бясьпекі, прылізаных сталіністаў. Такіх людзей выкідаюць за дзьверы палітыкі, а яны ўпаўзаюць назад праз вакно здароўя. Яны ўжо даказалі, што залішняя вага шкодзіць кожнаму, і цяпер яны гавораць пра мэдычныя ды сацыяльныя наступствы курэньня. А далей яны пачнуць казаць, што мы павінны есьці. І развод шкодны для кожнага. Таму яны залезуць да нас у ложак ды пачнуць вучыць, што і як трэба рабіць. Што падводзіць нас да тэмы сэксу. А ён жа таксама шкодны для ўсіх: ён выклікае перанаселенасьць, AIDS, згвалтаваньні, прастытуцыю, Мадону. Нашыя апанэнты, каб толькі даўмеліся да таго, ужо стварылі б Лігу Сэксуальных Рэпрэсіяў.

Мы не павінны абмяркоўваць тэму тытуню. Мы павінны абмяркоўваць само такое абмеркаваньне. Пытаньне тут ва ўладзе ды кантролі. Тысячы жыцьцяў ды мільёны даляраў зьнішчаюцца праз паленьне. Але мільёны жыцьцяў ды мільярды даляраў зьнішчаюцца калектывісцкімі дзяржавамі. Пяцьдзясят мільёнаў загінула ў вайне, выкліканай фашызмам. Дваццаць мільёнаў былі забітыя Савецкім Саюзам. Незьлічоныя мільёны людзей былі замучаныя падчас мааісцкага Вялікага Скачку Наперад.

І, між іншым, падчас усіх гэтых жахлівых падзеяў усе, хто меў да гэтага дачыненьне, хацелі запаліць.

П.Дж.О.Рурк, The American Spectator

Падрыхтаваў Уладзімер Бараніч

№ 24/96
16 — 22 верасня

ШТОТЫДНЁВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ НАША НІВА

Інфармацыйнае забеспячэнне НАША НІВА

Новае слова на рынку беларускае прэсы — штотыдзень 8 палосаў патрэбнае інфармацыі

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭННЕ
BELARUSIAN PUBLIC RELATIONS ASSOCIATION

БІРЖА ПРАЦЫ • КНІГІ • РЫНАК • ТРАНСПАРТ • АДПАЧЫНАК • АДУКАЦЫЯ • СПАЖЫВЕЦ • ЗДАРОЎЕ • КІНО • ТБ • ТЭЛЕСАТ • РАДЫЁ • СПОРТ • МУЗЫКА • ЗА МЯЖОЮ

Маё імя КАЛЁМБА

глядзіце знакаміты сэрыял штопятніцы на канале **ОРТ**

Зь ліста ў рэдакцыю

Я псыхатэрапэўт. Мой знаёмец, лекар з "Хуткай дапамогі", зьвярнуў маю ўвагу на тое, што апошнім часам пачалі сустракацца выпадкі суіцыдаў з прычыны духоўнай адзіноты асабліва кштолту — чалавек ня мае беларускамоўнага асяродзьдзя.

Я маю досьвед псыхалягічнай дапамогі адзінокім старым, інвалідам, асобам зь вялікай сарамлівасьцю, якія маюць дэфіцыт стасункаў. Я з 1993 г. дапамагаю асобным пацыентам на роднай мове. Вось я і падумаў, чаму б мне не дапамагаць беларусам у цяжкі час моўнага нігілізму.

Працую я ў дзяржаўнай установе і таму дапамога будзе бясплатная. Ваша газэта — газэта сьвядомых беларусаў, сярод Вашых чытачоў больш знойдзецца тых, хто акрамя "Нашай нівы" не сустракае аднадумцаў.

Мае пляны — гэта яшчэ ня справы. Біць у званы да станоўчых вынікаў рана...

У гэтым нумары мы распачынаем новую старонку "Псыхалёгія". З удзячнасьцю разглядзім Вашыя матэрыялы і допісы, дасланыя нам у рэдакцыю.

псыхалёгія гл. стар. **10**

Апэрацыя "ВАГІ"

Беларуская Асацыяцыя сувязяў з грамадзкасьцю правяла міні-даследаваньне у рамках праграмы "Вагі — рух за правы спажыўца". Трэба было купіць адзін вялікі і адзін маленькі банан, палічыць, якое ў абодвух выпадках было абважваньне, калі яно было, і паведаміць, якая даўжыня купленых пладоў.

Атрымаліся наступныя вынікі.

Пры куплі банана максымальнае абважваньне на карысьць прадаўца складае 165 г з аднаго кіляграму! І гэта пры тым, што самы буйны банан важыць прыблізна 200 г! З гэтага вынікае, што ў 1 кг — 5 буйных бананаў, а дробных — 8-10. Разьлікі, натуральна, прыблізныя, але, ведаючы пра іх, кожны з нас, папрасіўшы ўзважыць кілю бананаў, адразу можа высьветліць ступень нахабства прадаўца. Адзначым, што найбольшыя абважваньні адбываюцца ў вулічных гандляроў на мэханічных, а асабліва на бытавых вагах з пластмасавай шаляй.

Вось што нам паведамілі пра бананы ў санэпідэмнаглядзе.

Адзін банан важыць прыблізна ад 70 да 110 г. Ядомая частка пладу складае 60-70% ад агульнай вагі. Энэргетычная вартасьць 100 г бананаў (у чыстым выглядзе) 91 кКал, 38 кДж. Зьядаючы 100 г гэтага экзатычнага пладу, Вы спажываеце:

Вады — 74%; бялку — 1,5%; тлушчоў — 0%; вугляводаў: агульных — 22,4%, монацукрынаў — 19%, крухмалу — 24%; абалоніны (клятчаткі) — 0,8%; арганічных кісьлінаў — у пераліку на яблычную — 0,4%; попелу — 0,9%; Na — 31 мг; K — 348 мг; Mg — 42 мг; Fe — 0,6 мг; В-каратыну — 0,12 мг; вітамінаў: В1 — 0,04 мг, В2 — 0,04 мг, Рр — 0,60 мг, С — 10 мг.

Нягледзячы на сваё заморскае паходжаньне, бананы даўно і трывала ўвайшлі ў наш рацыён. Іх пажыўныя ўласьцівасьці абумоўлены высокім зьмесьцівам цукраў, пераважна цукрозы і фруктозы, нізкім зьмесьцівам абалоніны і вялікай колькасьцю калію. Паводле гэтага паказьніка банан толькі крыху саступае брусквам, кізілу, чорнай парэчцы і фінікам.

У мякіне пладоў ёсьць біялягічна актыўныя рэчывы: сэратанін, нарпінэфрын, дапалін і катэхалямін. Яны ўзмацняюць лекавыя ўласьцівасьці бананаў пры страўнікава-кішачных захворваньнях: язвавай хваробе, бактэрыяльнай дызэнтэрыі, энтэрытах, а таксама пры запаленчых паразах сьлізьніцаў рота. Але адзначым, што вітамінаў гэтыя плады маюць мала.

Зьбіраюць бананы на працягу ўсяго году, але асноўны ўраджай прыпадае на лістапад-сьнежань і красавік-травень. Найчасьцей завозяцца гатункі "Гро-Мішэль", "Кавэндыш", "Баерскі карлік", "Лэдзі Фінгe", "Чырвоны Дака". Найбольш прыстасаваныя да перавозак бананы гатункаў "Гро-Мішэль", "Кавэндыш", а вось у "Баерскага карліка" вельмі траўмуецца ягоная тонкая скурка.

Імпартныя сьвежыя бананы падзяляюцца на I і II гатункі. У першым гатунку памер банана павінен быць ад 15 см, а пацямненьні на скуры пладу ня мусяць займаць болей за 1/5 плошчы. У другім гатунку — больш высокія нормы дапушчальных адхіленьняў: могуць трапляцца плады без пладаножак і меншых памераў, але ад 10 см, плямы і палосы на скуры могуць займаць ня больш за палову агульнае плошчы, разрыў лупіны ня большы за 2 см, пры гэтым мякіна пладоў не павінна быць парушана.

Зрэзаныя плады бананаў захоўваюцца каля 30 сутак. Палову гэтага часу займае транспартаваньне.

У залежнасьці ад умоваў высьпяваньня тэрміны захаваньня можна павялічыць ці скараціць.

Сьпелыя бананы захоўваюцца пры 12 С° і адноснай вільготнасьці паветра 80-85% на працягу 3-4 сутак. Замарудзіць высьпяваньне бананаў можна пры тэмпэратуры 12-14 С° і адноснай вільготнасьці паветра 85-90% у памяшканьні, якое добра праветрываюць. Калі Вы хочаце паскорыць гэты працэс, разьмясьціце бананы ў памяшканьне з тэмпэратурай 22 С° і вільготнасьцю 90-95%. Праз суткі тэмпэратуру паніжаюць да 19-20 С° і такой захоўваюць датуль, пакуль бананы ня зробяцца залацістымі, гэта значыць на працягу 4-5 сутак.

Калі тэмпэратуру рэзка павысіць, на лупіне можа зьявіцца "тыгровая" плямістасьць. Пры гэтым мякіна пладоў моцна разьмякчаецца, пагаршаецца іхны вонкавы выгляд. Нельга захоўваць плады пры тэмпэратуры ніжэйшай за 12 С°, бо гэта прыводзіць да іхнага застуджваньня.

Тэрмінова прадам 2-спальны ложак, б/к, нядорга. Тэл. 271-23-63 пасьля 18.00.

Малады чалавек 25-ці год пазнаёміцца з адзінокай дзяўчынай.
Сяргей
246029, г. Гомель, п\с 11.

МЯНЯЮ новую 2-пакаёвую кватэру ў Наваполацку на 2-пакаёвую ў Гомлі. Тэл. 2-13-05.

Дзяўчына 21/166 пазнаёміцца для стварэньня сям'і з мужчынам без матэрыяльных праблемаў. г. Мазыр, тэл. 2-65-99.

ЗДАРОЎЕ
Бясплатная псыхалягічная дапамога пры дэфіцыце плённых стасункаў, духоўнай адзіноце.
Даведкі на тэл. 265-74-12 штосерады з 18 да 20 гадзінаў.
Зьвяртацца пасьля 23 верасьня.

і Бясплатныя прыватныя абвесткі

ЗДАРОЎЕ
Раблю **лекавы** (*акупунктура*) і **агульны масаж** з выездам да кліента.
Тэлефон 62-83-86
з 20.00 да 22.00.

Бугальтар з досьведам працы і веданьнем кампутара шукае працу.
Тэлефон **2-264-263**

ПРАФЭСІЯНАЛЫ
Печы й каміны. Майце справы з прафэсіяналамі.
Тэл. 24-29-74

ВІНШУЮ!
Шчырыя віншаваньні і найлепшыя пажаданьні Аляксандру Васілевічу з нагоды Дня нараджэньня.
Ірына.

ПАЖАДАНЬНІ
Гурту "Камэлёт" тэрмінова прыдбаць жывыя бубны (барабаны) і паменшыць сынтэзатаршчыны. **Слухач Максім**

МОВА
Ангельская мова. Арыгінальны мэтад. Якасныя веды. Усе ўзроўні. Тэлефанаваць зранку і ўвечары.
Тэл. 226-46-45.

Перамотка й рэпарацыя электрарухавікоў, дрыляў, пыласмоктваў, пральных машынаў і інш. Тэл. 231-98-56 з 10.00 да 18.00.

Фартэпіяна, сальфэджа: індывідуальныя заняткі, падрыхтоўка да музычнае школы.
Тэл. **221-24-81.**

Прадам 2-пакаёвую кватэру ў Смаргоні ў цэнтры гораду. 4-ы паверх, вул. Коласа, 5-87. Тэл.: 2-26-59, 3-62-62.

ПЕРАКЛАДЫ
Баўгарская, беларуская, польская мовы: *пераклады якой заўгодна складанасьці, індывідуальныя заняткі.*
Тэл. 221-24-81

КУПОН *Бясплатнай прыватнай абвесткі*

Імя і прозьвішча

Адрэса, тэлефон

Тэкст:

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна.
220123, Менск, а/с 71 НАША НІВА

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь
АБАНЭМЭНТ на газэту **63125**
НАША НІВА
Колькасьць камплектаў

На 1996 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрэса)

Каму (прозьвішча, ініцыялы)

ПВ | месца | Літэр

ДАСТАЎНАЯ КАРТКА
на газэту **63125**
НАША НІВА

Кошт	падпіска	руб.	Колькасьць камплектаў	
	перасадрас.	руб.		

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрэса)

Каму (прозьвішча, ініцыялы)

Адрэса	Агульная плошча, м²	Жылая плошча, м²	Кухня	Санвузел	Паверх, сьцены	Тэлефон	Гаўбец, лоджыя	Кошт (USD)
Аднапакаёвыя кватэры								
Алтайская	35	16	7	а	5/9П	-	2Г	9000
Сонечная	31,6	19,4	5,7	с	3/5Ц	-	Г	10000
Чыгуначная	28	17	6	с	4/4Ц	+	Г	10000
Казінца	31	16,5	7,6	а	1/5П	+	Г	10300
Філатава	31	19	6	с	1/5	-	-	10500
Казінца	30	16	7,6	а	1/5П	+	Л	10500
Жукава пр., 21/2	35	20	5,8	с	3/5	+	Г	10500
Харкаўская	30,7	19	5,8	с	5/5П	-	Г	11000
Сямёнава	30	17,9	6	с	5/5Ц	+	Г	11000
Волаха, 9/1	30	17	5,8	с	1в/4Ц	-	-	11000
Партызанскі пр., 54	30	17	6	с	1/5Ц	+	-	11000
Сямёнава	30	17,8	6,5	с	5/5Ц	+	Г3	11000
Волаха	30	17	6	с	1/4Ц	-	-	11000
Чарвякова	17	34	7,2	а	1/9П	-	-	11000
Партызанскі пр., 29а	28	17	5,5	с	3/5Ц	+	Г	11500
Харужай	32	18	7	а	1/5П	+	-	11500
Ясеніна	33	17,5	7,2	а	4/9П	-	Л	12000
Маўра, 60	35	18	7,4	а	4/5П	+	-	12000
Талбухіна, 17	30	19	6	с	1/5Ц	+	-	12000
Асаналіева	33	17	7,2	а	5/9П	-	Л	12000
Касманаўтаў, 23	34	17	7,2	а	3/9П	+	Л3	12300
Залатая Горка	31	21	6	с	3/3Ц	-	-	12500
Талбухіна	32	19	6	а	1/4Ц	+	-	12500
Касманаўтаў, 23/2	33	16	7,2	а	3/9П	+	Л3	12500
Маякоўскага	29,5	16	7,1	а	6/9П	-	Л	12500
Жудро, 45	35	18	7,5	а	9,9	+	Г	12500
Сухараўская	33	17	7	а	9/9П	-	Л	12800
Іванаўская	30,9	17,2	6	с	2/4Ц	+	Г	13000
Прытыцкага	36	17	8	а	6/9Ц	+	-	13000
Пушкіна пр.	34	17,5	7,5	а	4/9П	-	Л3	13000
Цікоцкага	33	17,1	7,2	а	6/9П	+	Л	13500
Мірашнічэнкі	33	17	7,2	а	11/12П	+	+	13500
Прытыцкага	33,5	17	7,5	а	3/9П	+	Л	13500
Гало, 6	0	17	0	а	3/9П	-	Л	14000
Ляўкова	33	17	7,2	а	4/9П	-	Л	14000
Шугаева	35,5	18,3	9	а	16/22М	+	2Л	14000
Л.Украінкі, 12	35	17	8	а	5/9П	+	Л	14000
Парніковая, 9	33,4	17,1	7,1	а	9П	+	Л	14300
Маякоўскага, 16	33	17,5	7,2	а	3/9Ц	+	Л	14500
Нававіленская	30	19	5,5	с	2/3Ц	+	Л	14500
Рафіева	40	16	9	а	9/10Ц	-	Л	14500
Захарава, 64	39	15	9	а	1/9Ц	+	-	15000
Л.Украінкі, 14	38	17	8	а	12/12	+	2Л	15000
Дзянісаўская	38	18	8,8	а	9/12Ц	-	Л	15500
Магілёўская	33	17	7,2	а	8/9П	+	Л	15500
Скарыны пр.	31	17	6	с	5/5Ц	+	-	15500
Гікала	34	18	7,1	а	3/5Ц	+	-	15500
М.Багдановіча, 53	33	17	7,2	а	7/9	+	Л	15500
Скарыны пр.	37	18	7,8	а	4/9П	+	Л	15500
Нікіфарава, 11	34	21	7	а	2/9П	-	Л	15500
Арлоўская	33,3	17,2	7,5	а	3/9П	+	Л	16000
В.Харужай	31	17	7	с	3/9П	+	Г	16000
Скарыны пр.	39	18	9	а	10/16М	+	Л	16000
Натуралістаў, 5	35	20	8,7	с	1в/4Ц	+	-	16000
Скарыны пр.	36	18	9	а	10/16М	+	Л	16000
Усходняя	34	18	7,2	а	2/9Ц	-	Л	17000
Кісялёва	41,8	23,6	7	а	4/5Ц	+	Г	19000
Нямiга	40	20	7,2	а	4/9Ц	+	Л	20000
Двухпакаёвыя кватэры								
Авангардная	34	24	4,5	с	1/2Ц	-	-	12000
Гатава	51	27,4	7,7	а	6/9П	+	Л	12000
Казінца пл.	48	27	7	а	1/2Ц	+	-	13000
Станіслаўскага	37	25	6,7	с	2/4Ц	+	-	13000
Енісейская, 10	41	28	5,5	а	1/5Ц	+	3Г	13500
Галадзеда	40	24	7	а	5/5Ц	+	Г	13500
Асіпенкі	45,1	32,9	6,3	с	1/5П	+	-	14000
Кнорына	42	28	6	с	1/5Б	-	-	14000
Жылуновіча, 37	44	28	6	с	5/5	+	Г	14000
Гусоўскага	42	26,7	5,8	с	3/5П	-	Г	14500
Цэнтральная	47	27	7	а	2/4Ц	-	-	14500
Я.Коласа	48	30,5	7	а	4/5Ц	+	Г	15000
Р.Люксэмбург 2 зав.	41	26	5,6	с	5/5	+	Г	15000
Галадзеда	51	28	7	а	5/9Ц	-	Г	15000
Асіпенкі, 32	42	31	6	с	1/4Б	-	-	15000
Каліноўскага, 26	41	25	6,1	а	2/5	+	Г	15500
Ламаносава	44	31	6	с	1/5Ц	+	-	15600
Я.Коласа, 63	45	28	6	с	2/5Ц	+	-	16000
Антонаўская, 12	46	29	6	с	4/5П	+	-	16000
Галадзеда	47,7	26,7	7	а	6/9Ц	+	Г3	16000
Ракасоўскага	48	32	6	а	5/5П	+	Г	16000
Гарэцкага	49	28	7,2	а	10/10П	-	Л	16000
Ракасоўскага пр.	47	31	6,5	а	3/5П	+	Г	16500
Антонаўская	44	32	6	с	4/5П	+	Г	16500
Ясеніна	46,4	23,8	7	а	9/9П	-	Л	16500
Каліноўскага	47	32	6,3	а	5/5П	+	Г	16600
Сухараўская	48,6	28,4	7,2	а	2/9П	-	Л	16800
Ясеніна	46,4	28,3	6,9	а	9/9П	-	Л	17000
Ракасоўскага пр.	57	31	8	а	1/9П	+	2Л	17000
Касманаўтаў	54	30	9	а	9/9П	-	Г	17000
Сухараўская	49	29	7,2	а	7/9П	-	Л	17000
Каліноўскага, 60	38	23	6	а	2/5П	+	Г	17000
Известий пр.	49,6	29,1	7,2	а	1/9П	+	Л	17500
Скарыны пр.	37,9	21,3	7	а	8/9П	+	Л	17500
Сердзіча	49,5	34	6,2	а	1/5Б	+	-	17500
Ясеніна, 113	53	31	9,3	а	4/9П	-	Г	17500
Адзінцова	48	29	7	а	4/9П	+	Л3	18000
Любімава пр.	49	28,7	7,5	а	5/9П	+	Л	18000
Слабадзкая	47	28	7,1	а	3/9П	-	Л	18000
Садовая, 18	45	28	7,8	а	1в/9П	+	Л3	18000
Казінца	50	32	7,2	а	3/5Ц	+	Г	18000
Панамарэнкі	28	46,5	7,2	а	6/9П	+	Г	18500
Каржанеўскага зав.	47	28,5	7,1	а	4/9П	+	Л	18500
Пляханава	46,6	28,4	7,1	а	5/9П	+	Л	18500
Сухараўская, 13	50	29	7,5	а	2/9П	-	Л3	18500
Старынаўская, 4	47	28	7	а	5/9П	-	Л	18500
Скарыны пр.	46	31	6,5	а	5/5П	+	Г	19000
Пляханава	47	28,5	7,2	а	4/9П	+	Л	19000
Гарадзецкая	46,5	28,5	7,1	а	8/9П	-	Л	19000
Праўды, 38	53	28	9,5	а	6/12П	+	2Л	19000
Слабадзкая	51	30	9	а	5/12П	-	Л	19000
Альшэўскага	50	30,5	7,5	а	2/9П	+	2Л	19000
Сухараўскі пр.	49	29	7,5	а	2/9П	+	Л3	19500
Ракасоўскага	50	28	8,7	а	7/12П	-	Л	20000
Магілёўская	47	28	7,2	а	9/9П	+	Л	20500
Купрыянава, 17	46	28	7	а	8/9Ц	+	2Л	20700
Нікіфарава	49	29	7,5	а	4/9П	+	Л	21000
Вясёлкавая	46,8	28,3	7,2	а	3/9П	+	Л	21500
Шугаева, 3	50	31	7,5	а	2/9П	+	Л	21500
Магілёўская	56	29,4	9,5	а	1/12П	+	Л	22000
Варанянскага	51	26	10	а	1/9Ц	+	Л	22000
Лынькова, 7	50	30	9	а	3/9П	+	Л	22000
Русіянава	56	30	9	а	10/12П	-	Л	22000
Л.Украінкі, 8	50	29	7	а	3/9П	+	Л	22000
Скарыны пр.	47	29	7,3	а	4/9П	+	Л	22500
В.Харужай	48	29	6	а	1/4Ц	+	-	23000
Куйбышава	53,4	35,7	6,4	а	3/5Ц	+	Г	23000
Багдановіча	48,7	29	7,2	а	6/9П	+	Л	23500
Чарвякова	54	29	7,6	а	2/9Ц	+	Л	24000
К.Чорнага	52,5	34,3	8,0	а	3/5Ц	+	2Л	25000
Талбухіна	52	27	9	а	6/9П	+	Л	25000
Маякоўскага, 24	51	30	9	а	7/13Ц	-	Л	25000
Куйбышава	49	31	6,8	а	4/5Ц	+	Г	26000
Старавіленскі тракт	50	30	8	а	10/12Ц	+	Л	26000
Заслаўская	50	29,9	9	а	12/12П	+	Л	27000
Кульман	49	29	7,5	а	2/9П	+	Л	28000
Цнянская	56	34	7	а	2/9Ц	+	Л	29000
Скарыны пр.	62	34	11	а	3/6Ц	+	-	30000
Цнянская, 13	52	34	7	а	2/9Ц	+	Л	30000
Багдановіча, 143	58	34	7	а	2/9Ц	+	Л	30200
Казлова	60	36,8	7	а	2/5Ц	+	Г	31500
Чычэрына	63	34	11	а	3/5Ц	+	Г	33000
Чычэрына	63	34	11	а	3/4Ц	+	-	35000
Скарыны, 16	60	31	12	а	5/5Ц	+	Г	45000
Кульман, 13	66	34	11	2	5/9Ц	-	2Л	60000
Трохпакаёвыя кватэры								
Бірузова	53	44	5,4	с	4,5П	+	Г	18000
Альшэўскага	58,5	42,2	6,2	с	5/5П	+	Г	18500
Кахоўская, 35	56	41	6	а	5/5П	+		18500
Кахоўская	61	45	6,2	с	1/5Ц	+	-	19000
Л.Карастаянавай	56	41	7,2	с	2/5Ц	+	Г	19500
Убарэвіча	61	45,8	6	а	1/5П	+	Г	20000
Каліноўскага	50	34	6,8	а	2/5П	+	Г	21000
Казінца	60,8	42,4	8	а	3/5П	+	Г	21000
Арлоўская	58	41	6	с	2/5П	+	Г	21000
Бурдэйнага	64	44	7,2	а	1/9П	+	Л	21500
С.Ясеніна	58,4	38,6	7,1	а	4/9П	-	Л	21500
Пушкіна, 13	61	43	7,4	а	9/9П	-	Л	21500
Сухараўская, 1	66	43	7,,3	а	9/9П	-	Л	22000
П.Глебкі	55,6	35,2	7,0	а	4/9Ц	+	Л	22000
Сухараўская	63	43	7,2	а	9/9П	-	Л	22000
Известий пр.	65	43	7,2	а	6/9	-	Л	22000
Слабадзкая, 25	65	44	9	а	6/10	-	Л	22000
Пляханава	64	39	9	а	2/12П	+	Л	22500
Сухараўская	64	43	7,2	а	9/9П	-	Л	22700
Любімава пр.	63	43	7	а	6/9П	+	Л	23000
Асаналіева	68,1	39,7	7,1	а	7/8Ц	+	2Л	23000
Каліноўскага	62	46	6,3	а	5/5П	+	Г	23000
Багратыёна 2 зав.	72	48	7,5	а	9/9П	+	Г	23000
Гікала, 12	58,7	45	5,8	с	3/5П	+	Г	23000
П.Глебкі	55	36	6,8	а	4/9	+	Г	23000
Ракасоўскага	68	48	7,5	а	1/9П	+	Л	23000
Слабадзкі праезд	63	43	7,1	а	7/9П	-	Л	23500
Асаналіева, 58	70	43	9,1	а	8/9П	+	2Л	23500
Сухараўская	65	43,3	7,5	а	7/7П	-	Л	23600
Ракасоўскага пр.	72	48	7,6	а	1/9П	+	Л	24000
Касманаўтаў	70	40,6	9	а	9/9П	-	Л	24000
Ракасоўскага, 60	65	39	9	а	10/12П	+	Л	24400
Кальцова	65	49,4	6	а	3/5П	+	Г	24000
Мірашнічэнкі	62	49	7	а	1/8П	-	Л	24000
Любімава пр.	66	43	7,2	а	6/9П	+	Л	24500
Ракасоўскага пр.	68	48	7,2	а	3/9П	+	Л	25000
Сухараўская	65	43	7,3	а	5/10П	-	Л	25000
Галадзеда пр., 11	61	46	6,9	а	4/5П	+	Л	25000
Известий пр., 59	65	43	7,2	а	8/9	+	Л	25000
Маўра	65	42,6	7,5	а	2/9П	-	Л	26000
Куйбышава, 46	59	42	7,5	а	4/9П	+	Л3	26000
Цікоцкага	63	43	7,2	а	8/9П	+	Л	27000
Маўра	86	54	12	а	1/2Ц	+	-	27000
Раманаўская Слабада	54	36	7,5	а	2/5Ц	+	-	27700
Рафіева	65	38	9,5	а	10/12П	+	Л	28000
Л.Украінкі	68	43	7,5	а	7/9П	+	Л	30000
Някрасава	62	42	8,3	а	1/9П	+	Л	30000
Шугаева	78	54	7,2	а	6/9П	+	2Л	32000
Гарадзецкая	78	40	10	а	7/12Ц	+	Л	32000
Сьвярдлова	66,3	40,1	7,8	а	3/9Ц	+	2Г	33000
Багратыёна	76	46	9,2	а	4/10	+	2Л	33000
Чарвякова	63	41	7,5	а	2/9Ц	+	Л	34500
Аэрадромная	64,7	38,7	8,3	а	8/12Ц	+	Л	35000
Марцінкевіча, 8	66	37	8,5	а	3/12Ц	+	Л3	35000
Скарыны пр., 39	72	46	11	а	8/8Ц	+	Г	35000
Скарыны пр.	76	43,5	9,5	а	10/12Б	+	Л3	38000
Лагойскі тракт	83	52	7,6	а	2/9Ц	+	Г	40000
Камуністычная	62	41	7,9	а	1/5Ц	+	-	40000
Скарыны, 55	72	48	8,3	а	2/4Ц	+	3Г	42000
Войсковы зав.	77	47	11	а	4/4Ц	+	2Г	43000
Скарыны пр., 74	70	50	8	а	4/5Ц	+	Г	45000
Скарыны пр., 34	78	45	13	а	9/10Ц	-	ГЛ	49000
Камуністычная, 4	91	56	14	-	3/5Ц	-	Г	65000
Скарыны пр.	78	47	15	а	4/5Ц	+	Г	92000
Чатырохпакаёвыя кватэры								
Славінскага	55	42	6,5	а	5/5П	-	Г	19000
Козыраўская, 35	62	47	5,8	а	1/5П	+	-	20000
Славінскага	56	42,8	6,2	а	5/5П	-	Г	21000
Каліноўскага	57,9	41,5	6,2	а	4/5П	+	Л	22000
Казінца	70,4	53,5	7,4	а	5/5П	+	Л	23500
Слабадзкая	80	55	7	а	4/9П	-	2Л	25000
Каліноўскага	60	43	6,5	а	4/5П	+	Г	25000
Касманаўтаў	76	54	8	а	1/9П	+	2Л3	25000
Якубоўскага	76	52	7,2	а	3/9П	+	2Л3	26000
Маўра, 48	72	54	7,5	а	3/5П	+	Л3	26000
Голубева	78	53,1	7,2	а	6/9П	+	2Л	27000
Рафіева, 78	86	56	7,5	а	3/9	+	2Л	27000
Ясеніна	78	52	9	а	12/12П	-	Л	27500
Шаранговіча	82	55,5	7,1	а	6/9П	-	Л	28000
Несьцерава, 61	77	53	7	А	4/9П	-	2Л	28000
Ясеніна	78	52	9	а	12/12П	-	Л	28000
Ясеніна, 123	78	52	9	А	1/12П	-	2Л	30000
Пушкіна пр., 19	57	41	6	а	2/5П	+	Г	30000
Голубева, 14	79	53	7,2	а	6/9П	+	2Л	30000
Якубава	80	49	7,5	а	6/9	+	2Л	30000
Шаранговіча	81,7	55,3	7,1	а	6/9П	-	Л	30000
Рафіева	80	53	9	а	4/12П	+	Л	31000
Жудро, 29	81	59	8	а	1/9Б	+	2Г	32000

Паважаныя чытачы!

Вось ужо тры гады, як дзейнічае закон *"Аб абароне правоў спажыўцоў"*. І хаця, абапіраючыся на закон, многія рэальна абаранілі свае правы, дасягаецца гэта вялікім здароўем, часам і нэрвамі.

Нас цікавіць, дзе, як і наколькі эфэктыўна дзяржаўныя і грамадзкія ўстановы дапамагаюць спажыўцам абараняць іхныя інтарэсы. Мы просім адказаць на пытаньні анкеты тых, каму сёлета даводзілася зьвяртацца па дапамогу ў дзяржаўныя і грамадзкія структуры, каб дамагчыся задавальненьня законных прэтэнзіяў да прадпрыемстваў гандлю і сфэры паслугаў.

Анкета

1. У якія ўстановы сёлета Вам даводзілася зьвяртацца, каб абараніць свае правы?
1.1. Дзяржгандалыінспэкцыю;
1.2. Санэпідэмстанцыю;
1.3. Антыманапольную Ўправу;
1.4. Управу (камітэт, аддзел) абароны правоў спажыўцоў пры мясцовай адміністрацыі;
1.5. Суд;
1.6. Органы ўнутраных справаў, міліцыю;
1.7. Таварыства спажыўцоў;
1.8. Іншыя (якія менавіта).

2. З нагоды якіх парушэньняў якіх спажывецкіх правоў Вы зьвярталіся?
2.1. Адмоўлена ў абмене няякаснага тавару (пазначце якога);
2.2. Адмоўлена ў вяртаньні грошай за няякасны тавар (які);
2.3. Адмоўлена ў абмене даброякаснага тавару;
2.4. Прапаноўвалася няпоўная грашовая кампэнсацыя за няякасны тавар;
2.5. Адмоўлена ў кампэнсацыі за няякасную паслугу, працу;
2.6. Адмоўлена ў кампэнсацыі за нясвоечасова выкананыя паслугі, працы;
2.7. Іншае (што менавіта).

3. Які вынік?
3.1. Нічога не атрымалася, бо мне адмовіліся дапамагчы;
3.2. Нічога не атрымалася, бо ва ўстанове, куды я зьвярнуўся, кепска ведалі, як мне дапамагчы;
3.3. Пакуль нічога не атрымалося, але я спадзяюся на станоўчы вынік;
3.4. Пакуль нічога не атрымалося, але станоўчага выніку я не чакаю;
3.5. Мае патрабаваньні часткова задаволеныя;
3.6. Мае патрабаваньні цалкам задаволеныя;
3.7. Вынік пераўзышоў усе мае самыя вялікія чаканьні;
3.8. Іншае (што менавіта).

4. Асобныя зьвесткі пра сябе
1. Ваш пол: мужчынскі жаночы
2. Ваш узрост: _____ гадоў
3. Ваша адукцыя:
вышэйшая початковая вышэйшая
сярэдняя початковая сярэдняя
4. Вы прожываеце ў:
рэгіён, горад, вёска
5. Зь якога часу чытаеце "НН"?
6. Вы яе:
6.1. выпісваеце;
6.2. купляеце ўвесь час;
6.3. купляеце час ад часу.

БІРЖА ПРАЦЫ

МЕНСК

ПТВ № 133 (вул. Халмагорская, 63, тэл. 246-55-61) запрашае на працу **слесара-рамонтніка аўтамабіляў, электраманцёра, выкладчыка аўтасправы, выкладчыка гісторыі-геаграфіі.**

Дом-інтэрнат № 2 (вул. Воўпшасова, 41, тэл. 246-42-42) запрашае на працу **сантэхніка, электрыка, сталяра, даглядчыка, доктара-псыхатэрапэўта, доктара-псыхолага.**

Кантора мэханізаванай прыборкі гораду (вул. Анаева, 67, тэл. 235-50-42) запрашае на працу **кіроўцу-экскаватарніка, трактарыста-экскаватарніка, кіроўцу аўтавежы** (на газавым паліве).

ААТ "Салён у Галіны" (вул. Захарова, 65, тэл. 236-15-84) запрашае на працу **манікюрку-пэдыкюрку.**

СПК "Будаўр" (вул. Уральская, 41, тэл. 235-13-22) запрашае высокакваліфікаваных **сталяра** 4-6 ступені, **маляра** 4-6 ступені, **тынкоўніка** 4-6 ступені, **муляра** 4-6 ступені (праца на кантрактнай аснове).

СКП "Валет" (тэл. 245-11-01) запрашае **супрацоўніка з уласным аўтамабілем** (заробак дамоўны).

ААТ "Легаўтатранс" (тэл. 226-87-00, 223-30-62) запрашае на працу **кіроўцу легкавога аўтамабіля** (з досьведам працы ня меншым за 1 год).

Прыватны прадпрымальнік (пас. Гатава, тэл. 293-45-11) запрашае на працу **швачак, краўца, мэнэджэра** швачнай вытворчасьці.

МЕНСКАЯ ВОБЛАСЬЦЬ
ПУХАВІЦКІ РАЁН

Калгас імя Я.Купалы, в. Гарадзец, тэл. 5-04-35, 9-91-50, запрашае на працу **токара**; дом.

Калгас "Сялецкі", в. Сялец, тэл. 7-42-32, 7-42-17, запрашае на працу **трактарыста, даярку**; дом.

ДЗЯРЖЫНСКІ РАЁН

Саўгас "Дзямідавічы", в. Юцкі, тэл. 3-51-23, запрашае на працу **загадчыка машыннага двара, загадчыка фэрмы, брыгадзіра, жывёлагадоўцаў**; кватэра.

ЛЮБАНСКІ РАЁН

Калгас "40 год Кастрычніку", в. Яменск, тэл. 5-91-23, запрашае на працу **галоўнага заатэхніка**; індывідуальны жылы дом.

САЛІГОРСКІ РАЁН

в. Палесьсе, СШ, тэл 71-2-94, запрашае **настаўніка беларускай мовы і літаратуры, музыку** (завадатар).

СТАЎБЦОЎСКІ РАЁН

Калгас "1 траўня", в. Літва, тэл. 5-41-84, 4-34-30, запрашае **вэтурынарнага доктара, даярак, мэханізатараў**; 4 кватэры.

Калгас імя Пушкіна, в. Яблонаўка, тэл. 5-50-64, 4-33-96, запрашае **галоўнага інжынэра**; дом.

ВІЛЕЙСКІ РАЁН

Саўгас "Даўгінава", в. Даўгінава, тэл. 5-42-78, запрашае **жывёлагадоўцаў.**

ЛАГОЙСКІ РАЁН

Калгас "1 траўня", в. Зарэчча, тэл. 7-28-32, запрашае **экскаватарніка**; кватэра.

Калгас "Кораньскі", в. Корань, тэл. 57-3-32, запрашае **бухгальтара, эканаміста, інжынэра-мэханіка, заатэхніка.**

Калгас імя К.Маркса, в. Астрашыцы, тэл. 57-6-32, запрашае **даярак, трактарыстаў**; 1 кватэра.

БАРЫСАЎСКІ РАЁН

Саўгас "Траянаўка", в. Траянаўка, тэл. 7-36-37, запрашае **галоўнага вэтурынарнага лекара, прараба**; кватэра.

Саўгас "Вясёлка", в. Забашэвічы, тэл. 7-95-33, запрашае **трактарыста**; кватэра.

Гаспадарка, в. Вуглы, тэл. 2-07-87, запрашае **інжынэра ледаўных** (халадзільных) **установак**; інтэрнат.

Калгас "Баркі", в. Зачысьце, тэл. 7-06-35, запрашае **галоўнага вэтурынарнага лекара**; кватэра.

Саўгас "Гвардыя", в. Ухалодаа, тэл. 7-72-73, запрашае **галоўнага бухгальтара, галоўнага энэргетыка**; кватэра.

МАГІЛЁЎСКАЯ ВОБЛАСЬЦЬ
БЫХАЎСКІ РАЁН

Калгас "Расія", в. Паляніновічы, тэл. 2-29-15, запрашае **галоўнага заатэхніка, вэтурынарнага лекара**; дамы сядзібнага тыпу.

Калгас імя Куйбышава, в. Ніканавічы, тэл. 2-20-33, запрашае **галоўнага заатэхніка, галоўнага вэтурынарнага** лекара; дамы сядзібнага тыпу.

Калгас "Ленінскі шлях", в. Красны берег, тэл. 2-29-53, запрашае на працу **прараба**; дамы сядзібнага тыпу.

Калгас "Іскра", в. Ісконь, тэл. 2-25-08, запрашае **галоўнага заатэхніка**; дамы сядзібнага тыпу.

ЧАВУСАЎСКІ РАЁН

Калгас "Зара", в. Пілешчына, тэл. 2-16-02, запрашае **галоўнага вэтурынарнага лекара**; дом сядзібнага тыпу.

Калгас імя Ільіча, в. Кузьмінічы, тэл. 2-41-4, запрашае **галоўнага заатэхніка**; кватэра.

Калгас "1 мая", в. Антонаўка, тэл. 2-16-67, запрашае **кіроўцу аўтобуса, газазлектразварніка, токара, галоўнага вэтурынарнага лекара**; 2 дамы сядзібнага тыпу; 1 кватэра.

Калгас "Асінаўскі", в. Асінаўка, тэл. 2-19-68, запрашае **трактарыста, даярак, галоўнага вэтурынарнага лекара**; 1 дом сядзібнага тыпу, 1 кватэра.

ЧЭРЫКАЎСКІ РАЁН

Калгас "Большавік", в. Гліньі, тэл. 2-11-56, запрашае **заатэхніка**; дом сядзібнага тыпу.

Калгас "Сьцяг", пас. Майскі, тэл. 2-62-37, запрашае **галоўнага інжынэра, рабочага, даярку**, дамы сядзібнага тыпу.

Саўгас "Лабанаўка", в. Лабанаўка, тэл. 2-96-36, запрашае **галоўнага вэтурынарнага лекара**; дом сядзібнага тыпу.

КЛІЧАЎСКІ РАЁН

Саўгас "Дабраволец", в. Арэхаўка, тэл. 21-3-20, запрашае **мэханізатараў, даярак**; інтэрнат.

КЛІМАВІЦКІ РАЁН

Э/Б "Раднянская", в. Радня, запрашае **даярак**; 3 дамы сядзібнага тыпу.

Саўгас "Мілаславіцкі", в. Мілаславічы, запрашае **вэтурынарнага лекара, брыгадзіра трактарнай брыгады**; 2 кватэры.

ДРЫБІНСКІ РАЁН

Саўгас "Запаветы Леніна", в. Расна, тэл. 2-36-45, запрашае **жывёлагадоўцаў**; 1 кватэра; дом сядзібнага тыпу.

Калгас "Сьвітанак", в. Карзба, тэл. 2-43-97, запрашае **токара**; дом сядзібнага тыпу

МСЬЦІСЛАЎСКІ РАЁН

Сьвінакомплекс "Вікра", тэл. 5-10-47, запрашае **галоўнага энэргетыка**; дом сядзібнага тыпу.

Калгас "70 год БССР", в. Мозалава, тэл. 6-11-40, запрашае **галоўнага інжынэра, галоўнага вэтурынарнага лекара**; кватэра.

Калгас "Кастрычнік", тэл. 5-27-19, запрашае **галоўнага вэтурынарнага лекара**; кватэра.

Саўгас "Пісараўшчына", в. Капачы, тэл. 6-47-36, запрашае **галоўнага агранома**; дом сядзібнага тыпу.

Саўгас "Забалоцьце", в. Забалоцьце, тэл. 5-16-67, запрашае **галоўнага бухгальтара, галоўнага заатэхніка**; 2 дамы сядзібнага тыпу.

БЕРАСЬЦЕЙСКАЯ ВОБЛАСЬЦЬ
ДРАГІЧЫНСКІ РАЁН

Калгас імя Чкалава, в. Галоўчыцы, запрашае **брыгадзіра, галоўнага інжынэра, інжынэра-энэргетыка, загадчыка фэрмы, мэханізатараў, слесараў, кіроўцаў, даярак, электрыкаў, намесьніка старшыні будаўнічых і камунальных справаў**; двухкватэрныя катэджы з выгодамі.

КОБРЫНЬСКІ РАЁН

Калгас "Глінянскі", в. Глінянкі, тэл. 2-54-32, запрашае **заатэхніка** (досьвед працы од 3 гадоў), **вэтфэльчара, вэтлекара**; дом без выгодаў.

Дапаможная гаспадарка, в. Засімы, тэл. 5-53-39, запрашае **даярку, мэханізатара**; дом без выгодаў.

КАМЯНЕЦКІ РАЁН

Калгас імя Дзімітрава, в. Дзьмітровічы, тэл. 59-1-32, запрашае **галоўнага энэргетыка**; аднапакаёвая кватэра.

НОВЫЯ КНІП, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Джон Бэрдшоў. Эканоміка. Ч.1: Уводзіны. Мікраэканоміка / Пер. з анг. А.Кудраўцава; Пад рэд. У.Кулажанкі. — Менск: Тэхналёгія — Беларускі Фонд Сораса, 1996. — 560 с. 1800 ас. ISBN 985-6022-14-2

Салтук А. Трывога лёсу: Вершы. — Менск: Мастацкая літаратура, 1996. — 126 с. 800 ас. ISBN 985-02-0295-5

Шамякін І. Глыбокая плынь: Раман: Для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту / Прадм. А.Марціновіча. — Менск: Мастацкая літаратура, 1990. — 286 с. 7000 ас. ISBN 985-02-0330-7

Эканамічная гісторыя Беларусі. Вучэбны дапаможнік: / Выд. 2-е, дапоўненае і перапрацаванае / В.Галубовіч, Р.Ермашкевіч, Г.Бушчык і інш.; Пад агульнай рэдакцыяй В.Галубовіча. — Менск: НКФ "Экапэрспэктыва", 1996. — 432 с. 6000 ас. ISBN 985-6102-16-2

Juraj Kasič. Karaleva zima: Vieršy, advolny pieraklad, malunki. — Віцебск, 1996. 100 ас.

Ці скончана вайна?

Бацькаўшчына: Зборнік гістарычнай літітаратуры / Укладальнік С.Панізьнік. — Менск: Юнацтва, 1996.

Раней гэты зборнік залічылі б у разьдзел ваенна-патрыятычнага выхаваньня моладзі. Цяпер, калі ня толькі начальства, але і ладная частка грамады ня ведае, дзе Радзіма, кніга набывае няпэўны статус — яе жанр можна вызначыць як антыўрадавы памфлет.

Гэта зборнік мастацкіх і навукова-папулярных твораў пра ваенныя падзеі і асобы ваяроў. Да 1994 году, калі кніга была ўкладзена, як высьвятляецца, беларуская навука і літаратура назапасілі цудоўныя творы пра вайсковую славу беларусаў.

Укладальніку зборніка Сяргею Панізьніку было з чаго выбіраць — і з прызнанай клясыкі, і з сучасных эсэ — і ён зрабіў сваю працу зь вялікім густам. У першы разьдзел уключаны, натуральна, народныя вайсковыя песьні. Адразу ўзьнікае пытаньне — а ці народныя? Праблема ў тым, каго разумець пад народам. У былыя часы народнай песьняй XVII ст. лічыўся твор "Із-за Слуцка, із-за Клецка едзе служба маладзецка..." У цяперашнім зборніку мы яе ня знойдзем, што слушна, бо яшчэ ў XIX ст. даказана, што гэта штучны твор. Нечым падобным павявае і ад зьмешчаных песень — словы "здрада ў сэнаце" і "калгасныя палі" ну ніяк не кладуцца ў радкі сапраўднай народнай песьні.

Аддаўшы даніну народнай творчасьці, укладальнік пераходзіць да прафэсійных творцаў. Вялікую справу зрабіў Вячаслаў Чамярыцкі, які пераклаў для шырокага чытаньня старажытнабеларускі "Летапіс вялікіх князёў літоўскіх". Аматарам беларускай даўніны добра вядомыя тамы "Поўнага збору рускіх летапісаў" — кнігі рэдкія і вельмі нязручныя з-за свайго агромністага фармату. Пакуль не перавыдадзена нешта больш зручнае, трэба нашыя летапісы друкаваць як дзе можна. Чамярыцкі пераклаў "Летапіс..." на сучасную беларускую мову, што значна аблегчыла яго ўспрыманьне маладым чытачом, а вось шматлікія квадратныя дужкі можна было б усе выкінуць — з той жа мэтай. Варта было б выправіць і памылкі старажытных перапісчыкаў: адразу трапляе на вока, што Гедымін перадаў сыну не Карачаў недзе ў глыбіні Расеі, а Кернаў у Літве (так у больш дакладных сьпісах летапісу).

Разьдзелу зборніка "Постаці" больш пасаваў бы загаловак "Постаці і бітвы". З даўнейшых часоў вядома, што ў паспалітага чалавека заўсёды павінен быць у галаве набор гістарычных падзеяў і асобаў, якімі трэба ганарыцца. Укладальнік зборніка прапануе такі варыянт: Даўмонт, Вячка, Кейстут, Юры Нясьвіскі, бітвы — Клецкая, Грунвальдзкая, Аршанская. Відавочна, гэты сьпіс укладальнік мог працягнуць, але ж месца ў кнізе малавата. Увогуле было б цікава вызначыць галоўныя бітвы беларусаў з войскамі іншых народаў: з расейцамі — Ворша 1514, з крымскімі татарамі — Клецак 1506, зь немцамі — Грунвальд 1410, з туркамі — Вена 1683, са швэдамі — Кірхгольм 1605, з украінцамі — Лоеў 1649, з манголамі — Магільна 1284 (?). Можна падабраць войны і бітвы, дзе гэтыя ворагі былі ўжо саюзнікамі ў барацьбе зь іншымі. Сьпіс будзе досыць шырокі, каб кожная ўлада выбрала для сьвяткаваньня ёй сымпатычны юбілей. Гісторыя яшчэ ня ўсіх бітваў распрацаваная нашымі гісторыкамі і літаратарамі, але матэрыял на наступныя выпускі "Бацькаўшчыны" ўжо ёсьць.

З агульнага накірунку зборніка неяк выбіваюцца асобныя матэрыялы пра клясавую барацьбу. Апавяданьне Цёткі "Прысяга над крывавымі разорамі" заняло пачэснае месца ў літаратуры, але чаму яно тут? Таму, што ў ім згадваецца салдат? А аповед пра сталінскія рэпрэсіі — таму, што там таксама стралялі? Аповесьць Вацлава Ластоўскага "Лябірынты" — можа, зь першых у Беларусі твораў у жанры science fiction і fantasy (надрукаваная ў 1923 годзе), але там нават і не страляюць. Сьмерць у гэтым творы прысутнічае ў прывабнай цукерачнай абалонцы і заўважная толькі сучаснаму чытачу:

— Гляньце на гэтую салю, — сказаў Іван Іванавіч, — вы тут ня ўбачыце нідзе ніякіх прылад асьвятленьня, а ў салі сьветла і цёпла. Гэта таму, што сьцены гэтай салі пакрытыя элемэнтам, падобным да радыя, зь якога пабудавана сонца. Пад гэтым сьвятлом і расьліны і людзі могуць жыць бяз ушчэрбку для свайго здароўя. Гэты элемэнт тут ужыты як маса да тынкаваньня сьценаў, акром сьвятла і цяпла мае яшчэ другія дзействы: хто знаходзіцца заўсёды пад уплывам яго сьвятла, не падлягае старажытнасьці, якая паходзіць ад звапненьня кроваточных начыньняў у людзкім арганізьме.

У ілюстрацыях укладальнік зборніка схаваў для чытачоў пару загадак. Нічога, падлеткі разьбяруцца, дзе ў сапраўднасьці вялікі князь Аляксандар Казіміравіч, а дзе Жыгімонт Ваза. Горай зь Юркам Станкевічам і Сяргеем Шупам. Відаць, рэдактар, які рабіў подпіс пад фота, за Юрку ўважыў маладога хлопца, а сталаму чалавеку ў акулярах дасталося больш салідная імя Сяргей. Кнігу загортваеш з задавальненьнем, і хочацца разгарнуць яе зноў, толькі раптам заўважаеш на першай старонцы галубоў. Адкуль такая ідылія, калі на старонках кнігі ліюцца рэкі крыві? Галубы — дрэнная замена "Пагоні".

Валеры Пазьнякоў

Кніга — поштай

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёьць кнігі:

1. Адам Глёбус. Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы. – Менск: Сучасная літаратура, 1995. – 310 с. 49.000 БРБ
2. Адам Глёбус. Скрыжаваньне. – Менск: БАДПІР – "Ковчег", 1993. – 46 с. 7.000 БРБ
3. Юліяна Вітан-Дубейкаўская. Мае ўспаміны. – Вільня, 1994. – 192 с. 29.000 БРБ
4. Баляслаў Лесьмян. Пан Блішчыжскі / Пераклад з польскай. – Вільня-Менск: "Наша Ніва" – "Мастацкая Літаратура", 1994. – 93 с. 17.000 БРБ
5. Вітаўт Кіпель. Беларусы ў ЗША. – Менск, 1993. – 352 с. 29.000 БРБ
6. Брэтон Ф., Пру С. Выбух камунікацыі. – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 336 с. 24.000 БРБ
7. Говард Майкал. Сучасная культурная антрапалёгія. – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1996. – 486 с. 35.000 БРБ
8. Лоўэ Дж. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі. – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 328 с. 24.000 БРБ
9. Энтані Сьміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі. – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1995. – 272 с. 20.000 БРБ
10. Джын Эйчысан. Гаваркія істоты: Уводзіны ў псыхалінгвістыку. – Менск: БФС – "Кліч", 1995. – 312 с. 20.000 БРБ
11. Браян М. Фэйган. Уводзіны ў археалёгію. – Менск: БФС, 1996. – 272 с. 24.000 БРБ
12. Беларускі рок-н-рол: Тэксты ("Бонда", "Крама", "Мроя", "Новае Неба", "Уліс"). – Менск: "Ковчег", 1994. – 64 с. 7.000 БРБ
13. Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст. Камплект каляровых паштовак (12 асобнікаў). – Менск: НВФ "Vaukalaka", 1996. 25.000 БРБ
14. Беларускі гістарычны агляд. 1996, т. 3, сшытак 1. 35.000 БРБ
15. Ш.Дэбаш, Ж.-М.Пант'е. Уводзіны ў палітыку. – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1996. – 624 с. 40 000 БРБ
16. М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1765-1794). – Менск, 1994. – 168 с., каляровыя іл. 20 000 БРБ
17. Z.Fedecki. Цёплыя вечары... ды халодныя ранкі, czyli co śpiewano w Feliksowie. – Warszawa, 1992. – 160 с. 20 000 БРБ
18. Юрг Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі. — Менск: БФС — "Лекцыя", 1996. — 343 с. 45.000 БРБ.
19. Джон Бэрдшоў. Эканоміка. Ч. 1: Мікраэканоміка / Дапаможнік для студэнтаў. — Менск: БФС — "Тэхналёгія", 1996. — 560 с. 50.000 БРБ.
20. Ўэстан Ла Бар. Асабістасьць з псыхааналітычнага пункту гледжаньня. — Менск: "Тэхналёгія", 1995. — 47 с. 15.000 БРБ.

Зьвяртайцеся на адрас: Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89. У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.



Кнігі для дзяцей

Выданьні Беларускага Гуманітарнага Адукацыйна-Культурнага Цэнтру

1. **Гарасьвё Кірога. Казкі трапічнага лесу.** – Менск, 1993. 20.000 БРБ
2. **Марві Яла. Дзівосная ноч. Казачная аповесьць.** – Менск, 1994. 20.000 БРБ
3. **Шарль Пэро. Чарадзейныя казкі.** – Менск, 1993. 25.000 БРБ
4. **Графіня дэ Сэгюр. Зачараваная хатка. Казкі.** – Менск, 1992. 25.000 БРБ
5. **Лагодны цмок. Ангельскія літаратурныя казкі.** – Менск, 1993. 20.000 БРБ
6. **Мэры Сьцюарт. Людвік і зорны конь: Казачная аповесьць.** – Менск, 1996. 40.000 БРБ

Зьвяртайцеся на адрас:
Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89.
Менчукам зручней зьвярнуцца праз тэл. **239-78-49** (Андрэй).

Ўэстан Ла Бар

АСАБІСТАСЬЦЬ з псіхааналітычнага пункту гледжаньня

Ўэстан Ла Бар. Асабістасьць з псыхааналітычнага пункту гледжаньня. — Менск: "Тэхналёгія", 1995. — 47 с.
Аналізуючы Асабістасьць, кніга ўтварае "нейкі сацыяльны клімат разважаньняў". Адначасова спроба пэўнай схематызацыі выкладу робіць кніжку прыдатнай для навучаньня.

НОВЫ БЕЛАРУСКІ КНІЖНЫ ПРАЕКТ

Беларускі Гуманітарны Фонд "Наша Ніва" наладзіў распаўсюджаньне найноўшых беларускіх выданьняў у галіне гуманістыкі, а таксама мастацкае літаратуры. Наша мэта — зрабіць новую беларускую кнігу жывым фактарам сучаснае культуры.

Сыстэма "Новага беларускага кніжнага праекту" дзейнічае ў гарадах:

БЕРАСЬЦЕ

Кнігі Браяна М. Фэйгана "Ўводзіны ў археалёгію", Энтані Сьміта "Нацыяналізм у XX ст.", Ш.Дэбаша й Ж.-М.Пант'е "Ўводзіны ў палітыку" можна набыць у кнігарнях "СЬВІТАНАК" (бульвар Касманаўтаў, 120) і "АСЬВЕТА" (вул. Маскоўская, 57). У "Сьвітанку" таксама прадаецца камплект каляровых паштовак "Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст."

ГОМЕЛЬ

У памяшканьні Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі (пл. Перамогі, 2) пры Аддзеле інфармацыйных тэхналёгіяў (тэл. 55-71-97) адкрыты кніжны аддзел. Гэта адзіная кропка ў 500-тысячным горадзе, дзе можна набыць такі асартымэнт сучасных беларускіх кніг — мастацкую літаратуру, дасьледаваньні ў галіне гуманістыкі, найноўшыя пераклады. Апроч кніжак тут таксама можна прыдбаць самыя апошнія запісы беларускае музыкі.

ГОРАДНЯ

Продаж кніжнай прадукцыі адбываецца ў шапіку "ВАСІЛЁК" (насупраць Універсытэту).

МАЛАДЗЕЧНА

Кнігі можна набыць у шапіку ТБМ (на чыгуначным вакзале). Па даведкі можна зьвяртацца праз тэл. 6-71-70 да Алеся.

МЕНСК

Кніга Браяна М. Фэйгана "Ўводзіны ў археалёгію" прадаецца ў кнігарнях "Сьветач", "Акадэмкніга", "Кнігарня пісьменьніка", "Паліткніга". Кнігі Алама Глёбуса "Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы" й "Дамавікамэрон" прадаюцца ў крамах "Сьветач" і "Кнігарня пісьменьніка", у шапіку ў фае Нацыянальнай бібліятэкі.

СЬВЕТЛАГОРСК

Кнігі можна набыць у філіі БГАКЦ, Зялёная вул., дом 10, паверх 2. Тэл. (8-02342) 2-71-77.

Касэты — поштай

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт — 25.000 БРБ):

1. **НОВАЕ НЕБА.** Сон у трамваі.
2. **НОВАЕ НЕБА.** Go home (1995).
3. **НОВАЕ НЕБА.** Дзеці чорнага гораду (1991).
4. **КРАМА.** Камэндант (1995).
5. **КРАМА.** Хворы на Rock-n-Roll.
6. **КРАМА.** Гэй там налівай! (1994).
7. **N.R.M.** LaLaLaLa (1995).
8. **ULIS.** Life (1996).
9. **УЛІС.** Чужаніца (1991).
10. **УЛІС.** Краіна доўгай белай хмары (1990).
11. **БОНДА.** Найлепшыя песьні.
12. **МЯСЦОВЫ ЧАС.** Наша ўскраіна (1991).
13. **ПАЛАЦ.** Палац (1996).
14. **Песьні беларускіх бардаў** (1992).
15. **РЭНЭСАНС** (беларускі джаз).
16. **БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ.**
17. **БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА** (1-3)
18. **БЕЛАРУСКАЯ ГІТАРНАЯ МУЗЫКА.**
19. **ЗАЛАТЫ ФОНД БЕЛАРУСКАГА РОК-Н-РОЛУ** (1-3).

Т.1: Бонда. Уліс. Мроя. Рэй. Мясцовы Час. Блізьняты.
Т.2: Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае Неба. Мясцовы Час. Тутэйшыя хлопцы.
Т.3: Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & "Доктор Моро". Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо.
Т.4: Палац. Уліс. Крама. Новае Неба. Мроя. т.5: Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Red Dynamite. Флэт.

20. **МРОЯ.** Найлепшыя песьні з праграмаў 1987-90 г.
21. **УЛІС.** Бпуканьне (1996).
22. **ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ.** Смутны беларускі блюз (1996).
23. **КАМЭЛОТ.** У краіне талераў (1995).
24. **ZINDAN** (1994).
25. **КРАМА.** The Best (1996).

Зьвяртайцеся на адрас: 220094 Менск, а/с 89, Андрыеўскаму Андрэю Паўлавічу. У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.

Рарытэт

Паведамленьне для аматараў «Нашай Нівы»

У рэдакцыі «НН» ёсьць рарытэтныя нумары «Нашай Нівы» з моманту аднаўленьня газэты ў Вільні: *№№ 1-4 за 1991, №№ 5-9 за 1992, №№ 13-18 за 1993, №№ 1-2, 6-9, 12 за 1994, №№ 2 і 7-8 за 1995 г.*

Зьвяртайцеся на адрас:
Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч,
Менск 220094, а/с 89.

Паведамленьне для замоўцаў Літоўскае Мэтрыкі.

У Менск завезены шосты й восьмы тамы Мэтрыкі. Просьба да тых, хто не накідаў пры замове нумароў сваіх тэлефонаў, зьвярнуцца да Андрэя Андрыеўскага праз тэлефон **239-78-49.**

Міхась Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1765-1794) / Каляровыя ілюстрацыі А.Прыбылоў. Графічныя ілюстрацыі М.Лазоўскі. – Менск: Выдавец Зьміцер Салюшкін, 1994.

Кніга прысьвечана 200-м угодкам паўстаньня Касьцюшкі. Зьмешчаны каляровыя ілюстрацыі абмундзіраваньня войска ВКЛ, графічныя рэканструкцыі зброі. Распачынаецца кніга з грунтоўнага нарысу пра вайсковую гісторыю Вялікага Княства другой паловы XVIII ст.
Кніга рэцэнзавалася ў «Нашай Ніве» (№ 7, 1994).

ПАНЯДЗЕЛАК, 16

БТ
15.00 Навіны.
15.10 "Фліпэр".
15.35 ТБ — школе.
16.00 Студыя "Вакно".
16.35 У палоне часу.
17.05 На добры лад.
17.20 "Крок".
17.50 Музычны антракт.
18.00 Фінансавы час.
18.25 Эканамікст.
18.35 MTV.
18.50 Навіны.
19.00 Рэфэрэндум: шчырая размова.
19.50 Беларускі дом.
20.25 Актуальнае інтэрвію.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.45 Спартовы тэлекур'ер.
22.05 Фільматэка.
"Дзяўчына бяз адрасу".
23.30 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. "Лякаматыў-96" (Віцебск) — МПКЦ (Мазыр). Т. 2.
0.20 Навіны.

ОРТ
14.00 Навіны.
14.20 "Горад сабак". Мультсэрыял.
14.45 Маратон-15.
15.00 Зорны час.
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 Джэм.
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.20 "Новая ахвяра".
18.10 Час пік.
18.35 "Адгадай мэлёдыю".
19.00 Прэс-клюб.
19.45 "Дабранач, дзеці!".
20.00 Час.
20.40 "Багз — электронныя жучкі". "Забойства на вясельлі".
21.45 "Да і пасьля..."
22.30 Кубак сьвету "Майстар-ралі-96".
22.45 Навіны.
22.55 "Лінія кіно". "Журботная бяздушнасьць".

КАНАЛ "РАСЕЯ"
16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
16.20 Блёк-нот.
16.35 "Чэленджэрс".
17.05 Залежыць ад цябе.
17.20 Тэлечасопіс "О.Т".
17.30 L-клюб.
18.15 Момант ісьціны.
19.30 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 Хакей. Дзеньнік Кубку сьвету.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 "На вастрыні нажа". М/ф.
22.00 Тэлескоп.
22.30 Прахалодны сьвет.
23.20 Тавары — поштай.
23.30 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.40 "Ня сьпі і глядзі".

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ
13.00 Тэрмін адказу — сёньня.
13.30 Парады садоўнікам.
13.40, 20.35 Тэлеслужба бясьпекі.
13.55, 16.00, 18.55, 22.10, 23.05 Інфарм ТБ.
14.10 "Першае каханьне".
14.55 "Жыцьцё Кліма Самгіна". С. 9.
16.10 Міжнародны агляд.
16.35 "Філязофія паводле Філа".
17.00 Стыль жыцьця.
17.05 "Солці".
17.35 Показвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 "Першае каханьне".
20.10 II Міжнародны тэатральны фэстываль імя А.П.Чэхава.
20.55 Спартовы агляд.
21.05 "Жыцьцё Кліма Самгіна". С. 9.
22.20 "Гістарычныя досьледы".

IV КАНАЛ, НТВ
6.00 Анонс.
6.10 Сэрыял для жаўранкаў. "Мафія-1".
6.50 М/ф "Замкнёнае кола".
8.25 "Чалавек у масць".
9.00, 13.00 Сёньня.
9.20 Д/ф "Узгадаем тыя гады. 1971".
10.15 Найлепшыя цыркі сьвету. "Металёвы блазан".
11.15 М/ф "Логава белага чарвяка".
12.50 Расейскі альбом. Гурт "Аліса".
13.20 "Доктар Вугал".
13.30 Вынікі.
14.55 Астралёгія каханьня. Сяргей Курохін.
15.30 Лекцыі Фэміды.
16.00 Музычныя навіны.
16.10 "Брадвэй" нашага юнацтва". Д/ф.
16.40 Навіны.
17.00 Д/ф "Дзікая прырода. Барацьба за жыцьцё".
17.30 Футбольны клюб.
18.00, 21.00, 23.00 Сёньня.
18.35 Герой дня.
19.00 "Прашу не турбаваць". М/ф.
20.40 Расейскі альбом. Гурт "Сьвінцовы туман".
21.35 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Анасіс".
22.30 Часінка.
23.20 Сусьветная шахматная Алімпіяда.
23.25 Тэніс апоўначы.

АЎТОРАК, 17

БТ
7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 Абібок.
8.45 Актуальнае інтэрвію.
9.00 ТБ — школе.
9.25 "Дзяжурная аптэка".
10.25 Тураб'ектыў.
15.00 Навіны.
15.15 "Фліпэр".
15.40 Мультфільмы.
16.05 ТБ — школе.
16.25 Усё пра ўсё.
16.50 Чарнобыль: праблемы і рашэньні.
17.20 Заняткі Н.Наважылавай.
17.50 Музычны антракт.
18.00 "За чорным собалем". Д/ф.
18.15 Будзьце здаровыя.
18.25 Эканамікст.
18.35 MTV.
18.50 Навіны.
19.00 Рэфэрэндум: шчырая размова.
19.35 "Дзяжурная аптэка".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Хроніка жнівa-96.
22.15 М/ф "Па галоўнай вуліцы з аркестрам".
23.45 Тэлевізійны АРТ-клюб.
0.25 Навіны.

ОРТ
11.00 Навіны.
11.10 "Мы і рынак".
11.55 "Рэкет". С. 1.
12.55 "Мікалай Рыбнікаў. Каб памяталі..."
13.35 "Цмок". Мультфільм.
14.00 Навіны.
14.20 "Горад сабак".
14.45 Квар'етэ "Вясёлая кампанія".
14.55 Мультытролія.
15.10 Чароўны сьвет, альбо Сінэма.
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 ... Да 16 і старэйшым.
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.20 "Новая ахвяра".
18.10 Час пік.
18.35 "Адгадай мэлёдыю".
Сёньня ўлада кіраўніка беларускай дзяржавы адзначана небывалай колькасьцю розных праектаў, гэтак грандыёзных, як і бессэнсоўных. Здоецца, што сёньня прэзыдэнт імкнецца выканаць тое, што ўсімі прызналася невыканальным і ставілася пад сумнеў. Сувязі з грамадзкасьцю пачынаюцца тут з прыцягальнай ідэі "еднасьці перад бядой" – ідэалягічнай пляцформай "маленькага чалавека" і практычным вырашэньнем праблемаў "вялікай краіны эпохі вялікіх пачынаньняў". Абсалютны давер большасьці грамадзян да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі толькі умацоўвае сувязі кіраўніка і народу. Усе як адзін на полі, усе як адзін у дзяржаве, усе як адзін у садружнасьці. Мы ня можам адмовіць прэзыдэнту ў поўнай асэнсаванасьці сваіх дзеяньняў. Гледзячы на апошнія падзеі ў Беларусі, прыходзіш да высновы, што правінцыя валодае больш цэльным сьветапоглядам, чым адукаваная сталічная інтэлігенцыя. І невыпадкова, што сёньняшняя выканаўчая ўлада бачыць сваю апору ў людзях найменш інфармаваных. Вось чаму насуперак, здавалася б, здароваму сэнсу менавіта ім надаецца сёньня столькі ўвагі. Іх публічна віншуюць, публічна даюць узнагароды, публічна караюць. Абсалютная адкрытасьць, жывы дыялёг з Васем, Пецем і Зінай – папулярныя прыёмы сыстэмы "public relations", якія выкарыстоўваюцца сёньня бадай кожным палітыкам у сьвеце. Але палітыка поўнай і адкрытай інфармаванасьці грамадзтва ні ў воднай дэмакратычнай краіне сьвету ня мусіць быць ілюзіяй, бо тое, што сродкі масавай інфармацыі дэмакратычных сыстэмаў забясьпечваюць збалянсаваныя адносіны да розных палітычных партыяў і ідэалёгіяў, ёсьць вынікам рынкавай эканомікі: і ў такіх краінах сувязь з грамадзкасьцю праз сродкі масавай інфармацыі абумоўлена, па-першае, патрэбай у звароце да аўдыторыі з разнастайным палітычным спэктрам, па-другое, унутранымі прафэсійнымі нормамі, а не ўрадовымі пастановамі. Беларускаму кіраўніку нельга спадзявацца на тое, што прыйсьці да ўзаемапаразуменьня паміж ім, заканатворчымі структурамі і грамадзтвам можна праз публікацыю ў СМІ нечытэльных і супярэчлівых загадаў і ўказаў. А ён гэта ведае.

Праблему ўлады і спосабаў яе ўтрыманьня падрабязна вывучаў вядомы сацыяёлаг Макс Вэбэр. Ён вызначыў тры асноўныя прыёмы, якія скарыстоўваюць уладары недэмакратычных сыстэмаў.

Першы – падбор апарату кіраваньня з шараговых памагатых. Перавага аддаецца ня тым, хто валодае ведамі і вострым розумам, а выканаўцам, якія не дазваляюць сабе лішніх думак.

Другі – бесьперапыннае пацьверджаньне выбітных якасьцяў кіраўніка дзяржавы. Кожнае слова, кожнае дзеяньне падданага павінна падкрэсьліваць, што кіраўнік ягоны заўжды мае праўду. І горо таму, хто дасьць зразумець, што кіраўнік у чымсь памыліўся. У Старажытным Кітаі патрабаваньне поўнай згоды з усім, што рабіў кітайскі імпэратар, значыла, што ўсе павінны сьмяяцца, калі сьмяецца ён, а калі ён сумаваў, усе сумавалі за ім і г. д.

У Інданэзіі, калі кіраўнік купаўся, усе, хто апынаўся паблізу, павінны былі залезьці ў ваду і пляскацца – прыдворныя, міністры, старыя і маладыя, бедныя і багатыя. Бо ўсё, што б ні рабіў кіраўнік, было слушна, і, адпаведна, усе мусілі рабіць тое самае. У Індыі за Вялікіх Маголаў нават склалі прымоўку: "Калі імпэратар кажа апоўдні, што зараз ноч, ты павінен казаць: "Глядзі, які месяц і зоркі!".

Чым больш аўтарытарны характар мае рэжым, тым больш нецярплівы кіраўнік да ўсякае думкі, што не супадае зь яго ўласнай. Геродот расповядае, што, калі цар Мідыі склікаў дарадцаў, і яны сьмела выказвалі свае думкі, якія супярэчылі перакананьням цара, той без сумневу загадваў укрыжаваць іх. Так звычайна рабілі ўсе дыктатары.

Арэол бязгрэшнасьці, які атачае кіраўніка, патрабуе, каб зь яго асобай асацыяваліся толькі перамогі. Усе памылкі і няўдачы павінны забывацца. Узьнікае так званая ўстаноўка на посьпех. У працэсе раскруткі палітычнага лідара гэта прынцыповы момант. У сыстэме "public relations" ёсьць адно з правілаў пры прасоўваньні палітычнага кандыдата – прэс-рэлізы (сьціслая інфармацыя для СМІ, падрыхтаваная зацікаўленым бокам) апошняга этапу перадвыбарнай кампаніі павінны казаць толькі пра перамогу кандыдата і нагадваць пра пляны і абяцаньні зь ягонага боку.

Трэці прыём, які называе М.Вэбэр – гэта пэрыядычнае адпучэньне пэўнае колькасьці сваіх жа паплечнікоў. Такія "адпучэньні" нараджаюць у іх рэўнасьць да свайго кіраўніка, імкненьне не нагнаць ня сябе ягонага гневу й нямілосьці.

У свой час Платон, згадваючы пра гэты прыём утрыманьня ўлады, пісаў, што такіх людзей тыран "зьнішчае на падставе, што яны прадаліся ворагу". Няма нічога новага ў гэтым сьвеце.

Шмат было ў сьвеце кіраўнікоў, кола сапраўдных інтарэсаў якіх было вельмі далёкім ад іх звыклае дзейнасьці. Рымскі імпэратар Камод больш чым ва ўладзе знаходзіў радасьці на глядыятарской арэне. Іншы рымскі імпэратар любіў граць у косьці, нават напісаў кнігу пра гэта. Цэзар шмат гадоў вывучаў мастацтва касмэтыкі. Людовік XVI быў каралём толькі паводле нараджэньня, але сьлесаром ад бога. Людовік XV выточваў табакеркі. Часам такія хобі былі выкліканыя глыбокай самотай, неадольным сумам. Якраз праз гэты сум адны ўладары сьпіваліся, іншыя, як расейскі імпэратар Павел, не прапускалі ніводнага пажару. Рымскі імпэратар Даміцыян на працягу некалькіх гадоў штодня зачыняўся у пакоях адзін, цалкам аддаючыся засяроджанай поўлі мух, якіх ён насаджваў на даўгі сталёвы стрыжань. Бадай, менавіта такі сум разам зь неадступным страхам нараджала ў шматлікіх кіраўнікоў жаданьне сысьці ад самі́х сябе, хаця б на час адчуць сябе кімсьці іншым. Відавочна, гэтым жа помкненьнем хоць крыху "пагуляцца ў іншага" тлумачацца і некаторыя дзіўныя ўчынкі Мікалая II, якія ставілі ў тупік ягоных набліжаных. Вялікі вэрхал адбыўся сярод іх, калі неяк, не сказаўшы нікому ні слова, цар пераапрануўся жаўнерам, началіў паходны ранец, узяў стрэльбу і накіраваўся куды вочы глядзяць. Так, ідучы пыльным, спаленым сонцам трактам, ён прайшоў ажно дзесяць вёрстаў, да таго, як перапалоханай ахове ўдалося яго спыніць. Дзякуй Богу, цяпер ёсьць "мэрсэдэсы", але няма нічога новага ў гэтым сьвеце...

А. Лапцёнак

ТАЦЬЦЯНА НЯДЗЬВЕЦКАЯ

***

Вінны келіх. Горкая сьляза.
Сонца ў твар і пустата пад бокам.
Бусел не садзіцца на наш дах,
зь дзікім крыкам носяцца вароны.
Зарасло травою асакой
Цуда — возера лясное наша,
дзе ў ночку зорны карагод
нас з табой злучыў у адно, няйначай.
Усьміхаўся месяц. Пах сасны...
Дыван з кветак. Срэбныя усплёскі...
Вусны цёплыя шукаюць... Абдымі...
Хмельны поцяг, твае рукі. Божа...
Што цяпер? Пра гэта лепш маўчы.
Брудны горад. Дождж. Надвор'е адзіноты.
Азірнуўся. Кіну ўсё. Бяжы! Позна...
Шлях далей ідзе. Турботы...
21.07.96

***

Без асалоды п'ю заморскае віно,
Бо яно — не тваё, бо кіслае яно.

***

Зоры і хмары,
дакладней, туман
лёг на дарогу маю.
Разграбу, прабягу, набраўшы
паветра ў рот.
Змагла! У стомленым шчасьці
прысяду на камень прыдарожны.
Шчасьце — надыхацца подыхам лугоў,
ты яго ўжо ведаеш загадзя,
ён — зь дзяцінства.
10.07.96

ВІКТАР ЖЫБУЛЬ

СУСТРЭЧА З ШАФЁРАМ

Ехала ўздоўж магазінаў,
выпускаючы дым,
інвалідная машына
з кіраваньнем зубным.
Вось машына дык машына
з кіраваньнем зубным!
У той момант з магазіна
выйшаў грузчык Яўхім.
Тут прытармазілі шыны,
і падумаў Яўхім:
"Хто ж шафёр у той машыны
з кіраваньнем зубным?"
Расчыніліся тут дзьверы.
З жахам грузчык глядзіць:
там шкілет гнілы ды шэры,
крываногі сядзіць.
Кажа труп:
— Заўжды зубамі
я кручу круг руля,
бо калі вазьму рукамі,
то рассыплюся я!..
Тут Яўхім пусьціўся бегчы,
зачапіўся, упаў.
Шкілет крыкнуў: "Да сустрэчы!",
касткамі памахаў.
Вось і замігцелі шыны,
і, пускаючы дым,
пакацілася машына
з кіраваньнем зубным.
1992 г.

Н.КАПА

***

Вясковы двор. Сялянскія збудовы:
Калодзеж, хату, два хлявы і дровы,
Пакладзеныя ў доўгі рад, нібыта словы
Благога верша з сэнсам адмысловым,
Пакрыў, які ўжо раз, прынёс зямлі навіны,
Аздобіўшы вакольныя пуцяны
Нібыта пух ад зграі лебядзінай.
Прыгожы белы сьнег, прыгожы і нявінны.
Сьнег выпаў гэты год ня позна і ня рана.
Усё навокал бы анёламі прыбрана
На баль таемны для гасьцей абраных,
Як кнігай вечнай калісь абяцана.
Так. Вернуты спакой зямлі. Ад сьцюжы
Яна закрыта. Ямы, рытвіны і лужыны
залечаны. Якім жа дужым
Ты аказаўся б, белы сьнег, каб ацаліў і
душы.

М.МАЛІНОЎСКІ

(Пераклад верша Паўла Васільева "Крыўда")

Я — спачатку — да сяброўкі прыйшоў
І сказаў ёй:
"Усё як мае быць,
Я кахаю толькі адну цябе,
Астатняе ўсё — лухта".
Адказала сяброўка:
"Не,
Я кахаю адразу двух, і трох,
І цябе магу пакахаць,
Калі хочаш чацьвертым быць".
Я адказаў тады:
"Добра,
Я дарую табе ўсіх трох,
І яшчэ пятнаццаць дарую,
Калі першым мяне ты возьмеш".
Засьмяялася сяброўка:
"Не,
Надта прагныя твае вочы,
Навучыся спачатку, сябра,
Па-сабачы за мной хадзіць".
Я адказаў ёй:
"Добра,
Я згодны сабакам быць,
Але дазволь, сяброўка, тады
Па-сабачы цябе любіць".
Адвярнулася сяброўка:
"Не,
Надта ты пасьпешны, сябра,
Ты спачатку вый на поўню,
Каб было прыемна мне!"
— "Пераборлівіца, — добра!"
Я пайшоў ад яе ў сьлязах,
І кахаў
Дзявок двух, і трох.
А потым пятнаццаць яшчэ.

І прыйшла сяброўка да мяне,
І сказала:
"Усё добра,
Я кахаю аднаго цябе,
Астатнія ж — лухта..."
Сумна зрабілася
Мне тады.
Не, падумаў я, ніколі, —
Каб магла
Ад крыўдных слоў
Па-сабачы завыць душа!

АЛЯКСАНДАР ХАМІТАЎ

***

Вопраткі старай сырыя лахмоцьці
Выпалі зь ліфту, як глыбы кавалак,
І пахіснуўся ў соннай маркоце
Хлопец, жуючы каробку запалак.
Вы не падумайце, ён не шалёны,
Не звар'яцелы, не звар'яцеў.
Проста, здаецца, тыдзень ўжо цэлы
Хлопец амаль што нічога ня еў.
Цэлых паўтода бацьку ня плоцяць,
Дома няма ні яды, ні піцьця!
Людзі, глядзіце, стаіць перад вамі —
Новай улады дзіця!
10.10.95.

МАРА (З ГУМАРАМ)

Нехта жадае новы дом,
Нехта новы бот,
Нехта дужым мусіць стаць,
Я ж жадаю — гранатамёт.
Я б пастроіў іх ля сьценкі,
Усіх тых, хто нас давёў
Да маркоты, да бядноты,
Да бярозавых грабоў.
Я б не пытаў у іх дарэмна,
Дзе, што і як, нашто, калі?
Я стрэльнуў бы з гранатамёту —
Крыві б ручаі пацяклі.
Я стрэльнуў бы, і не заплакаў,
Хоць я і добры чалавек,
Хай гінуць тыя камуністы,
Што замарылі ўсім нам век,
Тады ў спакоі існуючы
Можа б і лепей зажылі.
Калі ж адбудзецца ўсё гэта?
А можа будзе? Дык калі?..

ШАРАМЕЦЕВА ГАННА

***

Мая краіна ня райскі сад.
Маёй краінай кіруе кат.
Прымус наўкола і чэсьць далоў.
Вучыся долу трымаць галоў.
Слабыя енчаць. Ня ўзьняць вачэй.
Руды струменьчык паўз брук цячэ.
Бо хто шчыруе на свой народ,
таго прасуе каваны бот.
Адных за краты, другіх у бруд.
Жаўнеры ката пануюць тут.
Жаўнеры топчуць бацькоўскі край,
А ты, мой хлопча, глядзі-зважай.
Жаўнеры крочаць. Жаўнеры спрэс.
За полем, хлопча, дарога ў лес.
Чужыя вочы ў прыцэл глядзяць.
Ты вось што, хлопча: вучысь страляць.

КУЛІК М.І.

НЯШЧАСНАМУ ЧАЛАВЕКУ

Рабом радзіўся ты калісьці
і гімн свабодзе не сьпяваў,
Цураўся матчынай калыскі.
Няшчасны невук, ты прайграў!
Пакінуў дом, пакінуў жонку,
Ня маеш мовы ты сваёй.
Ня маеш роднае старонкі,
Між нас чужы, у зграі свой.
Ўсё роўна праўды не схаваеш,
Бо гонар маем і імя,
Духоўны бомж, а ты што маеш,
Свайго імпэту акрамя.
Падняў руку на вэтэрана,
Што даў жыцьцё табе, вар'ят.
Хто сьцерпіць гэткага тырана,
Што слову боскаму ня рад?
Цябе ўжо дома не чакаюць,
і хоць суда час не настаў,
Анёлы ці наўрад спаткаюць.
Сыдзі з дарогі — ты прайграў!

АЛЯКСЕЙ ШЫДЛОЎСКІ

НА ВОЛЮ!

На волю, народ мой, на волю!
Хадзем на змаганьня дарогу!
Над лютасьцю і над бяздушшам
Здабудзем хутчэй перамогу!
Скінем сталёвыя путы,
Зломім карнікаў краты,
Наперад, народ мой разуты,
Наперад, народ мой расьпяты!
Вымецем з нашай краіны
Нацыі здраднікаў — быдла.
Жыць у дрыгве да калена
Ужо беларусам абрыдла!
Хочаш жыць вольна, заможна,
У дэмакратычнай краіне,
Веру! Народ Беларускі
Зьверскую хунту адрыне!
27.04.96.

З.К.

***

Пагукай мяне, ты згубіўся
Чуеш, як шуміць Горад
Азірніся бачыш у голас
Нечакана ўсклізь зьліўся
Дождж заснуў, забудоў поле
Маляваны контур хлеба
Лес выразаў, вецьце выйсьця
Залінована рэйка ў неба
Наша доля тут, плачаш
Зашукаў цень целам
Наша доля шэпт лісьця
Наша зерне сьвет цэпам
Пагукай мяне, калі хочаш
Зачыняе вокны Лета
У засохлай траве холад
Зачакаўся хмяльной пагодай.

ВІКТАР ЛІЦЬВІН

БЕЛАРУСКІЯ СЛОВЫ

Як з скалкі промні
Пырснуць іскрамі,
Як зарыпіць мыліца
Па сьнезе чыстым.

Так пад густ і сподум,
На вячэру і сьняданьне,
Слоўца знойдзецца годнае,
Беларускае, роднае.

Слоўцы празрыстыя,
Як вада крынічная,
Ад іх сківіцы зводзіць,
Як у скляпеньні зь лёдам.

Як птушак гра на волі,
Вабіць Божае стварэньне,
Не шчаўрэць жа вам ніколі!
Не счарнець у навакольлі!
20.04.96 г.

***

Беларускі травень,
Завіхнуўся вятрыска
Вясеньняй сьвежасьцю,
Пахіснулася лісьце
Задаволенай еднасьцю.
Засыпавалі травіначкі,
Зялёныя галіначкі
Зеленя мілуецца,
Зь небам цалуецца.
Вясеньні настрой
Песьняй прасьпяваеш,
Сіняй цеплынёю,
Блакітнаю журбою.
Сланечніка братоў,
Жаўткі дзьмухаўцоў,
Сонейка промні
Рассыпалі ў полі.
02.05.96 г.

СЯРГЕЙ ПРЫЛУЦКІ

***

О, Белая Русь, краіна дзівосных людзей,
Тадэвуша, Костуся неспакойны подых.
Заўсёды загнаная ў пекла падзей
нарэшце ты адрадзілася ў нясьцерпна цяжкіх
муках.

У бясконцым тваім гушчары,
на зялёных лугавых прасторах
бачна сьвятасьць зялёнае травы,
непарушнасьць і спакой крыштальных
азёраў.

Старажытны чуцен гоман
у суцяшальным шэпце дрэў.
"Ш-ш-жыць!" — лістота стогне
родны зачароўваючы сьпеў.
Бусьліны клёкат, пацьвярджэньне міру,
даносіцца з убогіх вёсак
і зьнікае ў бясконцай вышыні.
Зьнікае клёкат і зьнікаюць шчасьця крылы.
Назамен — глухія ўдары дошак
аб жалобную цішыню зямлі.

***

Цямнее гарызонт астылы
Мігаючы сьвятлом халодным зорных
ліхтароў,
Зьнікаючы за хмарамі, па небасхіле
Плыве ў срэбраным адзеньні ветах зноў і
зноў.
Начныя цуды — колькі прыгажосьці:
Чароўная рачная рабізна.
Бясконцыя нябёсы, у поле йдзеш, бы ў
госьці.
Сама кліча душа далей ад сна.
Духмяны пах паветра чыстага ўначы
Дэзынфэцыруе ад клопатаў зямных,
Прыглушаны на слых прыемны дрэваў шэпт,
І сэрца просіцца: "Яшчэ, яшчэ, яшчэ..."

ПАРТЫЯ ЛЕНІНА

Пасланьнікі пекла зьявіліс раптоўна
У суправаджэньні крывавых забойстваў.
Зьмярцьвелыя душы — наступства тэрору.
Наш абавязак — знайсьці эліксір.

СЯРГЕЙ ПАТАРАНСКІ

ТРЫЗЬНЕНЬНІ ГАМЛЕТА

I
Дзе краіна?
Дзе народ?
Вы — народ?
Вы — шэры скот,
падобны да сьвіней,
што гадзяць, жруць, і сьпяць.
Скажыце, колькі можна спаць?
Скажыце, у вас ёсьць сумленьне
чакаць,
калі рабуе вас
якаясь вош,
якаясь блядзь
нікчэмная
зь яхіднаю ухмылкай.
Скажыце, вы народ?
Вы — быдла, скот.
Краіна мудакоў.
Краіна сьмерці,
дзе дзеці дохнуць ад інфэкцый,
дзе гразь, і для паэтаў месца
няма.

II
Вам добра спаць пад цёплаю пярынай,
і думаеце вы, што сон і дом ваш вечны,
нішто не патурбуе іх.
Самападман!
Няшчасныя, падманутыя людзі —
вас абкрадуць,
і дом ваш спаляць,
а вас прынізяць,
рабамі зробяць,
а хто памысьліць рот адкрыць,
той кулю атрымае ў лоб.
Аднак і пальцам левае нагі
ніхто не пашавеліць.
Дзе танкі, зброя і гарматы?
Дзе гонар ваш. Як саплякі,
лятаеце ў ілюзіях і марах,
калі патрэбны справы. Ён,
хто абвясьціў сябе царом Сусьвету,
на плечы вашы ўстаў,
а заўтра на касьцях
народу ўстане. Ён
ужо ідзе паліць ваш дом.
І сотні, тысячы такіх, як ён,
прыйдуць за ім
і сьмерць вам прынясуць.

III
Ніхто нічога не жадае.
Няшто жадаць.
Навошта раздражняць
уладаў усябачны позірк.
Навошта людзям сэрцы турбаваць.
Лягчэй — калі ніхто нішто ня знае,
акром кармушкі, дзе жратва зь пітвом.
У абыякавасьці сытай пражываюць
яны сваё жыцьцё.
Абкралі іх,
яны рукой махнулі,
абы іх толькі пальцам не чапалі, —
"бо наша хата з краю".
Тут талент, розум непатрэбны.
Яны ствараюць лішнія праблемы.
Лягчэй ня думаць і ня знаць нічога
і як вярблюд на лепшага пляваць.
І гэта ёсьць народ?
Такім яго любіць?
Фантомы, зьверы — а ня людзі.
Насельніцтва няведама якой краіны,
якое ні пра што ня думае,
нават пра сябе.
Любіць. За што?
Найлепшых у сьмецьце ўтопчуць,
і па іх касьцях
вясёлым, заліхвацкім пройдуць маршам.
Нас мярцьвяк.
- нішто.
Што можа ён?
Што?
Нічога.
Акрамя есьці, гадзіць і трахацца.
Дзярмо — а не нацыя.
Як жыць?
Як гэтае балота разварушыць?
А можа і ня трэба,
хай гіне ўсё.
Такі народ — сам заслужыў свой лёс.
IV
Абураны свабодай раб,
заўсёды наракае на таго,
хто даў яе,
як неразумнае дзіця,
якое вартасьць
успрымае за забаву.
Для дурняў — свабода не каштоўнасьць,
яе, як дробную манэту,
яны гатовыя яшчэ
на большую драбніцу разьмяняць.
Пралажныя, нікчэмныя стварэньні,
свабода вам патрэбна?
Ланцугі і плётка —
ваша асалода.
Але не абурайцеся тады,
калі вам пусьцяць кроў,
пятлю накінуць
і труп ваш на зьяданьне гінідам кінуць.
V
Краіна зьнікла.
Расплыліся межы.
Народ прапаў.
Ілюзія — народ.
Пустая даль.
За ёй цяпер нічога:
ні весі, ні двара,
ні гораду, ні луж.
Адзіны вецер
шнарыць, як жабрак,
шукаючы падачкі
ад прахожых.
Што думаць?
І як жыць?
Маўчыць паветра.
І маўчыць прастора.
Дзе маё царства?
Дзе граніц слупы,
карона. Тут адная сьмерць
з чумой — законны.

НАЧНАЯ ПРАГУЛКА

Памяці Авяр'янава

I
Я выйшаў на пустую маставую.
Халодны вецер ахінуў мой твар.
Дамы драмалі. Ліхтары дрыжалі.
І сьнег аранжавы пад ботамі скрыпеў.
Куды я йшоў? Ня ведаю. Быць можа
шукала нечага мая душа.
А сам я не хацеў і не жадаў нічога.
Я проста брыў і нешта ўспамінаў.
2
У гэту ноч памёр мой друг.
Ніхто ня знаў пра тое, нават я.
І ноч, і злая цішыня
ў няведаньні хавала нас абодвух.
Я брыў, і тахт маіх падэшваў
незразумелым напаўняўся неспакоем.
І вуліц незнаёмая пятля
вяла мяне няведама куды.
3
Вось яго дом.
Вачніцы чорных вокнаў
маўчаць, чакаюць —
хто адкрые тайну
і жудасьць неспакойнага жыцьця,
і сьмерць гаспадара сустрэне першы.
Я закуру каля яго пад'езду,
падумаю — зайсьці ці не зайсьці,
Не, не пайду,
навошта турбаваць,
час позьні,
да таго ж да чорта
расколваецца сёньня галава.
Я пабрыду далей і да сябе вярнуся.
4
На раніцу па радыё сказалі,
што больш няма яго на гэным сьвеце.
Я не паверу для пачатку, пастаю
каля вакна, там за вакном рабіну
драсуюць апалелыя вятры.
Пасьля налью сабе і памяну. Сьнег шэры
хай будзе суразмоўцам для мяне.
Са сьнегам застануся я навекі.
Памрэ вясною ён, я буду помніць. Адзін,
зусім адзін застаўся я на гэтым сьвеце.

АНДРЭЙ ХРАПАВІЦКІ

ПАДАРОЖЖА

гэнымі, у далечыні ля мора
днямі, калі йшлі дажджы
мы зьбіралі пэрліны
каб кінуць іх зноў у ваду
мы хадзілі па багемных кварталах
дзе мастакі гандлявалі карцінамі
і граў каліфарнійскі busker
песьню для цябе
мы пілі каву
і кухар Эл заўсёды рады быў нас бачыць
ён вітаўся Hi, buddies!
і прыносіў нам свае лепшыя хот-догі
і ўсьміхаючыся (ён усьміхаўся заўжды)
казаў Just for you!
а па пятніцах
паэт-пясьняр DJ Rhima
чытаў сваю інтэрпрэтацыю Шэксьпіра
на сябрыне
ў твайго кузэна
а CD-player сьпяваў салодкім голасам
Thank God, it's Friday
і мы так доўга лічылі зоры
на амэрыканскім небе
а пазаўтра летакі несьлі нас
на розныя кантынэнты
нашага віртуальнага сьвету

Я выключыў кампутар

тэст

Рыбныя прадукты

Французская асацыяцыя спажыўцоў правяла тэставаньне ўпакаваных рыбапрадуктаў — рыбных палачак у паніроўцы і замарожанага філе траскі. У задачу экспэртаў уваходзіла вызначэньне сьвежасьці і якасьці названых прадуктаў некалькіх гатункаў.

Працэнтнае зьмесьціва рыбы

Рыба заўсёды карысталася справядлівай рэпутацыяй прыемнага дыетычнага прадукту, бо яна мае вялікую колькасьць бялкоў высокай якасьці. Да гэтай катэгорыі належаць і рыбныя палачкі.

Насамрэч некаторыя зь іх маюць столькі ж паніравальных сухароў (іх значна меней раяць у дыетычным харчаваньні), колькі і рыбы.

Напрыклад, працэнтнае зьмесьціва рыбы ў рыбных палачках фірмаў "Les Dauphins" і "ServiFrais" ніжэйшае за 60%, у іншых фірмаў яно не дасягае 70%. Куплю паніроўкі за кошт рыбы наўрадці можна лічыць выгаднай...

Калярыйнасьць

Розьніца паміж прадуктамі вызначаецца колькасьцю тлушчавых рэчываў.

У трох прадуктах "Captain Iglo", "Packfish" і "Peche Ocean" у паніроўцы ёсьць вялікая колькасьць алею. Пасьля смажаньня ў печы ці духоўцы гэтыя палачкі становяцца вельмі тлустымі: палова іхных калёрыяў забясьпечана тлушчам.

Такім чынам, гэтыя прадукты вельмі разбалянсаваныя ў дыетычным пляне. Тэарэтычна яны прызначаныя для дзіцячага харчаваньня, а практычна зусім да яго не падыходзяць. Значна больш карысная сьвежая рыба.

РЫБНЫЯ ПАЛАЧКІ Ў ПАНІРОЎЦЫ

Марка	Назва	Зьмесьціва рыбы, %	Калярыйнасьць
Findus	Сайда ў паніроўцы	67,2	**
Captain Iglo	Палачкі хеку	69,3	*
Packfish	Палачкі	69,3	*
Fisherboy	Хек у паніроўцы	67,8	***
Leader Price	Палачкі хеку	62,0	**
ServiFrais	Палачкі ў паніроўцы	58,8	**
Captain Sea	Палачкі паніраванай рыбы	61,6	**
Peche Ocean	Трасковыя палачкі	61,1	*
Grang Gel	Філе траскі, палачкі	67,3	**
Les Dauphins	Палачкі зь белай рыбы	59,6	**

*** — добра ** — сярэдне * — пасрэдна



У ПАПЯРЭДНІХ НУМАРАХ (№1 - 23):

Кошты на менскіх рынках: Камароўка (ІНФ. №1, 7, 10, 21); Рэчавы рынак "Дынама" (ІНФ. №2, 8); Аўтарынак (ІНФ. №3, 12); Кошты на камплект-дыскі (ІНФ. №4); Кошты на кватэры ў Менску. Кошты на офісы (ІНФ. №5, 17); Кошты на будаўнічыя матэрыялы (ІНФ. №6); Кошты на камп'ютары. Менск (ІНФ. №9); Кошты на філязофска-гуманітарную літаратуру (ІНФ. №18).

Транспарт: Расклад руху пасажырскіх цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФ. №1,15); Расклад руху прыгародных цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФ. №2, 12); Расклад руху аўтобусаў ад а/с Менск-Цэнтральны і Менск-Усходні (ІНФ. №3, 16, 17); Расклад рэйсаў пасажырскіх самалётаў і ўсё пра аўтазапраўныя станцыі (ІНФ. №5).

Адукацыя: Замежнае навучаньне ў 1996 годзе (ІНФ. №1); Платнае навучаньне ў Менску. Камэрцыйныя ВНУ (ІНФ. №2); Дзяржаўныя ВНУ. Платнае навучаньне (ІНФ. №3-4); ВНУ. Акадэміі (ІНФ. №8-10).

Біржа працы: Аналіз стану рынку працы паводле зьвестак Менскага гарадзкога цэнтру занятасьці насельніцтва (ІНФ. №1- 9); Новыя вакансіі й працоўныя месцы па Беларусі (ІНФ. №1-23).

Адпачынак: Вучымся гуляць у прэфэранс (ІНФ. № 1-15); Вучымся гуляць у більярд (ІНФ. № 16-23); Тэсты, шахматныя і інтэлектуальныя задачы (ІНФ. №1- 23).

Спажывец: Тэлефонныя коды гарадоў Беларусі, краінаў блізкага і далёкага замежжа (ІНФ. №2); Твае правы, пасажыр (ІНФ. №2); Як купляць і прадаваць кватэру. Што азначае спэцыяльнае маркаваньне (ІНФ. №3); Месяцовы пасяўны каляндар (ІНФ. №4); Як вызначыць якасьць мясных і рыбных прадуктаў (ІНФ. №5); Пра новыя даляры. Праўда пра цыгарэты. Штрыхавы код — як яго расшыфраваць (ІНФ. №6); Як выбіраць абутак (ІНФ. №7); Міжнародная сыстэма гатэляў (ІНФ. №10); Каб выросла рэпа вялікая...(ІНФ. №11); Як набыць аўтамабіль у Нямеччыне (ІНФ. №18 Заканчэньне); Вучымся эканомна кіраваць аўтамабілем (ІНФ. № 12, 15, 17); Зрабі сам (ІНФ. № 16); Сонынік (ІНФ. № 15, 17, 18 Заканчэньне); Спажывецкі тэст — прасы (ІНФ. № 20); Спажывецкі тэст — тэлевізоры (ІНФ. № 21); Кошты на аўто ў Польшчы (ІНФ. № 21, 22); Гумкі (ІНФ. № 23); "Time Share": Як пазьбегнуць непрыемнасьцяў (ІНФ. № 23). Інвэстыцыйныя фонды: некалькі парадаў дробнаму ўкладальніку (ІНФ. № 23); Пырскі шампанскога (ІНФ. № 23).

Інструктар: Друкарня ў кожнай кватэры; За родную школу; Зьбіраемся ў падарожжа (ІНФ. № 19).

Здароўе: Перш чым зьвяртацца да лекара. Як кінуць паліць (ІНФ. №4); Прыродныя атруты (ІНФ. №10); Атлетычныя клюбы, шэйпінг, аэробіка, тэнісныя корты (ІНФ. №18); Камплексная ацэнка забруджаньня асяродзьдзя Менску і вобласьці (ІНФ. № 19); Тэст: асьпірын (ІНФ. № 22); Небясьпечныя лекі (ІНФ. № 22); Пра шкоду пасіўнага паленьня (ІНФ. № 22); Без дыеты не абысьціся (ІНФ. № 23); Перш чым купіць цацку, панюхайце! (ІНФ. № 23).

Гаспадарка: Газ у нашым доме. Як чытаць цэтлікі на вопратцы. (ІНФ. №5); ЖЭС. Рамонт жытла. Пункты прыёму замоваў на будаўніча-рамонтныя працы (ІНФ. №6); Як мыць і чысьціць посуд. Калі заліло кватэру... (ІНФ. №8); Як пабудаваць садовы домік. Дом і дзялянка (ІНФ. №9).

Грамафон: Старонка вершаванага радка (ІНФ. №6, 8, 11, 17, 19, 20).

Харчаваньне: Якую гарбату мы п'ем. Пра часнык (ІНФ. №7); Бары, рэстарацыі, кавярні Менску (ІНФ. №15).

Спорт: Вынікі спаборніцтваў і інш. (ІНФ. №7, 9, 19).

Бібліятэка: Новыя паступленьні ў кнігарні. Рэцэнзіі (ІНФ. №9, 10, 11, 15, 16, 18-23).

За мяжою: Хто такія ньюёрцы; Лістованьне з навучальнымі ўстановамі ЗША (ІНФ. №17).

Беларусь і сьвет: Індзейцы у Беларусі (ІНФ. № 21).

Адвакат: Ахова правоў чалавека. Міжнародная Амністыя (ІНФ. №17).

ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫХ НУМАРАХ:

Рынак: Новыя кошты на розныя товары.

Грамафон: Новыя верцяы нашых чыточоў.

БІЛЬЯРД

ЗАНЯТАК 8

(Працяг. Пачатак у N 16)

Калі на стале кампазыцыя шароў такая, што пры адыгрышу "зваротным" немагчыма прывесьці бітак назад, карыстаюцца іншым відам дуплету, які называецца "зваротны шруб". Пры гэтым, калі ўдар выконваецца з правага ад гульца боку стала, то бітку даецца крутое правае "эфэ". У выніку "свой", дакрануўшыся да шара-мішэні, дасьць рыкашэт і, стукнуўшыся ў кароткі борт, дзякуючы кручэньню супраць гадзіньнікавай стрэлкі, сыдзе ў зваротны бок і вернецца "дадому" (мал. 20). Калі ўдар выконваецца зь левага ад гульца боку стала, то бітак б'ецца крутым левым бакавым ударам. Галоўная вартасьць гэтых удараў у добрым адыгрышы.

Дуплеты ад двух (трыплет) і трох (труабан) бортаў таксама гуляюцца збольшага для надзейнага адыгрышу, але затое пры кладцы замоўленага прыцэльнага шара ў лузу гулец атрымлівае маральнае задавальненьне (мал. 21, 22).





Удар ад чатырох бортаў (катрбан) ужываецца параўнальна рэдка, дый тое толькі на більярдных сталах, дзе борты маюць вельмі мяккую гуму (мал. 23).

Хаця дуплеты адносяць звычайна да складаных удараў, яны тэхнічна лёгка выконваюцца пры ўмове, што ў спартоўца добрае вока і ён мае магчымасьць пэрыядычна гуляць у більярд.

Удары ў шары, якія адбіваюцца шарамі. Падчас гульні, асабліва калі на стале яшчэ шмат незгуляных шароў, досыць часта ёсьць магчымасьць накіраваць "свой" ці "чужы" шар у лузу такім чынам, каб ён дарогай адбіўся ад іншых шароў. Такі ўдар мае назоў карамболь. На



мал. 24, 25 і 26 паказаныя толькі



некаторыя, найбольш распаўсюджа-



ныя варыянты карамбольных удараў. Наагул жа такіх удараў можа быць бясконцае мноства. Ёсьць нават некалькі гульняў, якія прадугледжваюць кладку шароў у лузы толькі карамбольнымі ўдарамі.

Кожны шар, згуляны карамболем, звычайна прыгожы, а эфэктыўнасьць ягоная нашмат залежыць ад уменьня гульца валодаць "сваім" шарам.

Удар "шарам". Калі два шары, знаходзячыся на адной лініі з цэнтрам кутняй ці сярэдняй лузы, стаяць устыч, то гуляльны шар кладзецца лёгка ўдарам "шарам" (мал. 27).

Калі ж два шары, знаходзячыся на адной лініі з лузай прыёму, аддаленыя адзін ад аднаго, то гуляць "шарам" у гэтым разе цяжэй (мал. 28).



Найбольш цяжка гэты ўдар выканаць, калі два белыя шары не знаходзяцца ў створы зь сярэдзінай лузы. Тут патрабуецца ўжо "рэзка" праз шар (мал. 29).



Удар "наразрэз" выконваецца, калі два шары стаяць так блізка, што "свой" адначасова б'е ў абодва. Пры гэтым адзін з двух гуляльных шароў можа быць згуляны ў лузу (мал. 30).



Рыхтуючыся да такога ўдару, трэба старанна разьлічыць, каб бітак ня ўдарыўся сьпярша ў суседні шар, бо той сапсуе ўдар, з-за чаго "свой" атрымае незаплянаваны кірунак і ўдар не прынясе посьпеху.

Асаблівыя ўдары

Існуе некалькі асаблівых, пераважна складаных удараў, якія сустракаюцца параўнальна рэдка. Аднак уменьне выканаць складаны ўдар ня толькі дазваляе спартоўцу весьці тактычна асэнсаваную гульню, але і з посьпехам згульваць шары ў лузы пры, здавалася б, немагчымай для гэтага пазыцыі і, такім чынам, дэманстраваць шматграннасьць і чароўнасьць більярднай гульні.

Асаблівыя ўдары – гэта "дугавік", "пераскок", "пісталет" ("тычок"), "абрыколь", "контартуш", "масэ".

Працяг у наступным нумары

ШАХМАТЫ

1п. Белыя пачынаюць і перамагаюць.

4п. Ход белых. Адшукаць шлях да перамогі.

2п. Ход чорных. Знайсьці шлях да перамогі.

5п. Белыя пачынаюць і перамагаюць.

3п. Белыя пачынаюць і перамагаюць.

6п. Ход белых. Які павінны быць вынік?

Адказы ў наступным нумары

АДКАЗЫ НА ПАПЯРЭДНІЯ ЗАДАНЬНІ

Шахматы

Тлумачэньні:
Кароль — **Кр**;
Гетман (Фэрзь) — **Г**;
Вежа (Тура) — **Вж**;
Вышнік (Слон) — **В**;
Конь — **К**.

1п. Могуць 1 ... Крg6! 2. Крf3. 2 ... Вжe1! 3. Крf4 Вжe2 4. Вжd5 з пагрозай пераводу вежы на с5, 4 ... Вжс2! Кепска 4 ... Кр : f6 5. Вжс5 Вжe8 6. Вжf5+! Крe7 7. Вжe5 + Вжa7 8. Вж : e8 Кр : e8 9. Крe5 Крe7 10. Крd5+-. Вжd6 Вжe2 6. f7. Спроба прарваць ніжніку 6 ... Кр : f7 +.&. Крf5 Крe7 8. Вжd7+ Крe8 9. Крf6 Вжe1 10. Вжd5 Вжс1 11. Вжd6 Вжf1+ 12. Крe6 Вжe1+ 13. Крd5 Вжd1+ 14. Крс5 Вж : d6 15. Кр : d6 Крd8=.

2п. 1. Вжe8!, пагражаючы 2 Вжh8X. 1 ... Кр : h5 2. c6 +-.

3п. Могуць 1 ... Вжa4! 2. g5 Крh5 3. Вжg7 Вжa5 4. g6 Вжa6 5. Вжg8 Вжb6=, белыя ня могуць узмацніць сваю пазыцыю.

4п. 1. Вжd7+! Адыгрываючы вэжны тэмп 1... Крg3. Калі 1... Крe3, то 2. Вжg7 Крf4 3. Крf7 g4. Крg6 g3 5. Крh5+-. 2. Крe7 g4 3. Крe6! (але ня 3. Крf6? Крf4! 4. Крg6 + Крe3=) 3 ... Крh2 4. Крh5 g3 5. Крg4 g2 6. Лh7 + Крg1 Крg1 7. Крg3+-.

5п. Перамога. 1. Крg3 Вжф5 (пагражала 2. f5) 2. h6+ Крg6 3. Крh4! Вжa4 4. Крg4 Вжa5 5. Вжс2 ф2 6. f5+Вж : f5 7. Вжс6+Крh7 8. Вжс7+ Крq8 9. Вжa7!- ці 6 ... Крh7 7. Вжс7+ Крq8 8. Вжс8+Крh7 9. Крh5!!-; на 7 ... Крf7 ідзе 8. g6+ Крe7 9. Вжс1+-.

6п. Пры ходзе чорных — нічыя. 1 ... Вжb6! 2. g6 Вжb1=. Пры ходзе белых — перамога. 1. Крh6! Вжb6+2. g6 Вжb8 3. Вжa6! (бяз ножніка g2 — нічыя) 3 ... Вжf8. g4 Вжb8 5. g7 Вжf8+ няма абароны.

Забаўкі
1. 6 **2.** 55 **3.** 88

ЗАБАЎКІ

Задача 1

Устаўце фігуру, якой нестае



Задача 2

Устаўце фігуру, якой нестае



Задача 3

Падстаўце літару, якой нестае

Х М' З Д ?

Адказы ў наступным нумары

17 верасьня 1939 году
Ненапад

Агрэсія — любое незаконнае ўжыванне ўзброенай сілы адной дзяржавы супраць сувэрэнітэту, тэрытарыяльнай недатыкальнасьці альбо палітычнай незалежнасьці іншай дзяржавы ці народу (нацыі).

З «Советского энциклопедического словаря»

Калі поўначы 23 жніўня 1939 году быў падпісаны пакт Молатава-Рыбэнтропа. Пачалася навая эра ў адносінах паміж СССР і фашысцкай Нямеччынай — эра дружбы і супрацоўніцтва. Лёс Польшчы быў ужо вырашаны: яе падзялілі на савецкую і нямецкую зоны, мяжа паміж якімі павінна была прайсьці па лініі рэк Нарэў, Вісла, Сан. Акрамя таго, Фінляндыя, Эстонія і Латвія цяпер лічыліся савецкай «сфэрай уплыву», Літва — нямецкай. У далейшым Сталін выкупіў ў Гітлера права акупаваць Літву за Люблінскае і частку Варшаўскага ваяводзтваў Польшчы за 7,5 мільёнаў даляраў.

Пасьля падпісаньня дамовы і сакрэтнага пратаколу пачалося, згодна з крамлёўскай традыцыяй, застольле. Сталін быў задаволены, хадзіў, паціраў рукі. «Падманулі, падманулі!» — шаптаў ён на вуха Молатаву. Прамаўляліся тосты за фюрэра нямецкай імпэрыі і кіраўніка савецкай дзяржавы, за здароўе міністраў замежных справаў і паслоў.

Сталін, разьвесяліўшыся, прапанаваў Рыбэнтропу выпіць нават за здароўе Лазара Кагановіча, народнага камісара шляхоў зносінаў. І нічога, мацёры фашыст нават не паморшчыўся, выпіваючы за здароўе габрая-наркама.

Да пачатку Другой сусьветнай вайны заставалася восем дзён.

Напачатку вайны ў Бэрліне Гітлер, прымаючы даверчыя лісты ў новага савецкага пасла Аляксандра Шкварцава, быў змрочны і задумлівы. Сканчаўся тэрмін англа-французскіх ультыматумаў, якія патрабавалі тэрміновага выводу нямецкіх войскаў з тэрыторыі Польшчы.

Сталін і Рыбэнтроп у Крамлі, 25 жніўня 1939г.

Гітлера мучалі сумневы: ці не падвядзе ў апошні момант ягоны маскоўскі сябра?

Сталін прыслаў Шкварцава на вакантнае месца савецкага пасла, каб падбадзёрыць фюрэра.

Усё будзе, як і дамовіліся.

Гітлер асабліва цікавіўся, калі савецкія войскі ўварвуцца ў Польшчу. З наіўнасьці ён меркаваў, што гэта акцыя аўтаматычна зробіць СССР яго саюзьнікам, бо Англія і Францыя вымушаныя будуць аб'явіць вайну і Савецкаму Саюзу. Нават такому бываламу палітыку, якім быў Гітлер, яшчэ ня раз давядзецца зьдзіўляцца і захапляцца сталінскімі мэтадамі захопу чужых тэрыторыяў. Камкор Пуркаеў запэўніў фюрэра, што Савецкі Саюз ніколі не падводзіць сваіх сяброў.

Між тым вайна ў Польшчы ішла не зусім так, як яе расплянавалі ў Бэрліне. На ўсіх участках фронту палякі шалёна супраціўляліся. Расьсечаныя танкавымі клінамі Гудэрыяна польскія войскі, навязаўшы немцам бітву на Дзуры і стварыўшы пагрозу выхаду буйных кавалерыйскіх частак у тыл танкавым групоўкам, змаглі пазьбегнуць акружэньня і адвесьці асноўныя сілы сваёй арміі за Віслу, дзе польскае камандаваньне разьлічвала, перагрупаваўшы сілы, перайсьці ў контранаступ.

Уся прэса сьвету, уключаючы і нямецкую, адзначала гераічны супраціў польскай арміі. Абарона Вэстэрплятэ, Хела, Гдыні і Варшавы выклікала захапленьне сьвету, а бітву на Дзуры нават «Фолькішэр Беобахтэр» назвала «найбольш бязьлітаснай у гісторыі». Савецкая прэса пра ўсё гэта маўчала. Наадварот, з нумару ў нумар усе савецкія газэты са зьдзіўленьнем адзначалі, што палякі не аказваюць немцам ніякага супраціву, што Польшча фактычна акупаваная, і невядома, дзе знаходзіцца яе ўрад.

14 верасьня газэта «Правда» пісала ў рэдакцыйным артыкуле: «Можа ўзьнікнуць пытаньне, чаму польская армія не аказвае немцам аніякага супраціву? Гэта адбываецца таму, што Польшча не зьяўляецца аднанацыянальнай дзяржавай. Толькі 60% насельніцтва складаюць палякі, астатнюю ж частку — украінцы, беларусы, габраі... Адзінаццаць мільёнаў украінцаў і беларусаў жылі ў Польшчы ў стане нацыянальнага прыгнёту... Польскі ўрад праводзіў палітыку прымусовай паланізацыі...» Вось таму ніхто і не хацеў змагацца за такую краіну.

Нямецкія і савецкія вайскоўцы падчас сумесных ваенных дзеяньняў. Верасень 1939г.

Пакуль за мяжой разважалі, што ўсё гэта значыць, разгадка не прымусіла сябе чакаць. 17 верасьня польскі пасол у Маскве Вацлаў Гжыбоўскі быў тэрмінова выкліканы ў наркамат замежных справаў.

Намесьнік наркама Пацёмкін зачытаў паслу ноту наступнага зьместу: «Нямецка-польская вайна паказала ўнутранае банкруцтва польскай дзяржавы... Варшава, як сталіца Польшчы, не існуе больш. Польскі ўрад распаўся і не выяўляе прыкметаў жыцьця. Гэта значыць, што Польская дзяржава і польскі ўрад фактычна перасталі існаваць. Тым самым спынілі сваё дзеяньне дамовы, заключаныя паміж СССР і Польшай... Савецкі ўрад ня можа таксама абыякава ставіцца да таго, каб аднакроўныя ўкраінцы і беларусы, якія жывуць на тэрыторыі Польшчы, кінутыя на волю лёсу, засталіся безабароннымі.

З прычыны такой абстаноўкі, Савецкі ўрад даў распараджэньне Галоўнаму камандаваньню Чырвонай Арміі даць загад войскам перайсьці мяжу і ўзяць пад сваю абарону жыцьцё і маёмасьць насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі».

Кожнае слова ў гэтай ноце працятае хлусьнёю. Польскі ўрад знаходзіўся ў мястэчку Куты паблізу румынскай мяжы. Што тычыцца Варшавы, то сталіца Польшчы была захоплена немцамі толькі 27 верасьня. Аднак, імкнучыся хутчэй атрымаць дапамогу з усходу, немцы ўжо 9 верасьня аб'явілі пра ўзяцьце Варшавы.

З гэтай нагоды ў той самы дзень Молатаў накіраваў віншавальную тэлеграму Рыбэнтропу: «Я атрымаў Ваша паведамленьне пра тое, што нямецкія войскі ўвайшлі ў Варшаву. Калі ласка, перадайце маё віншаваньні і прывітаньні ўраду Нямецкае імпэрыі».

А 2-й гадзіне ночы ў Крэмль быў выкліканы нямецкі пасол граф фон Шуленбург. Сталін прыняў яго ў прысутнасьці Молатава і Варашылава. Пасьля ўзаемных прывітаньняў паслу абвясьцілі, што сёньня, 17 верасьня 1939 году, у 6 гадзін раніцы Чырвоная Армія пяройдзе польскую мяжу на ўсёй працягласьці ад Полацка да Камянец-Падольска. Каб пазьбегнуць магчымых інцыдэнтаў паміж савецкімі і нямецкімі лётчыкамі была перададзена просьба, каб нямецкая авіяцыя не залятала на ўсход за лінію Беласток-Берасьце-Львоў.

На мяжы з Польшчай былі сканцэнтраваны 54 стралковыя і 13 кавалерыйскіх дывізіяў, 18 танкавых брыгад і 11 артылерыйскіх палкоў Галоўнага камандаваньня агульнай колькасьцю каля 600 тысячаў чалавек. Іх баявыя дзеяньні падтрымлівалі 4 тысячы танкаў, 5500 гарматаў і 2 тысячы самалётаў. Гэтыя сілы былі разьдзеленыя на два франты — Украінскі на чале з камандармам 1-га рангу С.Цімашэнкам і Беларускі на чале з камандармам 2-га рангу М.Кавалёвым.

Уварваньне савецкіх войскаў застала польскае камандаваньне зьнянацку. Ніхто спачатку не зразумеў, што адбылося. Што гэта: прыход саюзьнікаў альбо ўварваньне? Аднак адказ на гэтае пытаньне далі савецкія бомбы і снарады, якія абрынуліся на польскія пазыцыі. Адыграла сваю ролю і дырэктыва вайскаводцы Рыдз-Сьміглага, які загадаў не ўступаць у бой з часткамі Чырвонай Арміі і адыходзіць на тэрыторыю Румыніі і Вугоршчыны.

Пераважная большасьць баяздольных частак палякаў была нацэлена для ўдару па немцах. Чырвонай Арміі аказалі супраціў галоўным чынам часткі корпуса памежнай аховы. І тым ня менш разгарнуліся буйныя баі пад Горадняй, Шацкам і Аранам. Пад Перамышлем два пяхотныя палкі былі начыста высечаныя ўланамі генэрала Ўладзіслава Андэрса. Цімашэнка пасьпеў увесьці ў бой танкі, прадухіліўшы прарыў польскай коньніцы на тэрыторыю СССР.

Гераічны польскі гарнізон Берасьцейскай крэпасьці на чале з генэралам Канстанцінам Плісоўскім адбіў усе атакі Гудэрыяна. Гудэрыян нэрвавауся. Выратавала цяжкая артылерыя камбрыга Крывашэіна, якая абстрэльвала крэпасьць на працягу двух сутак няспынна. Разгарачаныя боем, абдымаліся на тэрэспальскім мосьце праз Буг «браты па зброі» — салдаты Кавалёва і Гудэрыяна.

З нагоды слаўнай перамогі ў Берасьці адбыўся грандыёзны ваенны парад. Пад ваяўнічыя гукі Брандэнбурскага маршу крочылі савецкія і нямецкія салдаты. Прымаючы парад, на трыбуне разам стаялі генэрал Гейнц Гудэрыян і камбрыг Сямён Крывашэін.

«Сяброўства, змацаванае крывёю!» — скажа пазьней Сталін у тэлеграме Гітлеру.

Чырвоная Армія ўзяла ў палон 240 тысячаў польскіх вайскоўцаў. Транспарту, турмаў і лягераў, натуральна, не хапала, таму адразу ж пачаліся масавыя расстрэлы ваенапалонных. Брацкія магілы — сьляды «вызваленчага паходу» — знаходзяцца пад Горадняй, у Ашмянах, Вялейцы, Маладэчне, Сарнах, Наваградку, Курапатах, Рагатыне, Косаве, Ваўкавыску...

Афіцыйна былі абвешчаныя і ўласныя страты: 737 забітых, 1862 параненыя. Усяго: 2599 чалавек. (Сапраўдныя страты склалі 5327 чалавек. Забітых 1386. — І.К.)

25 верасьня 1939 году Шуленбург тэлеграфуе ў Бэрлін:

«Сталін заявіў: у канчатковым урэгуляваньні польскага пытаньня трэба пазьбягаць усяго, што ў будучыні магло б выклікаць сутыкненьні паміж Нямеччынай і Савецкім Саюзам. З гэтага пункту гледжаньня, ён лічыць памылковым пакідаць незалежную польскую дзяржаву. Ён прапануе наступнае рашэньне: з тэрыторыяў на ўсход ад дэмаркацыйнай лініі да нашай часткі павінны быць далучаныя ўсё Люблінскае ваяводзтва і частка Варшаўскага ваяводзтва, якая цягнецца да Буга. Узамен мы павінны адмовіцца ад нашых прэтэнзіяў на Літву...»

Прыйшоў хуткі адказ з Бэрліна. Фюрэр зьмяніў сваё першапачатковае меркаваньне і лічыць погляд Сталіна больш рэалістычным.

27 верасьня «Правда» паведаміла: «На запрашэньне ўраду СССР 27 верасьня г.г. у Маскву прыбывае міністар замежных справаў Нямеччыны сп. фон Рыбэнтроп для абмеркаваньня з урадам СССР пытаньняў, зьвязаных з падзеямі ў Польшчы».

Рыбэнтроп прыбыў у Крэмль на

Молатаў і Гітлер у Бэрліне. Лістапад 1940г.

начныя перамовы. Гітлер згадзіўся са сталінскім плянам абмену польскіх земляў на Літву. «Гітлер ведае сваю справу», — задаволена заўважыў Сталін і ў наплыве велікадушнасьці падарыў Рыбэнтропу вялікія паляўнічыя ўгодзьдзі ў Белавескай пушчы, зазначыўшы, што гэтаму падарунку, напэўна, больш за ўсіх узрадуецца Герынг, вядомы сваёй жарсьцю да паляваньня.

У нязмушанай абстаноўцы прыхільнай гутаркі і жартаў была падпісана новая савецка-нямецкая дамова, якая атрымала назву «Дамовы аб сяброўстве і межах». На прыкладзенай да дамовы сакрэтнай мапе была старанна накрэсьленая дэмаркацыйная лінія чацьвертага падзелу Польшчы з папраўкамі, якія асабіста зрабіў Сталін, аддаючы паляўнічыя ўгодзьдзі Рыбэнтропу. З-за гэтага Сталіну давялося двойчы падпісваць карту. Другі раз яго росчырк з тэрыторыі Заходняй Беларусі прарэзаў Украіну і трапіў у Румынію. Перад ад'ездам з Масквы Рыбэнтроп даў інтэрвію карэспандэнту ТАСС, адзначыўшы наступныя пункты:

«1. Нямецка-савецкае сяброўства цяпер усталяванае канчаткова.

2. Абодва бакі ніколі не дапусьцяць умяшаньня трэціх дзяржаваў ва усходнеэўрапейскія пытаньні.

3. Абедзьве дзяржавы жадаюць, каб мір быў усталяваны і каб Англія і Францыя спынілі абсалютна бесэнсоўную і беспэрспэктыўную барацьбу супраць Нямеччыны.

4. Калі, аднак, у гэтых краінах возьмуць верх падпальшчыкі вайны, то Нямеччына і СССР будуць ведаць, як адказаць на гэта».

Што і казаць, Сталін быў задаволены. Тэрыторыі, уключаныя ў склад СССР у выніку разгрому і падзелу Польшчы, налічвалі каля 200 тысячаў квадратных кіламэтраў з насельніцтвам у 13,4 мільёнаў чалавек.

Тэрмінова пачалося прывядзеньне зноў атрыманых тэрыторыяў да агульнасаюзнага стандарту. Мясцовыя аддзелы НКВД БССР атрымалі сакрэтны загад наркама ўнутраных справаў №001223 за 11 кастрычніка 1939 году, згодна зь якім трэба было арганізаваць тэрміновы ўлік «контрэвалюцыйных элемэнтаў і варожых катэгорыяў насельніцтва» незалежна ад таго, ці ўдзельнічалі яны ў антысавецкай дзейнасьці альбо не. Хутка складзеныя сьпісы ўключалі ў сябе ня толькі былых вайскоўцаў польскай арміі, жандармэрыі і паліцыі, але і службоўцаў дзяржаўных установаў, сяброў украінскіх, беларускіх і польскіх культурных і нават спартовых суполак.

На працягу кастрычніка-лістапада 1939 году з савецкіх лягераў былі адпраўлены ў хатах 42 000 беларусаў, украінцаў, палякаў, якія стала жылі ў Наваградзкім ваяводзтве, на Палесьсі, Валыні і ў іншых раёнах Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. 19 лістапада 1939 году выйшаў указ Берыі пра канцэнтрацыю афіцэраў польскай арміі ў Старабельскім, Асташкоўскім і Казельскім лягерах.

Непасрэдна прысуд аб расстрэле больш за 23 тысячаў афіцэраў польскай арміі быў вынесены Асобай нарадай НКВД СССР, на падставе рашэньня Палітбюро ЦК ВКП(б) у красавіку 1940 году.

Сьледзтва, праведзенае ў 1990-1992 гадах сьледчай групай Галоўнай ваеннай пракуратуры, выявіла, што ня толькі ў равах Катыні ляжаць афіцэры польскай арміі. Зрэшты, афіцэры — паняцьце занадта агульнае, якое не дае поўнага ўяўленьня пра тое, хто быў прызначаны да ліквідацыі. Дзьве траціны інтэрнаваных складалі афіцэры запасу польскага і беларускага паходжаньня: інжынэры, настаўнікі, адвакаты, лекары, выкладчыкі, ліцэісты, студэнты, сьвятары.

Прычым у Катыні пахаваныя толькі тыя афіцэры, якія знаходзіліся ў Казельскім лягеры. Дзе завершыўся крыжовы шлях іх таварышаў зь іншых лягераў, не было вядома да нядаўняга часу. Сёньня ўстаноўлены і месцы іх страты, і месцы пахаваньня — лесапаркавая зона ў Харкаве і пасёлку Меднае ў Цьвярской вобласьці. Ёсьць усе падставы сьцьвярджаць, што больш за 3 тысячы афіцэраў польскай арміі былі расстраляныя ў Курапатах. Пра гэта выразна сьведчаць дакумэнты і матэрыялы, сабраныя беларускім журналістам Яўгенам Гарэлікам у кнізе «Курапаты. Польскі сьлед», якая выйшла летам 1996 году ў Варшаве.

26 верасьня 1939 году савецкія газэты апублікавалі вялікае паведамленьне «Нямецкае камандаваньне пра вынікі вайны ў Польшчы». На наступны дзень у Маскву прыбыў Рыбэнтроп. Дваццаць восьмага, калі яшчэ дагаралі вогнішчы адкрытага супраціву фашызму ў Варшаве і на Балтыцы, была падпісана савецка-нямецкая дамова аб сяброўстве і межах. Да самага чэрвеня 1941 году па Маскве хадзілі чуткі пра тое, быццам Сталін і Гітлер хутка аб'яднаюць Нямеччыну і СССР у адну дзяржаву: яны там у Бэрліне таксама сацыялісты, няхай і з прыстаўкай «нацыянал»...

Такім чынам, усё скончана. У школах Заходняй Беларусі ўзнаўляюцца заняткі. Наладжваецца праца прадпрыемстваў. Войскі ўладкоўваюцца ў казармах. Жыцьцё працягваецца — для тых, хто выжыў...

Ігар Кузьняцоў

Клайв Стэйплз Льюіс (1898-1963)

Пасьля грэблівасьці

Грэблівасьць, натуральна, рэч небясьпечная, і чым больш яна маральная, тым больш небясьпечная. Кепска, калі чалавека цураюцца, бо ён бедны або калека, але жудасна, калі ім грэбуюць, бо ён кепскі (маўляў, мы лепшыя). Гэтай тэме не відаць ні канца, ні краю: крывадушнікі... віктарыянцы... фарысеі... прыпавесьць пра мытара... Карацей, усё неяк ідзе самапасам. Далібог, мне цяжка было спыніцца.

Але праблема ў тым, чым мы ўсё гэта заменім. Здаўна вядома, што асабістыя заганы служаць паспалітаму дабру. Гэта значыць, пазбавіўшыся заганы, трэба замяніць яе цнотаю, якая будзе слугаваць таму ж дабру. Пазбавіцца грэблівасьці замала, трэба яшчэ нешта.

Гэтыя думкі прыйшлі ў галаву пасьля звычайнае гутаркі — таварыш распавёў мне пра банкет, на якім быў нейкі Кляон. Мой таварыш — чалавек добры й прыстойны, Кляон жа — несумленны барзапісец, які за грошы пускае па сьвеце хлусьлівыя плёткі, разьлічаныя на зайздрасьць, злосьць ды зваду. Прынамсі, мне так здаецца. Але праблема не ўва мне. Праблема ў тым, што мой сябар дзеля таго й распачаў размову, каб паведаміць мне пра Кляона яшчэ нейкую брыдоту.

Вось дзе мы апынуліся, скасаваўшы грэблівасьць. Чалавек лічыць другога мярзотнікам, але палуднуе разам, быццам яму ўсё адно. Раней, сярод крывадушнікаў, Кляон быў бы кімсьці накшталт прастытуткі. Ён бы меў справу толькі з кліентамі, калегамі й вартай. Калі б грамада мела разважнасьць (так калі-нікалі бывае), дык яго б лічылі ніжэйшым за прастытутку. Цнатлівасьць душы важнейшая за цноту цела; уцехі, якія прапануе Кляон, — ніжэйшыя; хваробы, якімі запаветрывае —горшыя. Але ж мы палуднуем зь ім, п'ем, жартуем, паціскаем яму руку і, горай за ўсё, чытаем ягоныя артыкулы.

Я ня маю веры, што мы зрабіліся дабрэйшыя. Мы маем зь ім зносіны не дзеля спагады, як сьвятар, які спавядае прастытутку. Наўрад ці хрысьціянская любоў да злыдня перамагла нашую хрысьціянскую

Ці трэба чытаць хлусьлівыя газэты?

нянавісьць да ліха. Мы нават не ўдаем, быццам мы яго любім, я ніколі ня чуў пра яго ні добрага слова, ні паўслова. Што ж да падступнасьці, дык мы яе прымаем, хіба толькі ўсьміхаемся самі сабе ды паціскаем плячыма. Мы страцілі найкаштоўнейшы дар маральнага жаху, які заўжды розьніў чалавека ад жывёлы. Карацей кажучы, мы не вышэйшыя, а ніжэйшыя за грэблівасьць.

Кляон жа мае з гэтага немалы пажытак. Калі падступнасьць нават роўная прыстойнасьці, дык шмат хто абярэ першую. Але ж Кляону няма патрэбы й выбіраць! Маючы ўцеху зь безупыннага заспакаеньня сваёй непаўнавартасьці, ён улез у хаты прыстойных людзей. Чаго ж тады спадзявацца? Кляоны будуць множыцца, мы ж загінем. За дэмакратыяй яны будуць перашкаджаць пашырэньню грамадзкай думкі, і яна ня здолее быць праўдзівай. За тыраніяй (барані Божа!) яны зробяцца найбольш жорсткімі і бруднымі яе паслугачамі.

Таму я й прапаную іх цурацца, грэбаваць імі. Уласна, гэта ўжо не зусім грэблівасьць. Нас будуць абвінавачваць, і першы Кляон, у тым, што мы лічым сябе «лепшымі». Пачуць гэта цяжка, але ці гэта так?

Калі я сустрэну чалавека нападпітку ды завяду яго дахаты, дык я пакажу, што я цьвярозы, і з гэтага боку — лепшы. Але круці, не круці, мая адзіная перавага ў тым, што я магу йсьці роўна, а ён — не. Няма й гаворкі пра тое, што я лепшы за яго з нейкага іншага боку. Няма патрэбы мне нагадваць, што ён сьмелы, зычлівы альбо высакародны. Цалкам можа быць. Але ж не пра тое гаворка.

Таму мне здаецца, што можна (і нават трэба) грэбаваць Кляонам зь ягонымі артыкуламі, ані ня маючы думкі, быццам мы лепшыя за яго. Можа так стацца, што з натуры ён вышэйшы й лепшы за нас. Мы ня ведаем, якім шляхам ён прыйшоў да мярзотнасьці, як ён змагаўся, чаму здаўся. Мо' ў яго былі жорсткія бацькі, або зь яго сьмяяліся ў школе, або яму не пашчасьціла з жонкай. А мо' ён меў шчырыя перакананьні, потым прыйшло жаданьне перамагчы супернікаў, потым здарылася першая мана, а потым мана сталася прафэсіяй. Барані Божа, калі я кажу, што я б на месцы Кляона быў лепшы за яго. Але ж цяпер ён, а ня я прафэсійны мярзотнік; ён, а ня мы. У нас сотні заганаў, якіх няма ў яго, але ў пэўным сэнсе — так, мы лепшыя за яго.

Так сталася, што акурат ягоная загана труціць людзей. І мы мусім гэтаму перашкодзіць. Закон гэтага ня можа, дый нельга надаваць яму гэткага права. Але грамадзкая думка мае права выставіць санітарны кардон. Толькі такія, як ён, будуць чытаць ягоныя артыкулы, і шкода ад іх паменшае.

Здавалася б, няцяжка адмовіцца ад газэты, у якой аднойчы вы прачыталі хлусьню, — спачатку не чытаць яе, а пазьней — не купляць. Але ж як рэдка так бывае! Зноў ды зноў я чую ад вартых людзей, што «трэба ж быць у курсе». Не, ня трэба. Каб ведаць, што пішуць зламысныя людзі прыйдзецца купляць іхныя газэты, іншымі словамі — падтрымліваць гэтыя газэты, г.зн. спрыяць ліху. Калі-нікалі бывае небясьпечна ня ведаць ліха, але ня ў гэтым разе, бо гэтае ліха згіне, калі пра яго ня будуць ведаць.

Мабыць, вы скажаце, якая розніца, хто-небудзь усё адно купіць. Кляона чытаюць мярзотнікі, якіх абыходзіць праўда. Натуральна, так. Але я ня дам веры, што іх замнога, прынамсі, іх недастаткова, каб забясьпечыць яму сродкі да існаваньня. У тым і справа, што даюць іх яму не мярзотнікі, а прыстойныя людзі. Дык можа пакінем яго сам-насам зь мярзотнікамі? Хаця б гадоў на пяць... наўрад ці ён выжыве. А пачнем зараз, сёньня.

7 сьнежня 1945 году

Пра роўнасьць

Я — дэмакрат, бо веру ў грэхападзеньне. Зазвычай, дэмакратамі бываюць зь іншай прычыны — Русо, прыкладам, верыў, што людзі мудрыя й добрыя дый таму маюць права ўладарыць. Нябяспека ў тым, што гэта — няпраўда. Адразу, як пра гэта здагадваюцца, надыходзіць час ганіць дэмакратыю. Мне няма патрэбы здагадвацца, я папросту ведаю сябе, бо я ня маю права ўладарыць і ў куратніку. Адзінае апраўданьне дэмакратыі —тое, што мы — грэшныя стварэньні, і чалавеку не выпадае даваць уладу над іншымі людзьмі. Арыстотэль лічыў, што некаторыя вартыя быць адно нявольнікамі. Цалкам можа быць. Але ніхто ня варты быць гаспадаром.

Нас не таму вучылі. Я маю думку, што роўнасьць наўрад ці цнота сама па сабе, як радасьць або мудрасьць. Яна хутчэй, нібы тыя лекі, патрэбныя, бо мы хворыя, або, як вопратка, патрэбная, бо мы страцілі чысьціню. Таксама я ня маю пэўнасьці, што даўнейшая ўлада караля, сьвятара, бацькі ці мужыка або даўнейшае падпарадкаваньне падданых, парафіянаў, дзяцей або жонкі самі па сабе благія. Мабыць, яны былі добрыя, як была добрая нагата. Але я рады, што іх болей няма, бо імі злоўжывалі — і псаваліся. Аднаўляючы іх, мы зробім тую ж памылку, што й нудысты. Юрыдычная ды эканамічная роўнасьць —надзвычай патрэбная рэч. Яна папраўляе наступствы першароднага граху, баронячы нас ад жорсткасьці.

Але ж роўнасьць, як і лекі, ня добрая сама сабою. Адной роўнасьці замала, таму яе абарона гэткая нетрывалая. Мы намагаемся знайсьці радасьць у тым, што толькі адмоўна азначаем «добрае жыцьцё». Вось людзей і вабіць абы-якая няроўнасьць, ад стужак аб прыдворным жыцьці ажно да нацызму. Спакушальнік выкарыстоўвае сапраўдную слабасьць нашае сыстэмы вартасьцяў, прапануючы акурат тое, чаго нам нестае.

Калі роўнасьць маюць за ідэал, а не за лекі, усё болей людзей пачынае ненавідзець абыякую перавагу. Гэта — хвароба дэмакратыі, як жорсткасьць і нявольніцтва — хваробы ерархічных грамадзтваў. Калі яе ня вылечыць, не спыніць, яна заб'е нас. Чалавек, які ня можа ані вольна падпарадкавацца, ані з годнасьцяй прымаць загады, дурны й грубы. Але нельга аднаўляць няроўнасьць паводле закону, вонкавую. Яе месца — усярэдзіне.

Пасьля грэхападзеньня мы мусім насіць вопратку, але Мільтан назваў яе «цяжарам», бо пад ёй — жывое й добрае цела. У належным месцы ды ў належны час яго можна пабачыць — у лекара, у шлюбным ложку, на мужчынскам пляжы, дзе шматлюднасьці таварышыць прыватнасьць. Так і тут — пад абалонкай закону мы захоўваем увесь лад, увесь строй жывых і добрых адрозьненьняў. Сьвятар — не начальнік, але мы яго слухаемся. Бацька або настаўнік ня могуць нас зьняволіць, але мы мусім ім падпарадкавацца. Добра, калі гэта ёсьць у шлюбе.

Спынюся крыху й скажу: мужчыны так злоўжываюць уладаю, што роўнасьць зрабілася для жанчыны ідэалам, але ж гэта вельмі небясьпечна. Наомі Мітчысан зразумела ў чым справа, калі напісала, што роўнасьць патрэбная ў законе пра шлюб, але ў самім шлюбе няроўнасьць патрэбная, як яна кажа, «дзеля эротыкі». Паводле ейных словаў, ёсьць жанчыны, якія не выносяць, калі мужык іх абдымае. Так выглядае трагікамэдыя сучаснай жонкі — Фройд навучыў яе, што злучэнне найважнейшая ў сьвеце рэч, ды фэмінізм не дазваляе «ахвяраваць сябе».

Справа ў тым, што ўсе віды любові мы атаесамляем зь сяброўствам. Яно ж бяз роўнасьці немагчымае. Сябры бавяць час разам — малююць, разважаюць, моляцца, глядзяць у той самы бок. Закаханыя ж глядзяць адно на аднаго, г.зн. у розныя бакі.

Мы, брытанцы, мусім цешыцца, што пры досыць нармальнай дэмакратыі мы захавалі рытуалы манархіі. У самай сярэдзіне жыцьця нам увесь час нагадваюць, што лекі — ня ежа. Вось чаму стаўленьне да каралеўскае ўлады — гэта выпрабаваньне, тэст. «Выкрываць» яе найлягчэйшая ў сьвеце рэч, але ж зірніце на абвінаваўцаў. Гэта — акурат тыя людзі, якія цалкам страцілі рай (той, першы); якія ня чуюць сьпеваў у сфэрах, ня бачаць іхнага танцу. Для іх роўны рад цэглы лепшы за скляпеньне. Але ж як бы яны ня прагнулі роўнасьці без дамешку, яны яе не дастануць. Калі забараняюць шанаваць караля, тады пачынаюць шанаваць багатыра, спартоўца, акторку, ды ўрэшце —прастытутку й гангстэра. Дух, як і цела, вымагае свайго. Не дасі яму ежы, будзе жывіцца атрутай.

Вось чаму гэта мае значэньне. Дух, які родзіць сьцьверджаньне: «Я ня горшы за цябе», — недапушчальны, яму трэба ставіць адпор, як бюракратыі або прывілеям. Адно ўнутраная ерархія абароніць вонкавую роўнасьць. Рамантычная атака на дэмакратыю ўжо пачалася, і мы ня здолеем даць ёй адпор, калі ня будзем ведаць усё, што ведае супернік, але тлумачыць гэта лепей за яго. Людзі не стрываюць роўнасьці, перанесенай з палітыкі ў прыватнае жыцьцё. Апранемся ж у яе, але не забудемся распрануцца ў сваім пакоі.

27 жніўня 1943 году

Пераклаў з ангельскай Уладзімер Маруцік

Цёмна. Ніякіх перашкодаў. Суцэльная пяшчота й цеплыня. Рух. Імпульсы. Штуршкі. Сьвятло жоўтае, мяккае, васковае. Такое сьвятло можна намаляваць алейнымі фарбамі на ільняным палатне. Так тады і пахла: ільняным палатном, печчу і чыстацелам. У начоўках на сподзе ляжала мяккая, тоўстая, ружовая пялюшка. Над ёю курэла духмяная пара. Мяне загарнулі таксама ў пялюшку, але ў тоненькую, белую. Мяне купалі ў пялюшцы. Маці Ніна і баба Ядзя лілі з прыгаршчаў мне на грудзі ваду й прыгаворвалі: «А-ці-ці». Я разяваў рот, дзе не было ніводнага зуба. Яны ўсьміхаліся й казалі: «Ён сьмяецца. Яму добра. А-ці-ці...»

Ваду люблю моцна, як маці, як дачку, як жыцьцё. Адным падабаецца лес, з палахлівай таемнасьцю, другія адпачываюць душою толькі ў гарах, а я знаходжу спакой у назіраньні за хвалямі, за бясконцымі пералівамі сонца ў вадзе. Я — чалавек вады. І з усіх чатырох стыхіяў не адмаўляю ніводнай. Вогнішча зачароўвае, шум ветру лепшы за музыку, а зямля кліча ў бясконцыя вандроўкі. Але я — істота неўраўнаважанай плыўкай вады. Паміж параю і лёдам плыве чалавечы час. І ня зьведаны першакрыніцы, і невядомыя сыходы. Навідавоку адно плыні, віры, вадаспады...

У зманлівую, крынічную, зеленкаватую рэчку Рудзіцу я, трохгадовы, і зайшоў з напаленага жнівеньскім сонцам пяшчанага пляжу. У ледзяной вадзе схапіў жывот. Скурчыўшыся, я выпаўз на бераг і лёг на траву. Калені падціснуў да падбародзьдзя, так крышку меней балела, торгала і рэзала ўсярэдзіне. Выпрастацца так і ня змог, сядзеў крукам у бацькі Чэся на руках, пакуль той подбегам нёс мяне ў местачковую бальніцу. У прахалодзе пустой палаты доктар Гладкі загадаў прамываць страўнік і кішэчнік. Вада заходзіла ў вантробы й выходзіла зь іх, а медсястра зноў і зноў напампоўвала мяне нясмачнай, пустой, доктарскай вадою. Жывот адпусьціла пасьля клізмы. Прамытага, змэнчанага, вылекаванага мяне вывелі за бальнічную браму да бацькоў.

Выпадак на Рудзіцы хутка сплыў у нейкі цёмны куток памяці, я зноўку лез купацца ў любую лужыну, дзе вады было хоць крышку вышэй за мае парэпаныя калені. Я плаваў у бурштынавай канаве Захаравага балота, у Дзягілёнскіх крэйдавых кар'ерах, у той жа Рудзіцы і на Менскім моры. Купальныя сэзоны ў першыя школьныя гады я адкрываў рана: або на Вялікдзень, калі той прыпадаў на апошнюю нядзелю красавіка, або на сьвята працоўных —Першамай. Меўся й знаёмец, зь якім нічога не аб'ядноўвала, акрамя вясновых купаньняў. Звалі яго Кастусь. Мы ехалі на роварах на койданаўскае возера, што ляжала за бальніцаю, распраналіся дагала і з крыкамі ўскоквалі ў вогненна-ледзяную вадкасьць. Рукі й ногі сутаргава секлі ваду некалькі імгненьняў. На пляж мы выляталі сінія з шалёнай дрыготкаю ва ўсім целе. Каб сагрэцца, лёталі па беразе з вар'яцкімі гігіканьнямі. Мы не саромеліся ні аголенасьці, ні крыкаў, ні чужога варожага вока. Мы належалі прыродзе цалкам. Нагойсаўшыся да поту й ружовых шчокаў, мы закусвалі прысмакамі са сьвяточнага стала: калі на Вялікдзень дык чырвонымі яйкамі, а на Першамай — паляндвіцаю з хлебам і цыбуляю. Рабаціністы Кастусь выпаў з майго жыцьця раптоўна. Памерла баба Ядзя, я перастаў езьдзіць у Койданава на сьвяты, і купальныя сэзоны пачыналіся ў іншых месцах і зь іншымі хлопцамі, а пазьней і зь дзяўчатамі.

Аднойчы вада ледзь не забрала маё жыцьцё. Здарылася тое ў мястэчку Раўбічы, дзе цяпер стаіць спартовы комплекс з трамплінамі для скачкоў на лыжах. Мне было пяць, я хадзіў у старэйшую групу дзіцячага садка, які штолета вывозілі ў Раўбічы і сялілі ў драўлянай аднапавярховай школе. Лета выпала дажджыстае. У старой школе было няўтульна і золка. Я нэньдзіўся, сумаваў і чакаў бацькоў. І яны прыехалі, бацька Чэсь у васільковай футболцы і маці Ніна ў квяцістай сукенцы без рукавоў. Неўспадзеў выплыла з-за пухкіх аблокаў сонца, высокае й срабрыстае. Якраз пад такім сонцам адпачыньнікі хадзілі на раўбіцкае возера купацца. Толькі гэта зусім ня тое возера, што сёньня ляжыць за спартовым комплексам. Тое азярцо было меншае. Яго, праўда, як толькі пачалася будоўля спартовых пляцовак, спусьцілі тамтэйшыя сяляне. Улады забаранілі трымаць каровы, бо пасьвішчы пайшлі пад стадыёны. Мужчыны згаварыліся і ўначы пабурылі дамбу. Возера сыйшло. Паўстала поле, на якім некалькі гадоў папасьвіліся статкі, пакуль і яго не перабудавалі ў стрэльбішча. Цяпер раўбіцкія каровы ходзяць уздоўж новага вялікага возера, абапал якога загараюць менскія хлопцы зь дзяўчатамі.

Такія самыя дзецюкі з маладзіцамі сядзелі тады пад сумнай вярбою. Маці баялася спаліць плечы і хавалася ў цень. Бацька, стоячы на сонцы, курыў папяросу. Я разломваў і разглядаў ракаўкі-пярловіцы. Разламаць ракаўку даволі цяжка, але якая насалода паслухаць піск пярловіцы.

Навучыў мяне слухаць той піск адзін зь дзецюкоў — Алік, які піў віно пад нахілёнай вярбою. Алік і прапанаваў паплаваць з гумовым колам. Якое было кола! Ружовабокі, пругкі, з жоўтым шнурочкам. Адмовіцца ад спакусы я ня змог. Як лёгка мне паплылося на моцна напампаваным, рыпучым пад пальцамі выратавальным коле! Я лунаў па вазёрнай паверхні паміж небам і зямлёю. Раптам пругкае кола уздыхнула, засіпела па-зьмяінаму і ператварылася ў пляскатыя

Адам Глёбус

Шкляянка вады

Апавяданьне пра пачуцьцё роднаснай блізкасьці

лахманы. Апошняе, што я пачуў – гэты ціхі хлапок адной далоні. Краявід зьнік. Вочы заслала вада. Экран жыцьця згас. Цела плаўна пайшло на дно. Вада залілася ў грудзі. Утануў і нават не ўсьвядоміў, што ўтануў. Сасьлізнуў у вазёрныя нетры і аціх на плаўкім глеі. Напэўна я быў бы вельмі прыгожы нябожчык: маленькі, белагаловы, чысты. О, як плакалі б няўцешныя бацькі над вузенькай труною. Не знайшлі б суцяшэньня.

Але вір лёсу крутануў мяне ў адваротны бок. Бацька Чэсь заўважыў зь берага, як зьнік пад вадою яго, тады яшчэ адзіны, а таму любімы сын Валодзя. Бацька любіў курыць, гэта кепска, але ён любіў курыць стоячы. Ён курыў адну папяросу за другой, а таму і ўбачыў, як сын прапаў. Сычэньня й сьвісту круга ён ня чуў. Ён зафіксаваў само імклівае зьнікненьне і кінуўся ў возера, знайшоў нежывога сына на мяккім глеі, выцягнуў на прыбярэжную вярбу, адкачаў.

Вазёрная вада выйшла зь лёгкіх, жыцьцё вярнулася. Я прахапіўся, заплакаў. Мяне захліснуў страх за пашкоджанае кола, якое няма як аддаць п'яному Алеку. Бацька Чэсь паўсьміхаўся зь недарэчных страхаў і гаспадар выратавальнага кола таксама. Толькі маці не разьвесялілася, яна ўсё распытвала ў бацькі Чэся, як ён заўважыў, што я тану. Бацька сам ня ведаў. У бацькі Чэся заўсёды было адчуваньне прысутнай сьмерці. Ён чуў яе водар. Калі мой малодшы брат Міраслаў у свае два гады, забаўляючыся з дробнымі грашыма, выпадкова глынуў дзесяць савецкіх капеек, манэта пайшла ў дыхальнае горла й закаркавала лёгкія. Брат пачаў сінець. Ні я, ні маці не здагадаліся, з-за чаго. Маці закрычала. З кабінэта ў залю прыляцеў бацька. Схапіў свайго малодшага, а таму любімага, сына за ногі й вытрас манэтку з асьцюкаватым гербам СССР. Міраслаў плакаў і твар яго блішчэў ад сьлёз і сьліны. У мяне няма выратавальнага бацькавага інстынкту, але спадзяюся, – зьявіцца. Не адразу. Галоўнае, седзячы з вудаю на беразе рэчкі, не спадзявацца, што зловіш марскога вожыка. Толькі віры жыцьця непрадказальныя. Таму стукаю па дрэве перад тым, як сказаць: пасьля Раўбічаў я болей не тануў. Наадварот, я ўсімі сіламі вучыўся добра плаваць.

У маю семдзесят трэцюю школу завіталі трэнэры з палаца воднага спорту, які збудаваўся ў Менску побач з батанічным садам. Раней непадалёк стаяў адкрыты летні басэйн, куды бацька Чэсь прыводзіў мяне палюбавацца на скачкі ў ваду. Мы ўздымаліся на трыбуну, сядалі на драўляную лаву й назіралі за нырцамі, якія выпісвалі разнастайныя фігуры ў паветры й боўталіся ў сіняватую ваду.

У свае трыццаць тры я, пэўна ж, апошні раз з уласнага жаданьня скокнуў з трохмэтровага трампліну ў басэйн. Я плаваў, а дзеці скакалі з ганарыстай вышкі. Захацелася скокнуць. Узьлез па халоднай лесьвіцы, падыйшоў да краю і зрабіў крок у паветра. Я ўпаў васьмідзесяцікіляграмовым салдатам у басэйн Дома афіцэраў. Рукі трымаў па швох. Ногі былі разам. Да дна дайшоў спакойна. Згрупаваўся. Адштурхнуўся ад кафлі. Выплыў. Аддыхаўся і адчуў: скакаць болей нельга. Скачок прайшоў нармальна, калі не лічыць ледзь заўважнага зруху, што адбыўся ў вэстыбулярным апараце. Вось сымэтрыі майго цела скранулася, мяне павяло, пацягнула, паклікала да той цёмнай ракі, па якой плавае адзін толькі човен сьмерці. Перадаць той стан немагчыма, увесь час натыкаесься на таямнічае слова «нешта». Гэта як адзін раз кранеш языком настылую на марозе жалязяку і болей ня робіш, так і тут – скокнуў, жывы і больш ня хочаш. Хіба што скінуць, як скідаў маіх аднагодкаў-трэцяклясьнікаў трэнэр Анатоль у палацы воднага спорту.

Пасьля таго, як мяне залічылі ў групу навучаньня плаваньню, і я адзаймаўся тры месяцы, адбыліся паказальныя выступы. Кожны з навучэнцаў мусіў праплыць пяцьдзясят мэтраў і скокнуць. Хлопцы пабойваліся. Тады Анатоль узьлез на вышку і паскідаў баязьліўцаў. Самае неверагоднае ў той сытуацыі, калі зірнуць сёньняшнім вокам, гэта рэакцыя бацькоў. Яны спакойна глядзелі, як трэнэр скідвае іхніх сыноў. Растлумачыць такое можна тым, што ў СССР было спартанскае выхаваньне. Наогул папулярнасьць рымскага паўстанца Спартака і грэцкага горада Спарты была наймагутнейшая, і таму ўсе прымалі на «ўра» зьнішчэньне слабых і хворых дзяцей спартанскімі воінамі і кіданьне ўласных нашчадкаў зь пяцімэтровай вышыні ў дзесяцімэтровую глыбіню.

Анатоль зрабіў паказальную справаздачу. Вы заплацілі грошы, а я навучыў вашых сыноў плаваць, скакаць з вышкі. Напрыканцы паказальных выступаў тром асабліва здатным навучэнцам трэнэр уручыў бясплатныя прапускі ў палац. З таго дня пачалося маё кароткае жыцьцё сапраўднага спартоўца. Я наведваў басэйн ажно чатыры разы на тыдзень, а ў часы вакацыяў – кожны дзень. Трэнэр выхоўваў зь мяне брасіста

і, можа, выхаваў бы, але бацька Чэсь атрымаў ордэр на новую кватэру. Сям'я перабралася ў іншы раён, да Кальварыйскіх могілак, за тым часам – край Менску. Езьдзіць у палац было нязручна: гадзіна туды – гадзіна сюды. Бывала, я засынаў у тралейбусе, і кіроўца будзіў мяне на канцавым прыпынку. Брасістам ня стаў, але ў сваё задавальненьне разы два на тыдзень праплываю кілямэтар выключна па-жабінаму.

Пад вадою мне падабаецца плысьці брасам. Ціха рухацца каля самага дна. Толькі на глыбіню, нават трох-чатырохмэтровую, я не заплываю. Узрост і пол. Жанчыны ўтрая больш прыдатныя для плаваньня на глыбіні, а мужчыны добра ныраюць толькі ў маладосьці. Я сваё аднераў напоўніцу. У школе я быў дробны, стаяў у клясе трэці-чацьверты з канца. І таму нядзіўна, што, седзячы на хваляломе ў горадзе Сочы, змог падбіць дарослага мужчыну на небясьпечную спрэчку. Той мужчына быў цынікам і садыстам. Ён прыйшоў на хвалялом, дзе загаралі мае аднагодкі, і прапанаваў гульню. Ён кідаў у ваду манэтку і лічыў да кошту манэткі, а мы скакалі ў мора, пачуўшы апошнюю лічбу. Такім чынам ён давёў гульню да жалезнага рубля, які, вядома ж, лёг на дно. Глыбіня была мэтраў дванаццаць. Я лёгка даплыў да ёдыста-зеленкаватых, парослых водарасьцямі камянёў, але рубля не знайшоў. Давялося ныраць разоў зь пяць, пакуль адшукалася манэта з добрым мечаносцам, які трымаў на руках выратаваную нямецкую дзяўчынку.

Мужчына пашкадаваў грошы, але й адбіраць рубель на людным пляжы не наважваўся. Ён лёгка пагадзіўся на маю прапанову: дастае з дна камень, а я неадкладна вяртаю грошы. Садыст нырнуў і прапаў. Я не на жарт перапужаўся. А калі хлопцы былі гатовыя клікаць дапамогу, маўляў, чалавек патануў; ён вынырнуў на паверхню. Лепей бы патануў, падумалася мне, калі над вадою ўзьняўся белы, перакрыўлены пакутаю твар з чырвонымі рагамі крыві, якая цякла з вушэй і носа. Спрэчку я выйграў, ніякага каменя мужчына не падняў. Грошы засталіся ў мяне. Дні тры давялося пахадзіць на іншы пляж, але гэта неістотна. Проста зерне парады, дадзенай трэнэрам пры выпадковай сустрэчы, што ня варта пасьля дваццаці гадоў глыбока занырваць, упала не на камень. Варта згадаць скрываўлены твар кідальніка манэтак, і жаданьне быць падводнікам зьнікае. Хоць ныраецца мне лёгка і дагэтуль.

Здатнасьцямі нырца я аднойчы зьдзівіў настаўніцу фізкультуры маёй чарговай дзявятай школы. Здаваліся нарматывы ГПА (гатовы да працы й абароны). Я з хлопцамі скокнуў ў басэйн пэдагагічнага інстытуту, каб праплыць адвольным стылем стомэтроўку. У аднаклясьніка Міхася зьявіцелі плаўкі. Пакуль той ачомаўся, плаўкі леглі на дно. Міхась сядзеў у кутку басэйна й плакаў. Настаўніца ня ведала, што рабіць. Бо Міхасёвы плаўкі ляжалі пад дзесяцімэтровай вышкаю на такой самай глыбіні. Бязь лішніх тлумачэньняў я дастаў плаўкі. Настаўніца Люцыянаўна (Рэвалюцыя Янаўна) узрадавалася больш за Міхася і прапанавала выступаць за зборную школы. За гонар школы я гуляў ў баскетбол, у валейбол, у настольны тэніс, нават бегаў на доўгую дыстанцыю, адзінае чаго не удалося –гэта праплыць на хоць бы якіх дробных спаборніцтвах, каб замацаваць свой трэці, а можа й другі юнацкі разрад у плаваньні. Зрэшты, не бяды. Ну няма пасьведчаньня пра ўменьне трымацца на паверхні, затое ёсьць шмат іншых.

Чалавека мераюць па-рознаму. Можна паглядзець у пашпарт, пагартаць дыплёмы й атэстаты, вывучыць працоўную кніжку, даведацца пра рахункі ў банку і пра здатнасьці зарабляць, а тым самым памераць яго грашыма. Яшчэ можна замераць чалавечую здатнасьць стравaваць ежу і выпіваць пэўную колькасьць алькагольных напояў. І ў дадатак паразважаць пра жывую і мёртвую ваду. Маўляў, алькагольны напой – жывы, пакінь у адкаркаваным посудзе, і ён выхаецца і загіне, памрэ, стане мёртвы. А вось крынічная вада доўга стаіць у срэбным келіху, бо нежывая. А можна ўсё перавярнуць і назваць крынічную ваду жывою, а гарэлку – мёртвай. Асабіста мне даспадобы апошні. Самая жывая вада стаіць у шклянцы на начным століку, каля ложка. Прачынаесься, п'еш жывую ваду й засынаеш, ведаючы –сон жахаў не паўторыцца. Чалавека трэба мераць вадою і ягонымі здатнасьцямі плыць. Неістотна, якім стылем ён плыве, галоўнае – сам рух у магме жыватворнай субстанцыі. Раней, у дваццаць сем я хацеў, каб пасьля маёй крэмацыі попел разьвеялі на радзіме, за мястэчкам Койданава, дзе-небудзь у лесе. А цяпер бачыцца іншае. Хай жменька праху будзе перасыпана ў драўляную талерачку і паплыве па хвалях ручая, які застаўся ад ушчэнт змэліяраванай, абмялелай рэчкі Рудзіцы. Хай маё плаваньне працягнецца на два імгненьні пасьля сьмерці. Зямля да зямлі, прах да праху, а мая душа імкнецца да вады.

У вадзе няма смутку. Нават у мёртвай, вогненнай, алькагольнай вадкасьці смутку нямашака. Увесь смутак пакінулі сабе вецер, агонь і зямля. Можа, таму я выбраў ваду.

Я любіў ляжаць уначы каля рэчкі Ятранкі, якая цячэ празь дзедаву Варакомшчыну, праз нашу зямлю. Варакомскія хлопцы раскладалі на беразе вогнішча й гулялі ў карты. Рэзаліся ў «дурня», у «тысячу», у «кінга», у «дурня пераводнага». Мы гулялі, а ў чарнаце няспынна плыла, вуркатала, шаптала вада. А самы інтымны момант наставаў у канцы гульні. Хлопцы станавіліся вакол прытаптанага кастрышча й гасілі яго. Пасьля чаго разыходзіліся ў розныя бакі, каб сабрацца ўранку й будаваць грэблю.

Ятранка рэчка плыткая, пяройдзеш і пуп не замочыш. А каб пакупацца, паплаваць, паскакаць, штогод у чэрвені варакомцы будавалі грэблю. У пясок заганяліся сасновыя жэрдкі. Гадзінамі хлопцы стаялі ў вадзе й вінтавымі рухамі ўкручвалі тыя жэрдкі ў дно. Настаўляўшы жэрдак клінам па плыні ў два шнуры, іх перапляталі лазовымі дубцамі. Паміж сплеценымі загарадкамі накладаўся й утрамбоўваўся дзёран. Берагі сыходзіліся. Плынь рабілася разоў у пяць вузейшая, шпарчэйшая і мыла дно. Празь дзень-два вёска мела купальню. Там кожны спрабаваў плыць супраць плыні, кожны даваў ныра, скакаў, дзеразаваў, весяліўся... І нарэшце, кожны са шкадобаю глядзеў, як пасьлянавальнічная вада курочыць і змывае грэблю. Такая вада ледзь не забрала майго бацьку Чэся і зрабіла непрыемнасьць мне.

Другі дзень ліў дождж. Сядзець у дзедавай хаце надакучыла. Пайшоў да Ятранкі. Вада ўзьнялася, жоўта-тлустая, шумела роўная зь берагамі. Я ступіў на кладку ў адно бервяно. Пасунуўся, трымаючыся за сталёвы дрот, нацягнуты замест парэнчы. На сярэдзіне сьлізкага, як мянтуз, бервяна мне стрэліла ў голаў разьвярнуцца і пайсьці дамоў. Так і зрабіў. Раўнавага згубілася. Я колькі імгненьняў павісеў, налягаючы на дрот, і боўтнуўся ў мутную ваду. Плысьці ў фуфайцы і ботах цяжкавата, але не настолькі, каб забыцца пра прыкрасьць і злосьць на самога сябе. Седзячы каля гарачай грубкі, я ўсё ніяк ня мог супакоіцца, бо да ўсіх непрыемных адчуваньняў дадалося асноўнае з горшых, я называю яго пачуцьцём сьцюдзёнай вады, адчужанасьцю. Яно зьяўляецца раптоўнай шэраньню на душы, а розум залівае ўсьведамленьне, што ты – чужы й непатрэбны сьвету. Паціху той адчужанасьці можна пазбыцца, прытуліўшыся сьпінаю да напаленай грубкі. Толькі пройдзе яно не раптоўна, як зьявілася, а павольна, як сыходзіць хвароба. Перад вачыма будуць зьяўляцца і зьнікаць іншыя сытуацыі, у якіх трапляў у падобны стан.

Першы раз адчужанасьць наведалася ў маю душу на гасьціннай печы ў дзядзькі Івана, мужа сястры айчыма маёй мамы Ніны. А трапіў я на добразычлівую печ, ідучы з Захаравага балота, дзе з койданаўскімі хлопцамі гуляў у шайбу. Мы штодня на зімовых вакацыях лёталі на каньках і ганялі гумовы дыск. Але тэрмін гульні вымяраўся не пэрыядамі і гадзінамі, а іншым чынам. Меншыя гулялі да той пары, пакуль не прыходзілі большыя. Яны нас не ганялі й ня білі, яны прасілі сыйсьці з балота. Малодшыя паважаюць старэйшых, таму саступаюць, сыходзяць. Але прыкрасьць застаецца. Прыкрасьць і пералілася ў жаданьне прасячы за брамаю палонку.

Хакейныя брамы былі вельмі ўмоўныя – па два слупкі з кожнага канца поля. Там і прадзяўблася палонка. І можна было б сказаць, што ні сабе, ні людзям, каб Кастусь, мой таварыш па вясновых купаньнях, ня вынайшаў шайбу, якая ня тоне: бляшаначка з-пад ваксы, схопленая ўсярэдзіне балтом. Мы ганялі незвычайную шайбу, пакуль я не ўляцеў у помсьлівую палонку. Дзякуй Богу, вады аказалася па пахі. Хлопцы падалі клюшкі. Я ўчапіўся. Мяне выцягнулі. Ісьці мокрым у хату бабы Ядзі не хацелася. Насварылася б, як піць даць, накрычала б, было за што. І я завярнуў да Івана. Той дазволіў разьвесіць апранахі вакол печы і сядзець грэцца. Сярод паху сухіх шпалераў, на рускай печы зьявілася ўва мне пачуцьцё адчужанасьці. Наплыў сум. Я адчуў адзінотнасьць, сваю завершанасьць і нікчэмнасьць. У дзяцінстве выблытацца з такіх настрояў прасьцей, я загаварыў да Івана, той адказаў, пачаў распытваць пра палонку, засьмяяўся, маўляў, не капай яміну для іншага, сам увалісься. Страхі мінулі, выпарыліся ў гарачым паветры. Тады сагрэўся хутка. З узростам адчужанасьць прыходзіць часьцей, а пазбыцца яе цяжка. Ведаю, варта зьмірыцца і не магу. Шукаю сілы плысьці супраць плыні. Плаваньне насуперак плыням грэе не толькі цела, але і душу. Ясьней яснага, ідучы насуперак – рызыкуеш. Трэба рызыкаваць. Трэба вучыцца не баяцца перашкодаў, і я вучуся і нават вучыў іншых. Калі іншых вучыш, хутчэй вучысься сам.

Вучыў хлопчыка Андрэя маляваць алоўкам і акварэляй. Было тое ў гарадку Мсьціслаўі. Я працаваў рэстаўратарам у касьцёле. Туды, у сабор Усьпеньня Дзевы Марыі й завітала Андрэева маці, Рэгіна. Яна ўгаварыла майго брыгадзіра Юру дапамагчы з падрыхтоўкаю ў мастацкую вучэльню. Андрэй хацеў апрацоўваць камень, рабіць помнікі. Юра перадаручыў хлопца мне. Я старанна вучыў Андрэя выяўленчай абэвэзе, распавядаў пра пэрспэктыву, пра халодныя й цёплыя фарбы, пра лёгкую празрыстасьць акварэлі на белай паперы. Андрэй быў старанны вучань, выконваў заданьні й даручэньні, добра разумеў сказанае і, разам з тым, заставаўся лялечным, драўляным. Ён здаў іспыты на крэпкія чацьверкі й прайшоў на скульптурнае аддзяленьне. Удзячная Рэгіна прынесла ў касьцёл два дзясяткі яек, кавалак сала й кошык яблыкаў. Юра сказаў, што можна ганарыцца вучнем. Я пагадзіўся, але не забыў адзначыць Андрэеву драўлянасьць. Брыгадзір заўважыў, што рука ў Андрэя цяжкая, жалезная, такая і павінна быць у апрацоўшчыка камянёў. З драўлянасьцю свайго першага вучня я абмыліўся, меў рацыю вопытны Юра. Андрэй утануў. Праз год, на самым пачатку лета ён купаўся ў Бабруйску ў рэчцы і ўтапіўся. Рэгіна хадзіла па Мсьціслаўлі адчужаная, нікога не пазнавала. Мне здавалася, што забітая горам кабета знарок не вітаецца, бачыць ува мне вінаватага. Каб ня я, Андрэй не паступіў бы ў вучэльню, ня зьехаў і адпаведна не ўтануў. Я вінаваціў сябе. Вырашыў: ніколі нікога не вучыць. Пазьней зразумеў глупства такіх рашэньняў, калі адказнасьць за трагічны лёс чалавека нехта выпадковы бярэ на сябе. Таму спакойна выкладаў асновы кампазыцыі ў клюбе самадзейных мастакоў, і вучыў школьнікаў арыентавацца ў літаратуры. Незагойных ранаў не бывае.

Усю маладосьць я празаймаўся жывапісам і маляваньнем, прашукаў ідэалаў у краявідах і не знайшоў. Ці то занадта зялёнымі былі дрэвы, ці вельмі ярка сьвяціла сонца, ці вада ў возеры не дастаткова сіняй здавалася. Я штодня намочваў аркуш паперы, налеплівaў яго на кавалак тоўстага шкла й маляваў пяром з тушшу дый пэндзлем з акварэляй. Калі малюнак не задавальняў, я змываў яго губкай і пачынаў наноў. Стосы малюнкаў расьлі, а ідэал аддаляўся ў асмужаную невядомасьць. Я маляваў рэчы, целы, дзіркі паміж рэчамі й целамі, я ўрэшце пачаў маляваць амаль дасканалыя геамэтрычныя фігуры, якія прайшлі празь вялікае нішто й склаліся ў літары й пацяклі – радок за радком. Я стаў літаратарам.

Аднойчы, калі і ў галаве не было шукаць ідэальны краявід, ён знайшоўся сам сабою. Я сядзеў на беразе Менскага вадасховішча й піў вінаграднае віно з рыльца доўгай французскай бутэлькі. Піў віно і глядзеў на роўную плоскасьць вады і стужку лесу за вадою. На бяздумнае неба я пазіраў разьняволеным вокам падвыпіўшага адпачыньніка. Алькаголь скончыўся. Віно мае прыкрую завядзёнку сканчацца. Толькі пачынаеш адчуваць сонечны смак вінаграду, а яно сканчаецца. Я узяў бутэльку за рыльца й зашпурнуў у краявід. Яна ўпала, пусьціла кругі і стала ў вадзе. Я сядзеў на камені і пазіраў на сумны ляндшафт і разумеў, што дарэмна шукаў карціннасьці ў прыродзе. Гармонія тоіцца ў суадносінах паміж табою і навакольлем. Калі знаходзіцца раўнавага, ты робісься шчасьлівы, і выгляд нявыхаванага вадасховішча выклікае радасьць. Ня варта сьмяяцца з парожняй бутэлькі. Чалавек – пусты мяшэчак з-пад радасьцяў і пакут.

Да плаваньня я займаўся фігурным катаньнем. Быў адзіным хлопчыкам сярод адзінаццаці дзяўчынак. Маці Ніна падарыла мне чорныя канькі. Дзяўчаты мелі белыя. І калі на адзін бок Батанічнага саду стаяў басэйн, дык на другі бок ляжаў каток. Я мог зрабіць «ластаўку» і «пісталецік», мог вельмі хутка езьдзіць і ўзад і ўперад. Але ня мог аднаго: палюбіць лёд. Ня стаў я любімым вучнем у царстве вечнай нерухомай прыгажосьці, дзе пануе Сьнежная Каралева і стаіць ледзяное японскае пекла. Я зь дзяцінства быў чалавекам вады. Зразумела, лёд родны вадзе, і з кожнага басэйна можна зрабіць каток. Я доўга разганяўся на каньках, каб ускочыць у басэйн. І ўкрочыў, і паплыў, і плыву дагэтуль. Прыходжу ў басэйн заводу «Далягляд», распранаюся, падаю ў блакітную прахалоду й плыву ў плойме сонечных бліцаў. Выбіраю дні й гадзіны, калі найменш людзей. Люблю плаваць пасярэдзіне басэйна. Але не прымаю знарочыстай раскошы, бо зьнікае эратычны момант выпадковага флірту, знаёмства, кантакту. Займацца каханьнем у басэйне нязручна. Досьвед паказвае, што плаваньне – занятак самотных асобаў.

Аднаго разу я праплаваў з любімай дзяўчынаю Тамарай больш за дзьве гадзіны ў халодным возеры на Браслаўшчыне. І ўрэшце мы прытуліліся адно да аднаго, каб сагрэцца, на астатняе не ставала сілы.

Вада змывае стому, але забірае жаданьні. У тых самых Раўбічах, дзе ледзь не разьвітаўся з жыцьцём, ўжо студэнтам я лавіў ракаў. З аднакурсьнікам Алесем лазіў пад карчы і выцягваў з-пад каранёў гаспадароў рэчкі. Налавілася ракаў, можа, з паўвядра. Расклалася вогнішча, выпілася па бутэльцы чарнасмародзінавага віна. Мы заснулі. Варыць ракаў не было сілы. Вада забрала моц, натуральна.

Адносіны паміж людзьмі, зрэшты, вымяраюцца вадою. Найгоршы чалавек той, хто хвораму не падасьць шклянку вады.

Менск, 1996 год.

Прыватнасьці

Дзёньнік без канца

Ганна Матусэвіч

22.08. Кажуць, што шлях да сэрца мужчыны пралягае церазь ягоны страўнік. У такім разе гэты мужчына прыпадабняецца да адной вядомай жывёлы, а над ягонай рабыняй, як дамоклавы меч, вісіць штодзённы страх ежы.

23.08. — Слышь, сеструха, а у тебя сильно выражено «эманцыпэ».

— А што гэта такое?

— Ну, это... свободная женщина...

— Не, братка. Усё прасьцей. Вы жывяцё па прынцыпе: пакуль жывеш — усё трэба. А мне нічога ня трэба.

24.08. Прыйшоў камбайн у вёску. Нашым слаба урбанізаваным хлопцам — работа па душы. Як руплівыя пчолкі лётаюць падлеткі па бабы Эмцінай ніве. І змалацілі ячмень старой «за проста так». І грошай не ўзялі, і чаркі ня выпілі. А з другога боку гэта ж жах, горшы за вайну! У вёсках павыміралі дзяды, у лякарнях як мокрае дагараюць паслухмяныя да бабулек ды нядужыя да працы яшчэ нестарыя мужчыны-алькаголікі. І нямоглыя бабулькі мусілі ўзваліць на дзіцячыя плечыкі гэтыя ячменныя мяхі!

25.08. Прыехалі ўсёй сям'ёй да бацькі ў лякарню. Сядзім, маўчым. Гаварыць няма пра што.

26.08 ... — а гэтая дзярэўня Віцкаўшчына цяпер да Грытчына адыйшла.

— Мікола Улашчык пра яе пісаў...

— А ну яго, гэтага Ўлашчыка!

27.08. У кар'ер ля вёскі выгрузілі машыну капээсэсаўскай макулатуры — былога ідэалягічнага дапаможніка перадавых калгасьнікаў. У малых бізнэсоўцаў насьпеў салідны бізнэс. Глядзіш, і заробяць сабе не на адзін пак жуек. У нас, як і раней, усё лепшае — дзецям!

Дарэчы, пра бізнэс. У нашай маленькай вёсачцы завёўся першы бізнэсовец (барадаты фармэр з тутэйшых ня ў лік). Сапраўды, малады, багаты! Маладая сям'я купіла палову хаты. Будуць займацца вэнджаньнем мяса. За маленькія паслугі шпурляюць вяскоўцам вялікія грошы. Малыя ўрвінцы й тут урвалі свой бізнэс.

І толькі вяскоўцы, як той Хама-нявернік, аніяк не даюць веры новаму жыцьцю, што нараджаецца на іхніх вачах: «Што маладым рабіць у гэтай глухамані? Непанятна...»

28.08. Пад восень маленькая лебяда ледзь вытыркне зь зямлі, а ўжо сьпеліцца. Так і чалавек, калі настае суровая часіна, ужо змалку адчувае сваю адказнасьць перад Зямлёй. Бывае, што спрыяе гэтаму й хвароба, і галеча. І душа прачынаецца, на'т не дасягнуўшы Хрыстовага веку.

На ровары са стромкай гары лячу за дзецьмі. Віталік зь Веранікай ужо на процілеглым беразе канавы, папросту спляжанай ракі. Але я іх ужо ня бачу. Ляжу ўнізе, на сьпіне, на мне ровар. Ня ведаю, ці баліць, ня ведаю, ці страшна, адчуваю толькі, што нешта зьмянілася... Можа так прыходзіць сьмерць?

29.08. Старэйшыя браты прымусілі дурня мак перабіраць, а нас — бутэлькі мыць. Кожная бутэлька мікраскапічным зрокам праходзіць экспэртызу на чысьціню. У чэргах лаюцца, выкарыстоўваючы ў якасьці казла адпушчэньня Лукашэнку.

30.08. Як памытыя шкельцы зьзяюць ясныя чысьцюткія дзяціныя душы. Побач зь імі аджылыя душы выглядаюць жахлівымі чорнымі павукамі. Чаму так? Нашто?

Як даюць — дык бяры; як б'юць — дык уцякай. А тут, чую, даюць. Ну я й пайшла па Лукашэнкаву дапамогу дзецям да школы. Мажная чыноўніца зь вялізнай ці то ад фрызуры, ці то ад папераў галавой лінула на маю праставалосую вару: «Как деньги дают — так вы слышите, а как регистрироваться — нет! Мы объявляли, почему вы не пришли на регистрацию многодетных семей с 1 августа? А теперь вот и регистрируй вас, и документы принимай! Столько бумаг!»

Я маўчала, бо пухлагаловая дама мела рацыю і яна, відаць, хацела пабольшыць маю галаву за кошт сваёй. Гэта ж паспрабуй, аблётай усюды.

P.S. Пад час майго шмананьня ў дзьверы прасунулася была адна маладзенькая сумная галоўка бязмужняй жанчыны і ціхенька папыталася, ці даюць грошы такім, як яна, бо яе папярэдне ўжо рэгістравалі, на што мела адказ, што «денег одиноким женщинам не дают, а регистрировали ... на случай, если наш президент решит выдать им какую-то сумму».

31.08. — Божачкі-Божа! Што ж гэта такое робіцца! Бяда за бядой ідзе! Нагу апякла?

— Мама, не ўспамінайце Вы таго Божачку ці трэба, ці ня трэба.

— А як жа, дачушка, Бог любіць і крыжык дае.

Ну вось і водпуску нарэшце я дачакалася. Праўду кажуць: чалавек думае адно, а Бог дасьць другое. А можа мы аднолькава думалі? Я шалёна стамілася за лета жыць на тры сялібы, імкнучыся найперш прыўкрасіць наш Беларускі Дом, а казённы ды бацькоў ужо як прыйдзецца. Бо ўсё роўна, я там не гаспадыня. Усё лета на роварах праляталі. Яшчэ й сёньня з раніцы я марыла, што можна будзе нарэшце сесьці, уткнуцца носам у кнігу, і чытаць, думаць, адпачываць... Вось Бог і даў мне такую магчымасьць. І за ўсё дзякуй Богу. І за гэты палаючы боль у назе — таксама. (Босая наступіла на вогнішча.)

1.09. Усе падзеі накіроўвае Бог. Ад нас жа патрабуецца зусім няшмат: быць у тых падзеях людзьмі. Калі ж мы не зразумеем нечага з таго, што там падказвае Бог — тады грубая матэрыя атрымлівае штуршок у выглядзе хваробы, траўмы ці нейкага іншага ўдару.

Вось не захварэй я некалі ў Латвіі на экзэму — не вярнулася б у Беларусь. (Дома ж і сьцены памагаюць!) І Беларусь бы страціла «Воднічыху» і не прыдбала бы маленькага «Воднічка», бо мой Міколка нарадзіўся ў Беларусі, як і я ў лютым месяцы. Ягоным нараджэньнем я адкупілася ад граху забыцьця Бацькаўшчыны і Бог аднавіў на мне чыстую скуру.

Узімку мне моцна балела сьпіна, так што ўначы я магла спаць на дошцы толькі 3-4 гадзіны. (Чым ня ёг?) А тут яшчэ ўчэпістымі рукамі сьціснула маю сям'ю ня столькі безграшоўе, колькі бяспраўе. Дзеля сякога-такога вырашэньня грашовай праблемы я б можа й падалася ў дворнікі, ды таму перашкодай была мая нямоглая сьпіна. Тады ад няма чаго рабіць я па начах стала пісаць у «НН» і тым хоць неяк змагацца зь бяспраўем. Хутка я й забылася, што ў мяне ёсьць сьпіна. Усё астатняе Вы ведаеце, бо ўсё занатавана ў маіх допісах. А цяпер, падзякаваўшы Богу за ўсе мае хваробы, варта папытацца: што б рабіла Беларусь безь мяне? Пэўна б сядзела на купіне ды з жахам чакала пакуль яе праглыне Балотны Цмок. А я яе хоць на ровары ды навучыла лётаць. Танна, бэнзыну зусім ня трэба, толькі крышку фантазіі ды жаданьня.

Цяпер я мабыць зноў раблю нешта ня тое, інакш адкуль бы ўзяўся вялізны пухір на маёй правай падэшве?

2.09. Міколка, малы хітрун, расказвае мне свой сон, які бачыў, не заплюшчыўшы на'т павекаў: «Мама, я сьніў баравікі й кветкі».

— О, гэта добры сон, сынок. Баравікі — гэта маленькія хлопчыкі, а кветкі — дзяўчаткі.

Трэба зазначыць, што Міколка за лета вырас з Добрага Дамавіка ў адмысловага Лесавіка, і нюх на грыбы ў яго выдатны.

— А Лукашэнка зьбіраў грыбы і ніводнага баравіка не знайшоў, толькі адну чарвівую суравежку.

«Толькі маленькія дзеці кажуць нам чыстую праўду», — пісаў у сваіх мэмуарах Ян Пятроўскі.

Ну й куды ты павядзеш Беларусь, мой маленькі Воднічак?

3.09. І я зрабіла памылку, напісаўшы ў «НН» усьлед за дарожнікамі, як на шыльдзе: «Строчыца». Мікола Ўлашчык падае назву ў множным ліку: «Строчыцы». Гэтаксама ў нас, на Койданаўшчыне, ёсьць вёска Пажэжыны, а на дарожнай шыльдзе пазначана: Пажэжына.

Памятаю, як я, галодная, заходзіла да баптысткі, а ў яе з кухні йшоў непрыемны (для мяне) смачны сытны пах. І сьвет ледзь не заткнуўся чатырма сьценамі ейнай чысьценькай кватэры. Я пасьпела выскачыць. А сёньня ўвесь дзень сытна і сумна...

4.09. Так, усё ж для нашых бацькоў касьцёл, царква былі базысам існаваньня. Таму бальшавікі й стараліся разбурыць гэтую падставу. Але так ужо ня ёсьць для нас. Мы вырасьлі. Храмы разбураныя, а тыя, што ацалелі — цесныя для нас. Сьвятары ў храмах выконваюць ролю сьвятароў: па сьвятах крапяць сьвятой вадой. Але яны ня сталі для нас Настаўнікамі, тымі, што йдуць наперадзе й вядуць за сабой іншых. Калі касьцёл робіць нейкія захады «абеларушваньня», то царква гнецца перад гнілой вяршыняй сьвецкай улады. Касьцёл імкнецца ўлавіць голас масаў, шарэе ад праставатых мінакоў. Але той, хто прыслухоўваецца да думкі масаў, ніколі не падымецца над наўтопам. Шэрасьць ды пасрэднасьць заўсёды былі АСАБЛІВА НЕБЯСЬПЕЧНЫМІ ворагамі Сьвятла.

Царква ўсё больш актыўна засвойвае прэзыдэнцкі рупар, адкрыта йдзе ў наступ і тым самым мабілізуе сілы Сьвятла. Мы не разбуральнікі, мы мусім сьцерагчы асновы й сваімі рукамі будаваць Чалавечы Храм.

Ян Пятроўскі параўноўвае шляхі разьвіцьця Вялікай Брытаніі й Вялікага Княства Літоўскага, якія некаторы час ішлі поруч у сваім разьвіцьці, якія ведалі Рэнэсанс, Рэфармацыю. Пасьля Літва была адкінута назад у выніку завуаляванай дзейнасьці езуітаў. Гаспадар Ян Пятроўскі з болем выгукае: «Літва — твая загуба ў Рыме!»

5.09. Раней муж купляў «политическую карту мира», а сёньня Віталік прынёс з крамы карту Меншчыны.

7.09. Завуч зь Віталікавай клясы перайшла ў малодшыя выкладаць сваю расейскую літаратуру ды сваю расейскую мову. Цікава, ці будзе новенькая маладая настаўніца ўшчуваць Віталіка за беларускі акцэнт і драць дзёньнік за напісаную ў раскладзе ўрокаў расейскую мову?

Конкурс 3

Якой веры?



Ёсьць на нашай зямлі такія бажніцы, якія ў роўнай ступені належаць усёй нацыі бяз розьніцы ў веравызнаньні. Самая старая зь іх — Полацкая Сафія. Але і ў пазьнейшыя часы бывалі такія сьвятыні: Вострая Брама, Жыровіцы, Беразьвечча... Да якой з канфэсіяў яны ні належалі, яны ўзрушваюць беларускія сэрцы, напаўняюць пачуцьцём сьвятасьці і чыстага хараства.

А ёсьць бажніцы, якія належаць толькі тым, хто іх паставіў і хто да іх прыходзіць. Яны паўсталі ня дзеля таго, каб пераўзысьці іншыя храмы ў вышыні, яскравасьці, багацьці ўбранства. Яны паўсталі таму, што папросту былі патрэбныя тым, хто прыходзіў сюды да Бога.

Што адлюстравана на гэтым здымку? Чакаем адказаў.

Сяргей Харэўскі

Шаноўнае спадарства, запрашаем вас наведаць нашую новую гуртоўню !

SOTVAR

НАШАЯ АДРЭСА: г. Менск вул. Скрыганава, 39 (склад № 4)

СКРЫГАНАВА, 39 (БЭКС №4)

Менскі Кальцавы шлях; вул. Пушкіна; вул. Альшэўскага; вул. Бірузова; вул. Цімірязева; вул. Прытыцкага; Вільня Гродна; вул. Кальварыйская

Часы працы: з 9.00 да 19.00 выходны нядзеля субота таксама працоўны дзень

Ліквора-гарэлачныя вырабы, шампанскае, віны, піва, цыгаркі, кава, какава, гарбата, газаванае напоі, цукеркі, чакаляткі, жуйкі, крэкеры, кансэрвы, а таксама звыш 400 іншых найменьняў прадуктаў харчаваньня.

Усе тавары сэртыфікаваныя.

Магчымы наяўны разьлік з усімі дакумэнтамі

Тэл./хвакс (0-172) 54-00-82, 54-21-68, 28-45-88.

Шаноўнае спадарства, запрашаем вас наведаць нашую новую гуртоўню !

SOTVAR

НАШАЯ АДРЭСА: г. Менск вул. 3-я Паселковая, 12 (склад № 14)

на Віцебск; на Воршу Маскву; Менскі Кальцавы шлях; вул. Шырокая; вул. М. Багдановіча; Гарахы; СКЛАДЫ Белдрук, 12; Гуртоўня СОТВАР; крама "Аўтазапчасткі"; Лагойскі тракт; ПАРК; 3-я Паселковая

Часы працы: з 9.00 да 19.00 выходны нядзеля субота таксама працоўны дзень

Ліквора-гарэлачныя вырабы, шампанскае, віны, піва, цыгаркі, кава, какава, гарбата, газаванае напоі, coki, цукеркі, чакаляткі, жуйкі, крэкеры, кансэрвы, а таксама звыш 400 іншых найменьняў прадуктаў харчаваньня.

Усе тавары сэртыфікаваныя

Магчымы наяўны разьлік з усімі дакумэнтамі

Тэл./хвакс (0-172) 62-24-31, 28-45-88, 61-17-69.

НЕЗАЛЕЖНЫ ТЫДНЁВІК НАША НІВА

ЛЕГЕНДА БЕЛАРУСКАЙ ПРЭСЫ

пытайцеся ў шапіках "Белдруку" і ў прыватных распаўсюднікаў, а яшчэ лепш — выпісвайце наш індэкс 63125

© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5100 Нумар падпісаны ў друк 19.00, 15/9/1996. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 6135 Кошт свабодны.